Малітва да сьвятой Еўфрасіньні

О, сьвятая й слаўная апякунка й асьветніца Беларускага народу, Маці нашая, Еўфрасіньня! Глянь ласкавым вокам сваім на братоў і сёстраў Тваіх, што зь любоўю й надзеяй вочы душаў сваіх да Цябе падымаюць. Ты не асудзіла нас, што мы ў няволі сваёй доўгі час не маглі славіць у сьвятынях сваіх сьвятога імені Твайго. Бо мы ведаем, што гэта Ты сьвятымі малітвамі сваймі выпрасіла нам ласку Збаўцы нашага, і мы цяпер у сьвятых цэрквах сваіх можам аддаваць хвалу Трыадзінаму Богу й Табе, апякунцы нашай. Таму і ўдзячныя сэрцы нашы, поўныя любові й падзякі да Цябе, у захапленьні сьпяваюць: РАДУЙСЯ!

Радуйся, заступніца, апякунка й малельніца наша! Радуйся, радаваньне Полацкай і ўсёй зямлі нашай! Радуйся, дзеваў чысьціня й зьзяньне! Радуйся, прамень Веры нашае! Радуйся, асьвячэньне любае Беларусі нашае! Радуйся, пашыральніца дабра, праўды, красы й згоды ў краіне нашай! Радуйся, памочніца пакрыўджаных, сумных пацяшэньне! Радуйся, удоваў і сіротаў заступніца! Радуйся, кветка з райскага саду нясьмягнучая! Радуйся, у веры нашай на выгнаньні і ў пакутах падтрыманьне! Радуйся, хворых і паміраючых пацеха й выздараўленьне! Радуйся, да магілы Хрыстовай зь сьвятымі духмянасьцямі прыходзячая! Радуйся, усё Хрысту ахвяраваўшая! Радуйся, сьвятых угоднікаў Божых краіны нашае зьзяньне, веліч і слава! Радуйся, сьвятая Маці нашая, Еўфрасіньня!

Прыймі, заступніца нашая, гэтую малітву братоў і сёстраў Тваіх, як нашую невымоўную падзяку, любоў і хвалу Табе — надзея, слава й пацеха нашая! Усе мы з радасьцю аддаем сябе пад сьвятую апеку Тваю. Маліся і далей за шматпакутны народ наш перад пасадам Усявышняга, каб мы сталіся верным і набожным выбраным народам Ягоным! Каб Ён Духам Сваім Сьвятым узмацняў і прасьвятляў душы й сэрцы нашых пастыраў і правадыроў, пацяшаў і радаваў нашых удоваў і сіротаў, а ўсім нам паслаў спакой і радасьць на чужыне, і прывёў нас на вольную зямельку нашу, каб мы ўсе разам там маглі славіць Цябе, і пяяць хвалу Яму, Збаўцу нашаму, ды цешыцца й радавацца ў Валадарстве славы Ягонай на вякі вякоў. Амін.

Праваслаўны малітоўнік.Таронта, 1990

Малітва Крыжу

Да воскреснет Бог, и расточатся врази Его, и да бежит от лица Его ненавидящии Его. Яко исчезает дым, да исчезнут; яко тает воск от лица огня, тако да погибнут беси от лица любящих Бога, и знаменующихся крестным знамением, и в веселии глаголющих: радуйся, Пречестный и Животворящий Кресте Господень, прогоняяй бесы силою на тебе пропятаго Господа нашего Иисуса Христа, во ад сшедшаго и поправшаго силу диаволю, и даровавшего нам тебе, Крест Свой Честный, на прогнание всякаго врага и супостата. О Пречестный и Животворящий Кресте Господень! Помогай ми со Святою Госпожею Девою Богородицею и со всеми святыми во веки. Аминь.

KAMUNIKAT.org

«ЯКО ЛУЧА СОЛНЕЧНАЯ...»

Асветніца з роду Усяслава

Еўфрасіння Полацкая. Без гэтага імя немагчыма ўявіць не толькі панараму духоўнага жыцця на ўсходнеславянскіх землях у XII стагоддзі, але і ўсю шматвяковую гісторыю Беларусі. Князёўна, унучка славутага Усяслава Чарадзея, ігумення, выдатная асветніца, пра якую «Жыццяпіс» кажа, што яна — «небопарный орел, попарившй от Запада и до Востока, яко луча солнечная, просветивши всю землю Полоцкую», святая Еўфрасіння пакінула па сабе вечную памяць у душы народа.

Паміж намі і часам, калі жыла знакамітая палачанка, ляжыць больш за восем стагоддзяў. Не дзіва, што гісторыя захавала пра яе не надта багатыя звесткі, але і яны дазваляюць убачыць агульнаеўрапейскую значнасць асобы гэтай жанчыны-падзвіжніцы. Ахвярная праца святой Еўфрасінні, як і яе славутых сучаснікаў Кірылы Тураўскага і Клімента Смаляціча, абумовіла высокі культурны ўздым на зямлі нашых продкаў.

Ужо ў юнацтве Еўфрасіння перапісвала і перакладала з іншых моваў кнігі. Заснаваўшы ў Полацку два манастыры, яна надала пашырэнню пісьмовага слова вялікі размах. Гісторыкі звязваюць з яе імем полацкае летапісанне і збіранне бібліятэкі Сафійскага сабора. Князёўна-

* Найпадобнейшая Еўфрасіння, ігумення Полацкая.
З гравюры XIX стагоддзя.

* Преподобная Евфросиния, игуменья Полоцкая.
С гравюры XIX века.

ігумення рупілася, каб вучні манастырскіх школ разам з граматаю навучаліся «чистоте душевней и бестрастию телесному».

Мудрасць Еўфрасінні выявілася і ў тым, што яна не стала на шлях барацьбы са старымі мясцовымі традыцыямі, а імкнулася асвяціць усё, што магло служыць хрысціянству.

Знаходзячыся ў цэнтры духоўнага жыцця Полацкага княства, яна нястомна збірала вакол сябе таленавітых людзей, зрабілася нашай першаю мецэнаткай. На яе заказ дойлід Іаан пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса, якую лічаць дасканалым узорам полацкай архітэктурнай школы. Асветніца спрыяла стварэнню ўнікальных фрэскавых размалёвак Спасаўскага храма. Полацкі майстар-ювелір Лазар Богша зрабіў для Еўфрасінні свой слынны крыж — нашу неацэнную нацыянальную рэліквію, гісторыі якой прысвечаная гэта кніга.

Вялікім быў уплыў ігуменні на палітыку Полацка. Падзвіжніца ўздымала голас супроць княскіх усобіц, папярэджвала, што братазабойчыя войны могуць прывесці Бацькаўшчыну да гібелі.

Багаты плён яе працы высока падымаў аўтарытэт Полацкага княства — першай дзяржавы нашых продкаў — у вачах Візантыі і іншых краін. Прыклад Еўфрасінні натхняў яе землякоў і наступнікаў: першадрукара і перакладчыка Бібліі на зразумелую народу мову Францішка Скарыну, перакладчыка і выдаўца беларускага Евангелля Васіля Цяпінскага, паэта і асветніка Сімяона Полацкага...

Пабожнае жыццё Еўфрасінні, яе бязмежнае самаадрачэнне прычыніліся да росквіту ў беларускім народзе хрысціянскіх цнотаў.

Еўфрасіння Полацкая стала адной з першых кананізаваных жанчын на ўсходнеславянскіх землях. Зразумела, што ў перыяд панавання «ваяўнічага атэізму» дзейнасць святой замоўчвалася або малявалася ў скажоным святле. Вядомы ў той час прафесар, аўтар падручніка для сярэдняй школы Л. Абэцэдарскі ў 70-я гады дазваляў сабе ў лекцыях і «навуковых» публікацыях называць выдатную асветніцу «цемрашалкай». Маўчала пра Еўфрасінню нават пяцітамовая акадэмічная «Гісторыя БССР».

У апошнія два дзесяцігоддзі беларускія гісторыкі, пісьменнікі, мастакі, журналісты разам з царквою нямала зрабілі, каб сарваць з імя Еўфрасінні зняважлівыя ярлыкі і вярнуць яго нашай свядомасці. Наогул жа, літаратура, дзе падаюцца звесткі пра жыццё і подзвігі святой, налічвае каля 200 назваў на беларускай, лацінскай, польскай, нямецкай, украінскай, расейскай і царкоўнаславянскай мовах.

Асноўная крыніца біяграфічных сведчанняў пра асветніцу — яе «Жыццяпіс», адзін з найкаштоўнейшых помнікаў старажытнабеларускай літаратуры, створаны ў канцы XII стагоддзя ў Полацку невядомым аўтарам. Ім мог быць малодшы сучаснік Еўфрасінні, манах або ігумен аднаго з полацкіх манастыроў.

«Жыццяпіс Еўфрасінні Полацкай» дайшоў да нас, прынамсі, у шасці рэдакцыях, прадстаўленых болей чым сотняю спісаў, самы даўні з якіх належыць да XVI стагоддзя. Шэраг гэтых спісаў захоўваецца ў Бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу.

«Жыццяпіс» створаны на царкоўнаславянскай мове ў яго старажытнарускай рэдакцыі. Ён пачынаецца рытарычным уступам, потым ідзе аповед пра жыццёвы шлях святой як пра яе духоўнае ўзыходжанне. Каштоўная асаблівасць твора — спроба аўтара паказаць характар асветніцы. Апавяданне грунтуецца на сапраўдных гістарычных фактах, прычым падзеі падаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці. Змешчаныя ў тэксце маналогі і дыялогі дазваляюць раскрыць унутраны свет полацкай ігуменні. З гісторыка-мастацкай біяграфіяй спалучаюцца іншыя літаратурныя жанры: хаджэнне — апісанне падарожжа ў Святую Зямлю і пахвала. Самая пашыраная рэдакцыя «Жыццяпісу» — чацвёртая, дзе падаецца генеалогія роду Еўфрасінні.

Аўтар «Жыццяпісу» ў адпаведнасці з канонамі жанру не меў мэты падрабязна і дакладна распавесці пра жыццё святой. Яго найбольш прываблівалі моманты, непасрэдна звязаныя з хрысціянскай мараллю і адпаведным тыпам паводзін. Таму больш поўна ўзнавіць асноўныя вехі зямнога шляху святой Еўфрасінні ды іхнія даты можна, толькі супастаўляючы апісанне яе жыцця з усходнеславянскімі летапісамі, візантыйскімі хронікамі, іншымі гістарычнымі крыніцамі. Цікавыя звесткі пра асветніцу і яе светапогляд ёсць у прысвечаным ёй спеўным цыкле XII стагоддзя.

Як хрысцілася Полацкае княства

Гаворачы пра нашу першую святую, мы ніяк не абмінём пытання, калі і як прынялі хрысціянства Полацк ды іншыя беларускія землі.

Афіцыйная гістарыяграфія з яе міфамі, створанымі стагоддзі таму, але патрэбнымі дзеля імперскае палітыкі і сёння, абвяшчае Полацкае княства часткаю Кіеўскай Русі. Адсюль як бы само сабою зразумела, што хрышчэнне нашых земляў нічым не адрознівалася ад гэткай падзеі ў Кіеве ці ў Ноўгарадзе і адбылося дзякуючы князю Уладзіміру Святаславічу. Як вядома, кіянаў Уладзімір загадаў хрысціць у Дняпры, сказаўшы пры гэтым: «Хто не са мною, той супроць мяне». У Ноўгарадзе разыгралася крывавая драма: там кіеўскія ваяводы Дабрыня і Пуцята хрысцілі агнём і мячом.

Аднак на старонках усіх вядомых гісторыкам летапісаў няма ніякіх звестак пра тое, як прыняла хрост Полацкая зямля. Значыцца, гвалту тут не было, бо абмінуць такую падзею летапісцы не маглі. Праліваючы кроў паганцаў (язычнікаў) у Ноўгарадзе, кіеўскі князь замацоўваў правы на сваю вальналюбную вотчыну, падпарадкоўваючы яе яшчэ і духоўна. Такіх правоў на Полацк ён не меў, як, пэўна, не меў і дастатковай для барацьбы з палачанамі збройнай сілы.

У Полацку ў апошнія гады жыцця Уладзіміра валадарыў князь Брачыслаў. Ён вёў незалежную палітыку і, мяркуючы па варажскіх сагах і ўсходнеславянскіх летапісах, падтрымліваў больш трывалыя сувязі не з Кіеўскай Руссю, а са скандынаўскім светам. По-

* Старонка «Жыццяпісу святой Еўфрасінні Полацкай». Спіс XVII стагоддзя.

* Страница «Жития святой Евфросинии Полоцкой». Список XVII века.

лацкія князі не мелі патрэбы сцвярджаць сваю ўладу пераводам у хрысціянства адразу ўсіх жыхароў княства. Тым не менш, яны, не хочучы бачыць сваю зямлю паганскаю выспаю сярод хрысціянскай Еўропы і добра разумеючы магчымасці, якія несла новая вера дзяржаве і народу, прынялі яе і спрыялі натуральнаму пашырэнню Хрыстовага вучэння на ўсім абшары княства. Прычым адбывалася гэта паступова, і доўгі час хрысціянства мірна суіснавала з ранейшым светапоглядам.

Слова Божае ішло сюды і з поўдня, і з захаду, і з поўначы. Хрысціянамі, магчыма, былі ўжо першы вядомы з летапісу полацкі князь Рагвалод (на думку некаторых вучоных, выхадзец з воласці Рогаланд на поўначы Нарвегіі) і ягоная дачка Рагнеда, сілаю ўзятая будучым Хрысціцелем, а тады яшчэ паганінам Уладзімірам за жонку. Летапісы паведамляюць, што, пабраўшыся з дачкою візантыйскага імператара і зрабіўшыся хрысціянінам, кіеўскі князь прапанаваў Рагнедзе выбраць сабе новага мужа з ягонага атачэння. Ганарлівая дачка Рагвалода адмовілася, абвясціўшы, што ў такім разе лепей будзе Хрыстоваю нявестаю. Прыняўшы пострыг пад імем Анастасіі, яна сталася, верагодна, першаю на ўсходнеславянскіх землях манашкаю.

Не выключана, што першы ва ўсходніх славянаў манастыр узнік менавіта ў Полацкім княстве. Падставы для такога меркавання дае запісаная ў XIII стагоддзі «Сага пра хрышчэнне», якая апавядае пра падзеі канца X стагоддзя. Яе герой, прылічаны пасля смерці да святых Торвальд Вандроўнік, хрысціў Ісландыю, адкуль потым выправіўся ў Ерусалім. Заслужыўшы вялікую пашану ў канстанцінопальскага патрыярха, паломнік вяртаўся на радзіму праз усходнеславянскія землі. Паводле сагі, Торвальд сканаў, не дасягнуўшы радзімы, і быў пахаваны «у высокай гары... каля царквы Іаана Хрысціцеля, непадалёку Полацка».

Узнікненне полацкага манастыра Іаана Хрысціцеля (Папярэдніка) на Востраве, пра які ёсць шматлікія сведчанні, гісторыкі адносяць да XII стагоддзя. Але рэшткі самога манастыра дагэтуль не знойдзеныя, і казаць пра больш дакладны час яго заснавання можна будзе толькі пасля археалагічных даследаванняў. Што да «высокай гары», дык яна існуе на левым беразе Дзвіны, насупроць Сафійскага сабора, і сёння.

«Аповесць мінулых гадоў», кажучы пра падзеі ў Полацку, пад 1007 годам змяшчае запіс: «Перанесены святыя ў святую Багародзіцу». Першыя кіеўскія (а потым агульнарускія) святыя Барыс і Глеб кананізаваныя, як лічаць сучасныя вучоныя, пасля 1020 года, а перанесеныя ў царкву ў 1072 годзе, пра што таксама ёсць запіс у «Аповесці мінулых гадоў». Іншых святых ні ў Кіеве, ні ў Ноўгарадзе тады не было і не магло быць, бо царква Кіеўскай Русі знаходзілася ў поўнай залежнасці ад Канстанцінопаля, дзе зацвярджалі любую кананізацыю. Беларускі гісторык Сяргей Тарасаў мяркуе, што гаворка ў летапісе ідзе пра першых полацкіх і беларускіх святых, якімі маглі быць манашка Рагнеда-Анастасія, пабожны князь Ізяслаў і княжыч Усяслаў Ізяславіч, які памёр у дзіцячыя гады. Магчыма, да іх быў далучаны і святы Торвальд. Канстанцінопальскі патрыярх мог дазволіць кананізацыю мясцовых святых праз сваю зацікаўленасць у хрысціянізацыі Полацкай зямлі паводле ўсходняга абраду. Княства ж, безумоўна, хацела мець сваіх святых дзеля ўмацавання незалежнасці.

Дарэчы, у Полацку ўжо мог існаваць і храм Багародзіцы, бо, як мы пазней даведаемся, у часы Еўфрасінні цэркваў у гонар Божай Маці было ў горадзе дзве — старая і новая.

Першы вядомы нам полацкі епіскап Нікіфар быў грэкам. У 1092 годзе з дазволу канстанцінопальскага патрыярха ён стаў мітрапалітам кіеўскім. Значыцца, заняць епіскапскую катэдру ў Полацку ён мог таксама толькі з багаславення таго самага царкоўнага іерарха. Іначай кажучы, Нікіфар прыехаў у Полацк проста з Візантыі.

Усё сказанае вышэй, як і трывалыя сувязі Полацкага княства з Канстанцінопалем, што выяўлялася і ў дынастычных шлюбах і ў магутным уплыве візантыйскае культуры, пераконваюць: новая вера прыйшла сюды непасрэдна з Візантыі.

Беларускія землі прынялі хрысціянства яшчэ да яго афіцыйнага падзелу на заходнюю і ўсходнюю плыні, які адбыўся ў 1054 годзе. Хрысціўшыся паводле грэцкага абраду, нашы далёкія продкі не адчувалі варожасці і да вернікаў-лацінцаў. У XII стагоддзі, калі жыла Еўфрасіння, на ўсходзе славянства працягвалі пашырацца жыццяпісы рымскіх святых. Асаблівую папулярнасць меў жыццяпіс Аляксея чалавека Божага. «Родам рымлянін» быў св. Меркуры Смаленскі. У суседнім з Полацкам Ноўгарадзе прылічылі да святых Антонія

Рымляніна. У той самы час ноўгарадзец Кірык паведамляў, што гараджанкі хрысцілі дзяцей і ў сваіх, і ў варажскіх святароў. Між іншым, сваяк святой Еўфрасінні візантыйскі імператар Мануіл Камнін вёў перамовы пра паяднанне цэркваў з рымскім папам.

Мы не ведаем на тагачасных беларускіх землях ніякай скіраванай супроць заходняга хрысціянства літаратуры. Няма слядоў такой непрыхільнасці і ў жыццяпісах беларускіх святых, што яшчэ раз сведчыць пра ўласцівы продкам шляхетны дух талерантнасці, які праз стагоддзі будзе захаваны ў Вялікім княстве Літоўскім.

Наша першая дзяржава

Радзіма Еўфрасінні — Полацкае княства, моцная раннефеадальная ўсходнеславянская дзяржава, якой два з паловаю стагоддзі кіравала самастойная дынастыя Рагвалодавічаў, або Ізяславічаў, калі лічыць ад князя Ізяслава — унука Рагвалода і сына Рагнеды.

У Падзвінні ў другой палове першага тысячагоддзя нашай эры адбывалася ўзаемадзеянне плямён крывічоў, дрыгавічоў і балтаў, што паклікала да жыцця новае этнічнае ўтварэнне — палачанаў. Праз княства, злучаючы Арабскі халіфат і Хазарыю з усходнімі славянамі і Скандынавіяй, праходзілі старадаўнія гандлёвыя шляхі. Выгоднае геаграфічнае становішча разам з інтэнсіўнымі этнічнымі працэсамі ды актыўнай палітыкай тутэйшых князёў і былі галоўнымі чыннікамі хуткага ўзвышэння Полацкай зямлі.

У другой палове X стагоддзя ў Полацку кіраваў незалежны ні ад Кіева, ні ад Ноўгарада князь Рагвалод. Іначай кажучы, у тыя часы і пачала існаванне першая беларуская дзяржава — Полацкае княства. Можна спрачацца, прыйшоў полацкі валадар з-за мора ці быў крывічом. Можна спрачацца, славянскія ці скандынаўскія імёны мелі першы вядомы з летапісаў полацкі князь і ягоная дачка Рагнеда. Але значна важней тое, што, як падкрэслівае гісторык Мікола Ермаловіч, Рагвалод «першы ўбачыў і па-сапраўднаму ацаніў вялікія магчымасці Полацкай зямлі як асобнай дзяржавы са сваімі мэтамі і інтарэсамі, супрацьлеглымі мэтам і інтарэсам самога Кіева».

У XII стагоддзі Полацкае княства сваёй тэрыторыяй было роўнае такім буйным тагачасным заходнееўрапейскім дзяржавам,

* Княжыч Ізяслаў заступаецца за Рагнеду пасля яе замаху на Уладзіміра. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу.

* Княжич Изяслав вступается за Рогнеду после ее покушения на Владимира. Миниатюра Радзивиллювской летописи.

як герцагства Баварскае і каралеўства Партугальскае. Васаламі Полацка былі размешчаныя ў балцкіх землях гарады Герцыка (Герцыке) і Куканос (Кукенойс). Даніну плацілі яму плямёны ліваў і летаў, якія жылі ніжэй па Дзвіне. Полацкія свецкія і духоўныя валадары заўсёды праяўлялі да сваіх даннікаў-паганцаў верацярпімасць. Відаць, гэта было вынікам моцных пазіцый дахрысціянскай ідэалогіі ў самім княстве.

Дзейнасць полацкіх князёў скіроўвалася на ўзмацненне дзяржавы і пашырэнне яе межаў. Красамоўна кажа аб палітычнай стабільнасці Полацкай зямлі тое, што цэлае стагоддзе ёю кіравалі толькі два князі: Брачыслаў Ізяславіч (1001–1044) і ягоны сын Усяслаў Чарадзей (1044–1101). Пры Усяславе княства дасягнула свайго найвышэйшага ўздыму. Тады ж быў пабудаваны Сафійскі сабор, трэці такі храм на ўсходзе славянства, які сімвалізаваў роўнасць Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Дзяржаўны розум і патрыятызм

* Х о р с — у міфалогіі ўсходніх славян бог сонца, апякун земляробства.

полацкага князя ўславіў геніяльны аўтар «Слова пра паход Ігаравы»: «Всеслав князь людем судяше, князем грады рядяше... великому Хръсови* влъком путь прерыскаше. Тому въ Полотске позвониша заутренюю рано у святыя Софеи въ колоколы, а он въ Кыеве звон слыша». Дарэчы, гэты князь стаў правобразам былінага Волха Усяславіча.

Пра міжнародны аўтарытэт Полацкай зямлі кажа сваяцтва Рагвалодавічаў з домам візантыйскіх імператараў Камнінаў. Некаторыя аўтары лічаць, што дачка Усяслава Чарадзея была жонкаю кесара Аляксея.

Палітычным і эканамічным сэрцам княства, што стала гістарычнай прарадзімаю беларусаў, быў Полацк — адзін з самых старажытных славянскіх гарадоў. Упершыню ён прыгадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 862 годам, але дадзеныя археалогіі сведчаць, што горад мог узнікнуць, прынамсі, на стагоддзе раней.

У XI–XII стагоддзях тут квітнеюць гандаль і рамёствы. Уніз па Дзвіне, а затым па Варажскім моры полацкія купцы вязуць воск, мёд і футра. На мясцовым торжышчы можна сустрэць гасцей не толькі са старажытнарускіх гарадоў, але і з Візантыі, Прыбалтыкі. Археолагі налічваюць дзесяткі спецыяльнасцяў полацкіх майстроў. Развітыя былі кавальскае і ліцейнае рамёствы, ганчарства, гарбарства і шавецтва. Сваімі вырабамі славіліся збройнікі і ювеліры, што валодалі шмат якімі прыёмамі апрацоўкі каляровых і высакародных металаў — каваннем, чаканкаю, цісненнем, філігранню, зерню.

Тагачасны Полацк з яго манастырамі і цэрквамі, з заснаванай у 992 годзе епіскапскай катэдрай — буйны асяродак кніжнае навукі. Ніканаўскі летапіс невыпадкова паведамляе пра полацкага князя Ізяслава (памёр у 1001 годзе), што ён «прилежаша прочитанию» кніг. Доўгі час — пакуль не быў знойдзены вядомы Гнёздаўскі надпіс — пячатку з імем гэтага князя-кніжніка лічылі самым даўнім узорам пісьменства ўсіх усходніх славянаў. Да нашых дзён дайшла і знойдзеная на Рурыкавым гарадзішчы ў Ноўгарадзе пячатка самой Еўфрасінні, што захоўваецца цяпер у фондах Ноўгарадскага гістарычна-археалагічнага запаведніка.

У Полацку вялі летапіс, урыўкі з яго захаваліся да XVIII ста-

* Г р а ф і ц і — старажытныя надпісы, зробленыя вострымі рэчамі на сценах будынкаў.

годдзя і трапілі ў так званы Яропкінскі спіс, якім карыстаўся расейскі гісторык В. Тацішчаў. Пра высокі на той час узровень пісьменства кажуць таксама графіці* полацкіх храмаў, каштоўныя помнікі эпіграфікі «Барысавы камяні». Ужо ў наш час надпіс сярэдзіны XI стагоддзя быў выяўлены на вялікім камені з падмурка Сафійскага сабора. Магчыма, знойдзены «аўтограф» старажытных дойлідаў. У помнікаў пісьменства Полацкай зямлі часта сустракаецца дзесятковае «і» — палачане ведалі лацінскі алфавіт.

На працягу большай часткі сваёй гісторыі княства захоўвала незалежнасць ад Кіева. Вядома, гэта не азначала адарванасці Полацка ад суседніх земляў, з якімі ён заўсёды меў цесныя дзяржаўныя, гандлёвыя і культурныя сувязі. Разам з тым самастойнасць, апрача палітычных і эканамічных выгодаў, давала вялікую творчую свабоду мясцовым дойлідам, жывапісцам, іншым талентам, якім не трэба было абавязкова арыентавацца на кіеўскія ўзоры. Такія ўмовы спрыялі развіццю цэлага шэрагу культурных асаблівасцяў, што дае падставы называць Полацкую зямлю не толькі нашай першай дзяржаваю, але і калыскай беларускай культуры.

Тут, на берагах Дзвіны і Палаты, у Полацку або ў адной з блізкіх княскіх вотчын і прыйшла на свет дзяўчынка, якой наканавана было назаўсёды застацца ў гісторыі і ў памяці народа.

Унучка Чарадзея

Будучая святая нарадзілася ў сям'і князя Святаслава-Георгія, малодшага сына Усяслава Чарадзея. Здарылася гэта праз колькі гадоў пасля смерці знакамітага полацкага валадара.

Дзяўчынку назвалі старажытным крывіцкім імем Прадслава. Паводле тагачаснага звычаю, атрыманае адразу па нараджэнні імя пасля хрышчэння магло змяніцца, але маленькая князёўна засталася Прадславаю.

З маленства яна чула ад бацькоў паданні пра славутых продкаў. У яе свядомасць рана ўвайшло імя непакорлівай Рагнеды, якую муж — Уладзімір Краснае Сонейка мусіў адправіць з малым сынам Ізяславам назад на радзіму. Прадславу вабіла і легендарная асоба дзеда Усяслава. Ягоная бітва з войскам князёў Яраславічаў на Нямізе, падступнае па-

ланенне і кіеўская вязніца, паўстанне 1068 года, калі кіяне «пракрычалі» Усяслава вялікім князем, вяртанне ў Полацк і працяг барацьбы з Кіевам — згадкі пра гэтыя падзеі давалі князёўне яскравыя прыклады адданасці роднай зямлі.

Вучылася Прадслава ў школе пры Сафійскім саборы або дома, пры княжым двары (гэта больш верагодна). Настаўнікамі былі духоўныя асобы, найперш манахі, падручнікамі — Святое Пісьмо, жыццяпісная літаратура... Ад настаўнікаў, з апісанняў жыцця святых дзяўчынка атрымлівала і звесткі пра манастырскія статуты і звычаі. Навука давалася ёй значна лягчэй, чым аднагодкам. «Жыццяпіс» адзначае яе любасць да вучэння, старанасць і вялікія здольнасці.

* Першая старонка «Аповесці мінулых гадоў».

* Первая страница «Повести временных лет».

Княская дачка мела доступ да самых розных кніг. Ужо ў бацькоўскім доме, апрача набажэнскай і іншай рэлігійнай літаратуры, Прадслава магла чытаць «Ізборнікі» з афарызмамі і выслоўямі, перакладзены з грэцкае мовы раман аб подзвігах Аляксандра Македонскага — «Александрыю», востраcюжэтную «Аповесць пра Акіра Прамудрага»... Пазней іх замянілі творы з багаслоўскімі тлумачэннямі сутнасці прыроды, кнігі з антычнай гісторыі.

Дзяцінства князёўны праходзіла, вядома, не толькі ў бацькавым хораме. Яе прыцягвала шматгалосае і шматмоўнае торжышча, дзе можна было пачуць гусляра, пабачыць выступленні «вясёлых людзей» — скамарохаў. Прадслава заходзіла да гандляроў і рамеснікаў, што жылі на пасадзе. Пасля цесных курных хацін простага люду асабліва ўражвалі дзяўчынку полацкія храмы і найперш велічны Сафійскі сабор з яго багатымі фрэскавымі размалёўкамі.

Ад карміцелькі, нянек, ад маці — княгіні Сафіі яна чула казкі, абрадавыя песні, замовы і заклёны. Своеасаблівае двоеверства існавала на Полаччыне нават у княжацка-дружынным асяроддзі, а значыць, Прадслава добра ведала паганскі пантэон. У юныя гады яна была глядачкай, а магчыма, і ўдзельніцай гуканняў вясны, русалляў, купалляў, калядаў і іншых дахрысціянскіх святаў.

Слава аб прыгажосці і адукаванасці Прадславы разнеслася «по всем градам», і ў Полацк, да князя Святаслава-Георгія, зачасцілі сваты. «Жыццяпіс» апавядае, што, калі князёўне споўнілася дванаццаць гадоў (з такога ўзросту дзяўчынку ў той час лічылі нявестаю), бацькі вырашылі аддаць яе замуж за сына нейкага слаўнага багаццем і княжаннем валадара. Наперадзе ў Прадславы быў звычайны для жанчын з яе кола лёс: нараджэнне і выхаванне дзяцей, хатнія клопаты, чаканне свайго гаспадара-князя з паходу або з ловаў...

І тут нечакана для блізкіх яна выбірае іншую пуцявіну.

Хрыстова нявеста

«Наполнишись мысли ея, — гаворыцца ў «Жыццяпісе», — и рече въ себе: «Но что успеша при нас бывшии родове наши? И женишася, и посягоша <выходзілі замуж>, но не вечноваша. И житие их мимо тече. Слава их погыбе, яко прах, и хужыши паучины... А другыя паче железу выя<шыя> своя не преклониша, но духовным мечем отсекоша от себе плотские сласти... то ти суть памятни на земли».

Прадслава прыходзіць у манастыр. Яе цётка, удава князя Рамана Усяславіча, якая была ігуменняй, «не хотящи острищи ея... и воздохнувши, и прослезившися, глагола къ ней: «Чадо мое! Како могу се сотворити? Отец твой, уведав, со всяцем гневом возложить вред на голову мою. А еще юна еси возрастом. Не можеши понести тяготы мнишеского житиа. И како можеши оставити княжение и славу мира сего?» Але Прадслава дабіваецца свайго і пад імем Еўфрасінні таемна ад бацькоў прымае пострыг, ахвяруючы сябе Хрысту.

Беларускі даследчык «Жыццяпісу» Аляксей Мельнікаў лічыць, што здарылася гэта найверагодней 25 верасня — у дзень святой Еўфрасінні Александрыйскай.

Даведаўшыся пра доччын учынак, князь Святаслаў-Георгі, як

апавядае «Жыццяпіс», ад гора рваў на галаве валасы, а княгіня Сафія галасіла па Прадславе, як па нябожчыцы. Гэта было першае і вельмі цяжкае выпрабаванне юнай Хрыстовай нявесты, але яна здолела пераканаць бацькоў у слушнасці свайго выбару, у тым, што яны мусяць не смуткаваць, а цешыцца: іхняя дачка аддала ўсю сябе Госпаду.

Прыход Прадславы ў манастыр і звязаныя з гэтым акалічнасці даюць магчымасць з большай ці меншай дакладнасцю ўстанавіць дату яе нараджэння. З «Жыццяпісу» вынікае, што пострыг адбыўся, калі будучая падзвіжніца мела дванаццаць гадоў. Князь Раман Усяславіч, удава якога стаяла на чале манастыра, памёр каля 1116 года (па іншых звестках — у 1113). Толькі пасля гэтага цётка Прадславы магла зрабіцца ігуменняю. Значыцца, святая Еўфрасіння нарадзілася не раней 1104 (або 1101) года.

Што да пострыгу князёўны, то існуе цікавая версія, да якой схіляецца, напрыклад, гісторык Мікола Ермаловіч. Згодна з ёй, да гэтага кроку Прадславу маглі падштурхнуць і знешнія прычыны — суровая неабходнасць пазбегнуць высылкі на чужыну. У 1129 годзе за адмову ісці ў паход на полаўцаў кіеўскі князь Мсціслаў выслаў полацкіх князёў у Візантыю. Паміж выгнанцаў летапіс называе і бацьку Еўфрасінні, разам з якім пакінуць Бацькаўшчыну мусілі таксама яе маці і малодшая сястра Гардзіслава. Як мы ведаем, дынастыя Рагвалодавічаў была ў сваяцтве з візантыйскімі імператарамі Камнінамі. Такім чынам, высылка мела ў значнай ступені ганаровы характар (полацкія князі атрымалі пасады ў візантыйскім войску і ўдзельнічалі ў вайне з арабамі), і ўсё ж гэта было выгнанне. Можна толькі здагадвацца, ці дачакалася Еўфрасіння ўсіх сваіх родных назад: пэўнага адказу летапіс не дае.

Полацкая кніжніца

У фармаванні поглядаў Еўфрасінні Полацкай, якая стала адной з самых асвечаных жанчын сваёй эпохі, выключную ролю адыграла тагачасная літаратура.

Прыняцце ўсходнеславянскімі землямі хрысціянства вымагала перабудовы ранейшага светапогляду: уяўленняў пра Сусвет, прыроду, пра гісторыю чалавечага роду... Сярод кніг, якія перакладалі і перапісвалі, прыехаўшы на ўсходнеславянскія землі візантыйскія

і балгарскія святары, а таксама іх мясцовыя паслядоўнікі, большасць складалі, вядома, набажэнскія тэксты і кнігі, дзе выкладаліся асновы хрысціянскіх поглядаў на свет і хрысціянскай маралі. Але ў манастыры і ў княжыя хорамы трапляла і нямала твораў іншых жанраў: хронік, гістарычных і гістарычна-побытавых аповесцяў, прыродазнаўчых трактатаў. Наогул жа літаратура таго перыяду адлюстроўвала светапогляд, тыповы для шмат якіх хрысціянскіх краін ранняга сераднявечча. «Старажытнарускую літаратуру*, — лічыць акадэмік Д. Ліхачоў, — можна разглядаць як літаратуру адной тэмы і аднаго сюжэта. Гэты сюжэт — сусветная гісторыя, і гэтая тэма — сэнс чалавечага жыцця».

Апрача біблійных кніг, Еўфрасіння яшчэ ў юнацтве не магла не чытаць твораў патрыстыкі — рымскіх і візантыйскіх багасловаў, што шануюцца як айцы царквы. Полацкія кнігазборы XII стагоддзя несумнеўна мелі творы выдатнага візантыйскага прапаведніка Іаана Залатаслова (344–407), што навучаў вернікаў хрысціянскім цнотам, вобразна выкрываў чалавечыя заганы. Пашыраныя ў тыя часы былі таксама творы Грыгорыя Назіянзіна, Васілія Кесарыйскага, Яфрэма Сірына, Іаана Сінайскага. Патрыстычная літаратура ўмацоўвала асновы хрысціянскай дагматыкі, мела вялікае значэнне ў сцверджанні этычных ідэалаў. Тым самым мэтам служылі жыццяпісы святых і патэрыкі — зборнікі кароткіх апавяданняў пра людзей, якія выславіліся сваёй пабожнасцю. Са старонак гэтых кніг паўставаў фантастычны, поўны дзівосаў свет, дзе за душы людзей зацята змагаліся сілы дабра і зла. Хвалюючыя праблемы будучыні свету, чалавечага лёсу пасля смерці закраналіся ў апокрыфах**, напрыклад, у такім папулярным, як «Блуканне Багародзіцы па пакутах». У часы Еўфрасінні, а можа, і раней у Полацк маглі трапіць кнігі святых Кірылы і Мяфодзія, вядомыя з апісання бібліятэкі Сафійскага сабора, зробленага ў канцы XVI стагоддзя.

Кожны адукаваны чалавек павінен быў ведаць гісторыю свайго народа і суседзяў. Значыцца, полацкая ігумення вывучала Нестараву «Аповесць мінулых гадоў», якая ўводзіла ўсходняе славянства ў

---

* Пад гэтым тэрмінам мы разумеем літаратуру, створаную на ўсім усходнеславянскім абшары.

** А п о к р ы ф ы — апавяданні аб персанажах біблійнае гісторыі, якія сюжэтна адрозніваюцца ад тых, што змешчаны ў кананічных кнігах Бібліі.

кантэкст сусветнай гісторыі. Цалкам верагодна, што разам з айчыннымі летапісамі асветніца чытала і папулярныя тады візантыйскія хронікі, што праз дынастычныя сувязі маглі трапляць у Полацк непасрэдна з Візантыі. Адна з такіх кніг, «Хроніка Георгія Амартола», пачыналася ад стварэння свету, затым падавала біблійную гісторыю, гісторыю вавілонскіх і персідскіх цароў, апавядала пра рымскіх і канстанцінопальскіх імператараў. Гэты твор дапаўняла «Хроніка Іаана Малалы». Яе аўтар прызначаў сваю працу шырокім колам пісьменных людзей, а таму пісаў немудрагеліста і цікава. Чытаючы 18 кніг названай хронікі, можна было, у прыватнасці, пазнаёміцца з антычнымі міфамі і з падзеямі Траянскай вайны, з жыццяпісамі персідскіх цароў, Ромула і Рэма, першых рымскіх валадароў. Не пазней пачатку XII стагоддзя на землях усходніх славян з'явіўся пераклад «Гісторыі Юдэйскай вайны» Іосіфа Флавія, у цэнтры якой адна з найадметнейшых падзеяў сусветнай гісторыі — паўстанне насельніцтва Юдэі супраць рымскага ўладарання, захоп і разбурэнне Ерусаліма. Гістарычныя хронікі мелі шматлікія мініяцюры, якія часта адлюстроўвалі рэальных асоб і рэальныя падзеі. У адным з перакладаў кнігі Георгія Амартола быў, напрыклад, малюнак «Вывяржэнне Везувія».

* Пячатка князя Ізяслава Полацкага.

* Печать князя Изяслава Полоцкого.

Гістарычныя веды, усведамленне ўлучанасці сваёй зямлі ў агульначалавечы гістарычны працэс умацоўвалі ў Еўфрасінні і ў яе сучаснікаў ідэі патрыятызму, служэння Бацькаўшчыне.

Уяўленне пра светабудову адукаваным людзям давалі творы візантыйскай навуковай думкі. Візантыйскія вучоныя лічылі свет наглядным сведчаннем мудрасці яго Творцы. Паводле іх, прыродныя з'явы, звычкі звяроў і птушак, нават уласцівасці мінералаў — усё гэта ўвасобленыя ў жывых істотах і матэрыяльных вобразах нейкія вечныя ісціны або паняцці.

Еўфрасіння чытала так званыя «Шасцідзёны». Гэтыя кнігі дапаўнялі і тлумачылі біблійны аповед пра тое, як за шэсць дзён (адсюль і назва) Бог стварыў неба, зямлю, свяцілы, расліны, жывых

істот і чалавека. «Шасцідзёны» — зводы ўсіх вядомых на той час візантыйскай навуцы звестак пра жывую і нежывую прыроду. Найбольш пашыраны быў «Шасцідзён» балгарскага экзарха (намесніка канстанцінопальскага патрыярха) Іаана. У ім гучала натуральнае захапленне ўсемагутнасцю Бога, які стварыў такі шматстайны, цудоўны і разумна ўладкаваны свет.

Прыродазнаўчы характар меў і такі помнік эпохі Еўфрасінні, як «Фізіялог». У адрозненне ад «Шасцідзёнаў», што апавядалі аб прыродзе ў цэлым, тут гаворка ішла пераважна пра жывыя стварэнні, у ліку якіх побач з рэальнымі сустракаліся міфічныя: кентаўры, сірэны, неўміручая птушка Фенікс. «Фізіялог» паведамляў пра ўласцівасці нейкай істоты і даваў іх сімвалічнае тлумачэнне, што павінна было знайсці аналогію паміж гэтымі ўласцівасцямі і адным з багаслоўскіх паняццяў. Як прыклад можна прывесці аповед пра льва. Калі верыць «Фізіялогу», ільвіца нараджае нежывое дзіцянё, а потым, праз тры дні, леў-бацька, дыхнуўшы на ільвяня, ажыўляе яго — пэўная аналогія з увасабленнем, смерцю і ўваскрэсеннем Хрыста.

З разважаннямі пра будову Сусвету можна было пазнаёміцца, чытаючы «Хрысціянскую тапаграфію» Касмы Індыкаплова, купца, які каля 530 года зрабіў падарожжа па краінах Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. Індыкаплоў сцвярджае, што Зямля — плоская; яе і неба ён параўноўвае з залаю, якая мае скляпеністую столь. Неба, што бачаць людзі, складаецца з вады, але над ім ёсць яшчэ адно — невідочнае. Атмасфернымі з'явамі і рухам свяцілаў кіруюць адмысловыя анёлы.

«Жыццяпіс» і іншыя нешматлікія крыніцы не даюць нам дастатковых звестак, каб з усёй пэўнасцю ахарактарызаваць погляды святой Еўфрасінні на ўзаемадачыненні чалавека і навакольнага свету, але адну выснову мы можам зрабіць. Грунтуючыся на біблійным вучэнні, патрыстычная літаратура называла чалавека «мікракосмам» (малым сусветам), а прыроду — «макракосмам». Гэтым падкрэслівалася арганічнае адзінства, у якім павінны існаваць названыя сусветы. Ужо ў раннім сераднявеччы на ўсходнеславянскіх землях была выказаная думка, што прырода — храм, дзе чалавек здзяйсняе сваё творчае служэнне. Так, відавочна, лічыла і Еўфрасіння Полацкая.

Да рук асветніцы, відаць, траплялі і творы, што ўступалі ў пэўную супярэчнасць з тагачаснымі багаслоўскімі поглядамі на чалавека і

прыроду. Візантыйскі філосаф, пісьменнік і дзяржаўны дзеяч Міхаіл Псел (1018–90-я гады XI стагоддзя) у сваіх трактатах, напрыклад, высмейваў веру ў цуды, даводзіў, што кожная з'ява прыроды мае натуральную прычыну. Прырода ў Псела — гэта рассеяны паўсюль, нябачны, але спасцігальны розумам пачатак. Этычныя погляды вучонага вылучаліся памяркоўнасцю і былі накіраваныя супроць празмернага манаскага аскетызму. Сучаснікі абвінавачвалі Псела ў прыхільнасці да паганскае філасофіі, асабліва да Платона.

Вучэнне Міхаіла Псела развіваў ягоны паслядоўнік Іаан Італ. Ён лічыў матэрыю вечнай, адмаўляў пасмяротнае існаванне душы і схіляўся да таго, каб прызнаць або магчымасць яе перасялення, або поўнае знікненне пасля смерці. Італ дайшоў да адкрытага канфлікту з хрысціянствам. На загад імператара Аляксея I Камніна (магчыма, жанатага з цёткаю Еўфрасінні) вучэнне філосафа разгледзеў і аддаў анафеме царкоўны сабор 1082 года.

Ці чытала святая Еўфрасіння працы Арыстоцеля, Платона і іншых антычных аўтараў? Пытанне застаецца адкрытым, але на яго можна даць і станоўчы адказ, бо сучаснік асветніцы Клімент Смаляціч у сваім «Пасланні Фаме прасвітару» зарэкамендаваў сябе знаўцам антычных філосафаў.

Гаворачы пра грамадскія погляды полацкай ігуменні, спашлёмся на пецярбургскага вучонага Наталлю Сярогіну. Тэкст спеўнага цыклу XII стагоддзя пра Еўфрасінню прывёў яго даследчыцу да думкі: там сцвярджаюцца тыя самыя ідэі, што і ў «Слове пра паход Ігаравы» — палымяны пратэст супроць братазабойчых усобіц, неабходнасць яднання ўсходнеславянскіх княстваў перад знешняю пагрозаю. У прысвечаным Еўфрасінні Полацкай каноне* гаворыцца: «Князем сродником друг на друга дерзающе подъяти мечь возбранила еси, яко оружие обоюдоостро словесем божим устрашающем». Н. Сярогіна мяркуе, што невядомы аўтар «Слова» і знакамітая палачанка — людзі аднаго кола, якія мелі блізкія перакананні і светапогляд, а магчыма, і былі знаёмыя. Гэтая выснова добра стасуецца з версіяй, паводле якой аўтар «Слова пра паход Ігаравы» быў нараджэнцам або жыхаром беларускіх земляў.

Мы не маем непасрэдных звестак, як ігумення Еўфрасіння

* К а н о н — царкоўны спеў у гонар святога або свята.

ставілася да сялян і іншага залежнага люду, але, думаецца, яна не магла не падзяляць поглядаў Кірылы Тураўскага, які ў адным са «Словаў» абураўся тым, што валадары «неміласэрныя да рабоў сваіх і да рабынь, не даюць ім досыць ежы і адзення, і працаю знясільваюць і іншымі злыбедамі, і б'юць ні за што». На Еўфрасінню мог уплываць і згаданы вышэй Міхаіл Псел, што ў сваёй «Хранаграфіі» асуджаў паўстанні народных нізоў, але выкрываў дэспатызм імператара і выступаў супроць празмерных выдаткаў двара.

Як ставілася асветніца да паганства? Ужо адзначалася, што яго пазіцыі ў Полацкім княстве і пасля прыняцця хрысціянства заставаліся даволі моцнымі не толькі сярод простага люду. Паганскія вешчуны («волхвы») мелі доступ у вялікакняскі палац. Гэта пацвярджаецца летапісным паведамленнем, што князь Усяслаў Брачыславіч Чарадзей нарадзіўся ад «волхвования». Думаецца, невыпадкова гістарычныя крыніцы не падаюць звестак пра які-небудзь пераслед паганцаў і іхніх ідэолагаў-вешчуноў у Полацкай зямлі. Святая Еўфрасіння, вядомая як міратворца, наўрад ці магла быць прыхільніцай жорсткіх захадаў супроць суайчыннікаў-іншаверцаў.

Аднак вернемся да юнай Хрыстовай нявесты і паспрабуем прайсці побач з ёю па прыступках яе духоўнага ўзыходжання.

Схіліўшыся над пергаменам

Пражыўшы нейкі час у посце і малітвах за манастырскімі сценамі ці ў манастырскай слабодцы пры адным з полацкіх храмаў, Еўфрасіння вырашыла, што яна ўжо падрыхтавалася да самастойнага падзвіжніцтва. Князёўна-чарніца звярнулася да полацкага епіскапа Іллі з просьбаю пасяліцца ў Сафійскім саборы. Магчыма, яна наследавала сваёй нябеснай апякунцы Еўфрасінні Александрыйскай або самой Багародзіцы, якая некалі жыла пры храме ў Ерусаліме. Але найпершаю прычынаю звароту да ўладыкі ўяўляецца імкненне быць бліжэй да кніг, да саборнае бібліятэкі, пра якую асветніца потым усё жыццё клапацілася.

Атрымаўшы ад Іллі дазвол, Еўфрасіння памяняла сваё ранейшае жытло на келлю-галубніцу ў Сафіі і «нача книгы писати своими руками».

* Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу, якая, на думку некаторых гісторыкаў, адлюстроўвае асвячэнне Сафійскага сабора ў Полацку ў прысутнасці князя Усяслава Чарадзея.

* Миниатюра Радзивилловской летописи, изображающая, по мнению некоторых историков, освящение Софийского собора в Полоцке в присутствии князя Всеслава Чародея.

Працэс пісьма ў тыя часы быў вельмі складаны і марудны. Кнігі пісалі на пергамене ўставам — буйным і прамым, без нахілу, почыркам, у якім кожная літара аддзялялася ад суседняй і, можна лічыць, не пісалася, а малявалася (злітнае пісьмо з'явілася толькі ў XV стагоддзі). Каб тэкст хутчэй высыхаў, яго прысыпалі пяском. Атрамант рабілі з адмысловых арэхаў, з адвару дубовай ці альховай кары, з жалезнай іржы, вішнёвага клею. Перапісчыку мала добра ведаць грамату — неабходна мець і мастацкія здольнасці, бо пачатковыя літары і загалоўкі раздзелаў трэба аздабляць жывёльным ці раслінным арнаментам.

Апрача ўсяго іншага, перапісванне кніг было нялёгкаю фізічнаю працай. Тагачасны перапісчык часта пісаў не на стале, а на далоні левай рукі, якую падпіраў локцем аб калена. Гэтай працаю займаліся амаль выключна мужчыны. Ужо адно тое, што за такую цяжкую справу ўзялася маладая жанчына, было подзвігам.

Частка перапісаных Еўфрасінняю кніг ішла на продаж, а атрыманыя грошы па яе просьбе раздавалі бедным.

Якія ж кнігі доўгімі гадзінамі дзень пры дні перапісвала князёўна ў сафійскай галубніцы? «Жыццяпіс» не дае адказу, але можна з упэўненасцю сцвярджаць, што гэта было Святое Пісьмо, творы айцоў царквы, патэрыкі... Апрача іх пяро асветніцы магло выводзіць радкі візантыйскіх гістарычных хронік і Полацкага летапіса, папулярных тады зборнікаў афарызмаў. Яна пісала і ўласныя творы — малітвы, казані, а таксама перакладала з грэцкае і з лацінскае моваў. Такім чынам, некаторыя кнігі візантыйскіх аўтараў маглі пашырацца на ўсходнеславянскіх землях у перакладах палачанкі.

З «Жыццяпісу» вядома, што асветніца мела ліставанне з Візантыяй. Не будзе пярэчыць гістарычнай верагоднасці думка, што Еўфрасіння падтрымлівала сувязі з суайчыннікамі і братамі па духу Кірылам Тураўскім, Кліментам Смаляцічам, а верагодна, і з аўтарам «Слова пра паход Ігаравы».

Вядома, пры ўсёй ахвярнасці маладой манашкі плён яе самотніцкай працы ў келлі быў адносна невялікі. Еўфрасіння марыла пра тое, каб перапісваннем кніг у Полацку займаліся не адзінкі, а дзесяткі пісьменных людзей.

«Тут належыць быць табе!»

Калі падзвіжнікі дасягаюць маральнае дасканаласці, Госпад заклікае іх да стварэння сваіх духоўных цвярдыняў. Так было наканавана і Еўфрасінні.

«Жыццяпіс» апавядае, што аднойчы ў сне анёл узяў яе за руку і адвёў за дзве вярсты ад Полацка ў Сяльцо, дзе знаходзіліся драўляная царква Спаса і мураваны храм-пахавальня полацкіх епіскапаў. На гэтым месцы анёл прамовіў да манашкі: «Тут належыць быць табе!»

Сон паўтарыўся тройчы.

У тую самую ноч падобны сон бачыў і полацкі епіскап. Нябесны пасланец загадаў яму ўвесці рабу Божую Еўфрасінню ў Спасаўскую цэркаўку, што ў Сяльцы на беразе Палаты. Епіскап пачуў таксама прароцтва пра богаабранасць князёўны, якую чакала святое жыццё і царства нябеснае.

Запрасіўшы дзядзьку Еўфрасінні полацкага князя Барыса, яе бацьку Святаслава-Георгія і знаных палачанаў, уладыка абвясціў кня-

зёўне-чарніцы, што аддае ёй Сяльцо. Атрымаўшы багаславенне, Еўфрасіння памалілася ў Сафійскім саборы і, узяўшы з сабою адну манашку, выправілася на паказанае анёлам месца. Увайшоўшы ў царкву Спаса, падзвіжніца звярнулася да Усявышняга з такімі словамі: «Ты, Госпадзе, даючы святым сваім апосталам запавет, наказаў не насіць з сабою нічога, акрамя посаха. Я ж, слухаючыся слова Твайго, прыйшла на гэтае месца, нічога не ўзяўшы з сабою, маючы ў сабе толькі слова Тваё: Госпадзе, памілуй! А з маёмасці ўсяе ёсць у мяне адно гэтыя кнігі, з якіх мае ўцеху душа і весяліцца сэрца...»

Так паблізу Полацка Еўфрасіння заснавала жаночы манастыр. Здарылася тое яшчэ пры жыцці Барыса Усяславіча, значыцца, не пазней 1128 года, калі князь памёр. Праз нейкі час пры царкве Багародзіцы (новай) асветніца стварае яшчэ адзін манастыр — мужчынскі. Гэта таксама быў подзвіг: тады, на пачатку XII стагоддзя, манастыроў у Полацкім княстве і ўвогуле на ўсходнеславянскіх землях існавала няшмат. (Ад мужчынскага манастыра Найсвяцейшай Багародзіцы да нашых дзён не захавалася ніякіх слядоў. Месца, дзе ён стаяў, дакладна невядомае, але ў часы Еўфрасінні была завядзёнка будаваць загараднія жаночыя і мужчынскія манастыры ў блізкім суседстве, каб у выпадку небяспекі манахі баранілі ад ворагаў і сваіх сясцёр у Хрысце. Гісторык Аляксей Сапуноў выказваў здагадку, што царква Багародзіцы і створаны пры ёй манастыр знаходзіліся на тым месцы, дзе пазней з'явіўся касцёл св. Ксавэрыя, пра які цяпер нагадвае толькі назва полацкіх могілак — Ксавэрыя, і гэта найбольш верагодна.)

У полацкіх манастырах, статуты якіх напісала сама Еўфрасіння, пад яе кіраўніцтвам дзейнічалі майстэрні, дзе перапісваліся кнігі — скрыпторыі. Тут існавала спецыялізацыя: адзін майстар рабіў каляровыя ініцыялы, другі — мініяцюры, трэці — пераплёты. Калі была патрэба перапісаць кнігу хутчэй, яе дзялілі на некалькі частак. Падзел працы значна павялічваў не толькі колькасць кніг, але і іх мастацкі ўзровень. Са скрыпторыяў кнігі разыходзіліся па ўсёй Полацкай зямлі і за яе межы. Іх чыталі вучоныя манахі і іншыя пісьменныя людзі, па іх вучыліся грамаце дзеці.

Пры адным з манастыроў, каб аздобіць полацкія храмы абразамі, падзвіжніца адчыніла іканапісную майстэрню.

Створаныя найпадобнейшаю Еўфрасінняй цвярдыні слова Божага былі асяродкамі дабрачыннасці. Там знаходзілі заступніцтва,

суцяшэнне і дапамогу ўдовы і сіроты, нямоглыя і пакрыўджаныя. Ёсць падставы казаць аб існаванні пры некаторых полацкіх манастырах багадзельняў і, магчыма, лякарняў.

Аз, букі, ведзі...

Полацкае княства мела вялікую патрэбу ў адукаваных людзях. Школы існавалі тут і да Еўфрасінні, але заснаванне асветніцаю манастыроў, яе чынная педагагічная дзейнасць далі школьнай справе новы магутны штуршок.

Дзеці ў тагачасных школах вучыліся чытанню, пісьму, «цыфіры» і царкоўным спевам. У літаратурных помніках той эпохі часта можна сустрэць пахвалу кніжнаму вучэнню. Яны прыпадабняюць людзей без навукі да бяскрылых птушак: як такая птушка не можа падняцца ў неба, так і чалавек не здольны дасягнуць без кніг «совершенна разума».

Грамаце вучылі па царкоўных кнігах — Псалтыру, Часаслову, Апосталу. Авалоданне чытаннем ўскладнялася тым, што рукапісныя кнігі не мелі знакаў прыпынку, словы і сказы часта зліваліся. Спачатку трэба было завучыць на памяць азбуку з цяжкімі назвамі літар — «аз», «букі», «ведзі»... Адначасова дзеці вучыліся выводзіць літары пісалам на бяросце або на дошчачках-васкоўках. Потым вучылі склады: «ведзі»-«аз» — «ва», «букі»-«он» — «бо»... Пасля вучань мусіў засвойваць цітлы — надрадковыя знакі ў выглядзе ламанай рыскі, якія ставіліся над скарочанымі словамі або над літарамі, што мелі лічбавае значэнне. Справіўшыся з гэтай прамудрасцю і навучыўшыся чытаць паасобныя фразы і малітвы, а таксама пісаць, дзеці заканчвалі першы цыкл сваёй навукі. На гэта ішло два-тры гады.

Прыкладна так пачынала спасцігаць грамату дзятва і ў школах, адчыненых рупнасцю Еўфрасінні. Аднак высокаадукаваная ігуменія імкнулася пашырыць межы звычайнай навучальнай праграмы. Апрача царкоўнаславянскае, юныя палачане вучылі грэцкую і лацінскую мовы, атрымлівалі звесткі з прыродазнаўства, рыторыкі, медыцыны. Вялікая ўвага надавалася гісторыі. Вучні павінны былі добра ведаць радавод дынастыі Рагвалодавічаў, важныя падзеі з мінуўшчыны Полацкай зямлі і ўсяго ўсходняга славянства. Напэўна, школа давала веды і ў сусветнай гісторыі.

* Бітва на Нямізе 3 сакавіка 1067 года паміж дружынай Усяслава Полацкага і злучанымі сіламі кіеўскіх князёў.
Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу.

* Битва на Немиге 3 марта 1067 года между дружиной Всеслава Полоцкого и объединенными силами киевских князей.
Миниатюра Радзивилловской летописи.

У сваёй педагагічнай дзейнасці Еўфрасіння абапіралася на мудрасць народнай дыдактыкі: «На всяк же день учаше сестры своа: старыя же учаше тръпению и воздръжанию, юныя же учаше чистоте душевной и бестрастию телесному, говению образному, ступанию кротку, гласу смирену, слову благочестну, ядению и питию безмолвну, при старейших молчати, мудрейших послушати, къ старейшим покорением, къ точным <роўным> и меншим любовь без лицемериа, мало вещати, а много разумети».

Аўтар «Жыццяпісу» быў малодшым сучаснікам асветніцы, магчыма, нават, яе вучнем. Пададзеныя ім фрагменты павучальных словаў Еўфрасінні, мяркуючы па ўсім, маюць рэальную аснову. Вучні і насельнікі манастыроў атрымлівалі ад ігуменні выдатныя ўрокі красамоўства. «Се собрах вы, яко кокошь <квактуха> птенца, под крыле свои и в паствину свою, яко овца, — прамаўляе яна да сясцёр. — Да пасецеся въ заповедех божиих! Да и аз <я> веселым сердцем подвизаюся учити вас, видящи плоды ваша трудныя и толико дождь проливаю къ вам, а нивы ваша въ едину меру стоят нерастуще, ни

* Паверыўшы крыжоваму цалаванню ворагаў, Усяслаў Чарадзей з сынамі пераязджае праз Дняпро і трапляе ў кіеўскую вязніцу.
Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу.

* Поверив крестному целованию врагов, Всеслав Чародей с сыновьями переправляется через Днепр и попадает в киевскую темницу.
Миниатюра Радзивилловской летописи.

поступающе горе. А год приспевает свершению, и лопата на гумне лежить. Но боюся, егда будеть плен <пустазелле> въ вас. Подщитеся, чада моя, убежати того всего! Но сотворите ся пшеница и осмелитесь вь жерновах смирением...» Уражваюць багатая вобразнасць гэтага ўрыўка і яе празрыстасць, цесная сувязь метафар і параўнанняў з жыццём простага чалавека. Тут, як і ў іншых фрагментах «Жыццяпісу», відаць несумнеўныя прамоўніцкія здольнасці асветніцы.

Кніжніца Еўфрасіння не магла не звярнуць увагі на змешчаны ў «Ізборніку» Святаслава 1073 года трактат пра паэтыку «Об образех», дзе на прыкладах (у тым ліку з «Іліяды» і «Адысеі») тлумачылася значэнне розных тропаў — алегорый, гіпербал, метафар. З вучнямі полацкіх школ, прынамсі, з найбольш здатнымі, праводзіліся заняткі і па паэтыцы.

Школы Еўфрасінні Полацкай былі перадавымі для свайго часу і праграмаю навучання, і складам вучняў, значная частка якіх набіралася з дзяцей простых гараджан.

* Кіяне ў часе паўстання 1068 года вызваляюць Усяслава Полацкага з вязніцы. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу.

* Киевляне во время восстания 1068 года освобождают Всеслава Полоцкого из заточения. Миниатюра Радзивилловской летописи.

Сёстры-манашкі

Памочніцамі і апірышчам Еўфрасінні ў шматлікіх клопатах і пачынаннях сталі яе сёстры: родная Гардзіслава (у манастве Еўдакія) і стрыечная Звеніслава (Еўпраксія). Але трапілі яны ў манастырскія сцены па-рознаму.

Заснаваўшы Спасаўскі манастыр, маладая ігуменння папрасіла бацьку прыслаць да яе сястру ў навучанне грамаце. Еўфрасіння «съ прилежанием учаше о спасении души, а она (Гардзіслава. — *У. А.*) съ прилежанием учашесь и приимаше, яко нива плодовита, умякчивши сердце свое». Затым «Жыццяпіс» паведамляе, што ігуменння таемна пастрыгла сястру ў манашкі, выклікаўшы гэтым у бацькі вялікі гнеў. «И узьярився на преподобную Ефросинию, сердцем горя. И приеха къ монастырю, глаголя: «Чадо мое милое, что се сотворила еси? Приложи сетование къ сетованию души моей, и печаль къ печали». Аднак, знайшоўшы шлях да сэрца сястры, асветніца здолела суцешыць Божым словам і бацькоў.

Са Звеніславаю было іначай. Яна прыйшла да сястры сама і «принесе всю свою утварь златую и порты <уборы> многоценныя» — відаць, ахвяравала храму Спаса свой пасаг. Адносіны паміж Еўфрасінняю і Еўпраксіяй былі вельмі блізкія — «яко едина душа въ двою телесу».

Сёстры заставаліся разам усё далейшае жыццё. Звеніславу-Еўпраксію полацкая ігумення абрала спадарожніцаю, выпраўляючыся ў канцы зямнога шляху ў Ерусалім. Роднай сястры Еўдакіі, пакідаючы Полацк, яна загадала «дръжати и урядити... оба манастыря». Пасля смерці Еўфрасінні Еўдакія, мабыць, заняла месца ігуменні Спасаўскага манастыра і працягвала асветніцкую дзейнасць старэйшай сястры.

Апавядаючы пра ад'езд найпадобнейшай у апошняе падарожжа, «Жыццяпіс» падае таксама звесткі аб пастрыжэнні Еўфрасінняю ў манастыр яе пляменніц Вольгі і Кірыаны. Як і ў выпадку з Гардзіславай, гэта адбылося супроць волі бацькоў. Даведаўшыся пра намер ігуменні, бацька дзяўчат, яе улюбёны брат Вячаслаў спрабаваў заклікаць да міласэрнасці: «Госпоже моя! Что ми хощеши сотворити? Два плача прилагаеши души моей: плача ся отхода твоего и сетуя чаду деля своею», але ягоныя просьбы былі марныя. Іншых звестак пра пляменніц асветніцы не захавалася, аднак яны як прадстаўніцы княскай дынастыі Рагвалодавічаў павінны былі іграць у манастырскім жыцці не апошнюю ролю.

Не трэба бачыць, як гэта робяць некаторыя, у апісаных вышэй паводзінах ігуменні жорсткасць. Такія (можа, і сапраўды не надта гуманныя з сучаснага гледзішча) учынкі дыктаваў Еўфрасінні клопат пра душы блізкіх, пра будучыню сваёй справы.

Аўтар «Жыццяпісу» сцвярджае, што святая мела такі дар ад Бога: зірнуўшы на кагосьці, адразу магла ўбачыць, ці ёсць у ім дабрадзейны дух і ці можа гэты чалавек быць абраннікам Гасподнім.

Ад заняпаду да адраджэння

Заснаваны найпадобнейшаю Еўфрасінняю Спасаўскі манастыр цягам стагоддзяў перажыў і часы ўзвышэння і гады поўнага заняпаду. Трэба скептычна ставіцца да слоў асобных расейскіх аўтараў

пра тое, што чарніцы пакінулі свой прыстанак у часе нашэсця Батыя. Дымна-крывавы след татарскіх ордаў застаўся ў XIII стагоддзі толькі на самым поўдні беларускіх земляў. Наогул жа Беларусь, у адрозненне ад сваіх усходніх суседзяў, татара-мангольскага прыгнёту не зведала. Больш верагодна, што ў часе нашэсця ў полацкіх манастырах ратаваліся ўцекачы з іншых усходнеславянскіх княстваў.

Цяжкія выпрабаванні надышлі для Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, калі Масковія распачала настойлівыя спробы захапіць беларускія землі, што на пачатку XIV стагоддзя канчаткова ўвайшлі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Гэта была магутная феадальная дзяржава, ядром якой з'яўлялася Беларусь, а паноўнай культураю — беларуская, прычым беларуская мова без малога чатыры стагоддзі выконвала ролю дзяржаўнай.

Калі ў 1563 годзе войска Івана Жахлівага (Грознага) ішло на Полацк, начутыя аб звярынай жорсткасці маскоўскага цара чарніцы з плачам развіталіся са Спасаўскім манастыром. Яны ўжо не вярнуліся туды ні ў гады маскоўскае акупацыі, ні пасля ўзяцця Полацка ў 1579 годзе вялікім князем літоўскім і каралём польскім Стэфанам Баторыем, якога беларусы называлі Сцяпанам Батурам.

Амаль усе полацкія манастыры, у іх ліку і Спасаўскі, з іхнімі землямі і іншай маёмасцю Батура перадаў ордэну езуітаў.

У 1654 годзе Полацк зноў занялі расейскія войскі. Праз два гады туды прыехаў цар Аляксей Міхайлавіч, які «ходил... в Спасской монастырь, что бывал девичей монастырь благоверной великой княжны Евфросинии Полоцкой... Того ж месяца июля в 9 день... было священие церкви Преображение Спасово».

Паводле Андрусаўскага міру 1667 года горад быў вернуты Рэчы Паспалітай. Вярнуліся ў манастыр і езуіты, якія заставаліся тут гаспадарамі і пасля захопу Беларусі Расеяй у канцы XVIII стагоддзя, да самага іх выгнання з Расейскае імперыі ў 1820 годзе. За іхнім часам на месцы даўнейшага манастырскага будынка быў змураваны двухпавярховы дом — летняя рэзідэнцыя езуіцкіх генералаў. Да 1832 года манастыр належаў каталіцкаму ордэну піяраў, потым спачатку манастырскі сабор, а ўслед за ім і іншыя збудаванні царская ўлада перадала праваслаўным.

Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у 1840 годзе быў адноўлены і з прычыны сваёй старажытнасці і значнасці прылічаны да першак-

ласных расейскіх манастыроў. Пры ім пачала дзейнічаць жаночая вучэльня, многія выпускніцы якой сталі народнымі настаўніцамі.

Зачынены бязбожнаю ўладаю ў 1928 годзе (тады ў ім жыло каля 250 манашак), Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр аднавіў сваё жыццё падчас нямецкае акупацыі. У пасляваенны час размешчаная паблізу вайсковая частка пачала браць з насельніц манастыра... кватэрную плату. Неўзабаве яго зноў зачынілі, і манашкі (у 1953 годзе іх было 54) мусілі выехаць у Жыровіцы, што пад Слонімам.

* Княская пячатка бацькоў Еўфрасінні Полацкай.

* Княжеская печать родителей Евфросинии Полоцкой.

Сёння старажытная цвярдыня слова Божага перажывае сваё новае адраджэнне, якое пачалося ў 1989 годзе. Манастыр зноў зрабіўся месцам паломніцтва вернікаў з усёй Беларусі і яе блізкага і далёкага замежжа. Наведаць заснаваны Еўфрасінняю агмень хрысціянскай духоўнасці лічаць сваім абавязкам, бываючы на радзіме, нашы суайчыннікі з іншых краін. Значныя сродкі на аднаўленне манастыра ахвяравалі актыўныя сябры Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» Анатоль Лук'янчык з ЗША і сібірскі прадпрымальнік Анатоль Сілівончык. Забягаючы наперад, адзначым, што ён жа быў у ліку тых, хто адразу падтрымаў ідэю ўзнаўлення Крыжа святой Еўфрасінні.

Узлёт полацкага дойлідства

Палітычная незалежнасць Полацкай дзяржавы спрыяла ўзнікненню адметнай школы дойлідства. Яна фармавалася на аснове візантыйскай архітэктурнай традыцыі, у адпаведнасці з якой быў узведзены Сафійскі сабор. Аднак тут эстэтычныя ідэалы візантыйцаў атрымалі своеасаблівае разуменне і развіццё, зазнаўшы і заходнееўрапейскія ўплывы.

У Полацкім княстве пачынаюцца пошукі новых архітэктурных

формаў. Сведчаннем гэтага было будаўніцтва ў Віцебску царквы Звеставання, у якой ідэі візантыйскага крыжова-купальнага храма спалучаюцца з некаторымі рысамі архітэктуры Заходняй Еўропы. Адыходам ад ранейшых канонаў вылучаліся царква-пахавальня полацкіх епіскапаў, храмы Бельчыцкага (Барысаглебаўскага) манастыра, заснаванага ў Полацку на мяжы XI–XII стагоддзяў.

У сярэдзіне XII стагоддзя канчаткова склалася полацкая школа дойлідства. Для яе была характэрная муроўка з плінфы (тонкай, добра абпаленай цэглы) з так званым «схаваным радам», калі адны рады плінфы выступалі, другія былі як бы прыхаваныя ўглыб, а прамежак паміж імі запаўняўся цамянкай — вапнавай рошчынай, у якую дабаўлялі тоўчаную цэглу. Знадворку будынкі не атынкоўвалі, і такая тэхніка муроўкі ўтварала двухколерную «паласатую» гаму сцен. Полацкія майстры адыходзяць ад візантыйскіх крыжова-купальных храмаў з некалькімі апсідамі* і набліжаюцца да стварэння прынцыпова новых формаў.

Найвышэйшы ўзлёт полацкай архітэктурнай школы, звязаны з творчасцю дойліда Іаана, прыпадае на гады асветніцкай дзейнасці Еўфрасінні, што, вядома, невыпадкова.

Іаан быў манахам аднаго з мясцовых манастыроў. Гэты надзелены самабытным талентам майстар пакінуў у Полацку не меней за тры храмы. Князёўна-ігумення ўважліва сачыла за ягонай творчасцю. Тым часам Спасаўскі манастыр папаўняўся манашкамі. Чарніцы прыносілі дарункі, свецкія асобы таксама рабілі ахвяраванні. Цесная драўляная царква ўжо з цяжкасцю змяшчала ўсіх, хто прыходзіў на малітву. Задумаўшы будаваць у сваім манастыры сабор, Еўфрасіння, натуральна, звярнулася да Іаана, які да таго часу ўжо стварыў такія адметныя храмы, як цэрквы Параскевы Пятніцы ды Барыса і Глеба ў Бельчыцах.

«Бе муж Иоан, приставник над делатели церковными <кіраўнік арцелі майстроў-муляраў>, — апавядае «Жыццяпіс». — Къ нему же многажды прихожаше, глаголила: «Иоане, востани поиди на дело вседръжителю Спасу!» И въ един от дний востав, Иоан прииде къ блаженой Ефросинии и рече: «Ты ли, госпоже, присылаеши и

* А п с і д а — паўкруглая або шматвугольная частка храма, якая выступае за ягоныя агульныя контуры і ў якой месціцца алтар.

понужаеши мя на дело?» Она же рече: «Ни». И пакы размысливши премудрая жена и рече ему: «Аще не аз тя возбуждаю, а кто тя взывает на таково дело, того послуша, и прилежно съ тщанием».

«И потом блаженая Ефросиниа заложи церковь камену святого Спаса. От начатка и устроена за 30 недель».

У канцы працы ў муляраў, паводле «Жыццяпісу», скончылася цэгла і не было чым «верха окончати», але назаўтра пасля малітваў ігуменні майстры знайшлі «плиты въ пещи».

Вядомы расейскі гісторык Леанід Аляксееў называе будаўніцтва Спасаўскага сабора «найбуйнейшаю падзеяй у полацкай і ва ўсёй старажытнарускай архітэктуры». Еўфрасіння была не толькі фундатаркаю храма, але і дарадчыцай, натхняльніцай Іаана на творчы чын.

Змураваная за адзін будаўнічы сезон Спасаўская (цяпер яе часта і не зусім правільна называюць Спаса-Еўфрасіннеўскай) царква — вяршыня архітэктурнай думкі Полацка. Гэта трохнефавы шасцістаўповы крыжова-купальны храм манастырскага тыпу памерам 8х12 метраў. Цэнтральны шырокі неф* з усходу завяршае масіўная паўкруглая апсіда, а бакавыя нефы — схаваныя ў тоўшчы сцяны паўкруглыя нішы. Паўднёвы і паўночны фасады аздобленыя пілястрамі з паўкалонамі. Яны рытмічна дзеляць паверхню на два вузкія і два шырокія прасценкі з размешчанымі на двух узроўнях паўцыркульнымі вокнамі.

Храм меў пазакамарнае** пакрыццё асноўнага аб'ёму і больш нізкага бабінца. Барабан купала ўзвышаўся над скляпеннямі і абапіраўся на кубічны пастамент. Важнаю рысаю Спасаўскага сабора было тое, што тут упершыню на абшары Беларусі з'явіліся какошнікі (несапраўдныя закамары, што маюць дэкаратыўнае значэнне). Закамары і какошнікі былі кілепадобныя, што яшчэ больш падкрэслівала стройнасць храма. Царкву завяршаў барабан з выцягнутымі вокнамі і шаломападобным купалам. У сярэдзіне храма асаблівасці кампазіцыі нараджалі ілюзію ягонай велізарнай вышыні. У заходняй сцяне, што ў два разы таўсцейшая за паўночную і паўднёвую, ідзе ход на хоры, паабапал якіх — келлі Еўфрасінні (з паўднё-

---

* Н е ф — падоўжаная частка храма, абмежаваная з абодвух ці з аднаго боку шэрагам калонаў або слупоў.

** З а к а м а р а — паўкруглае ці кілепадобнае завяршэнне часткі сцяны будынка, якое адпавядае форме ўнутранага скляпення.

вага боку) і Еўдакіі (з паўночнага). Тут прайшла значная частка жыцця асветніцы і яе сястры.

Іаан паставіў перад сабой задачу стварыць кампазіцыю, якая імкнецца ў неба, і бліскуча справіўся з ёю. Размешчаная на беразе Палаты і цудоўна ўштукаваная ў ландшафт, Спасаўская царква і цяпер, пасля праведзенай у XIX стагоддзі частковай перабудовы, пакідае надзвычай моцнае ўражанне завершанасці і суладнасці.

Для Еўфрасінні і яе сучаснікаў кожны храм быў вобразам і мадэллю Сусвету. У храмах увасабляліся ідэалы прыгажосці і гармоніі. Думаецца, што пачуцці асветніцы, калі яна ўпершыню ўбачыла новы сабор без рыштаванняў, былі сугучныя пачуццям Міхаіла Псела, які ў сваёй «Хранаграфіі» пісаў пра храмы: «Вока нельга адвесці не толькі ад невыказнай прыгажосці цэлага, з цудоўных частак сплеценага, але і ад кожнай часткі паасобку, і хоць ад іх можна атрымліваць асалоду бясконца, ніводнаю не ўдаецца налюбавацца дасхочу, бо позірк да сябе прыцягвае кожная...»

Беларускі гісторык Георгі Штыхаў і шэраг іншых даследчыкаў лічаць, што Спасаўскі сабор збудаваны паміж 1152 і 1159 гадамі.

Заканчэнне будаўніцтва і асвячэнне храма полацкім епіскапам колькі дзён святкаваў увесь горад. Аўтар «Жыццяпісу» паведамляе: «Преподобная же Еуфросиния, видевши церковь совръшенную, возрадавася душею. И бысть священие и велиа радость всем крестьяном. И собрашась князи и силнии мужи, черноризици и черноризци, и простие людие. И бысть радость велиа. И праздноваша дни мнози».

Падтрыманыя асветніцай наватарскія ідэі Іаана пачалі хутка пашырацца не толькі на радзіме, але і ў суседніх княствах. Гэтаму спрыяла праца полацкіх майстроў у іншых усходнеславянскіх землях. У канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў XII стагоддзя хтосьці з полацкіх дойлідаў узвёў у Смаленску княскі палацавы сабор архангела Міхаіла і гэтым заклаў асновы смаленскай архітэктурнай школы. Прыкладна ў той самы час палачане пабудавалі на Сінічай гары ў Ноўгарадзе царкву Пятра і Паўла. У Наваградку полацкія дойліды ў другой палове XII стагоддзя збудавалі з плінфы галерэю трохапсіднага храма, які знаходзіўся на месцы сучаснай Барысаглебаўскай царквы.

Спасаўскі сабор захаваўся да нашых дзён, але яму быў накана-

ваны нялёгкі лёс. З 1581 года (з невялікім перапынкам у 1654–1667 гадах, калі горад быў заняты расейскімі войскамі) храм належаў ордэну езуітаў, якія ператварылі яго ў касцёл. Пасля выгнання езуітаў з Полацка царква разам з манастыром, як ужо адзначалася, перайшла да ордэна піяраў, а ў 1832 годзе яе перадалі праваслаўным. Са жніўня наступнага года там аднавілася набажэнства. У часе пачатага тады рамонту царкву часткова перабудавалі (архітэктар А. Порта). У выніку геніяльны твор дойліда Іаана істотна змяніў сваё аблічча: на месцы пазакамарнага пакрыцця з'явіўся трохсхільны дах, шаломападобны купал ператварыўся ў «цыбуліну»... У наш час спецыялісты «Белрэстаўрацыі» распрацавалі праект аднаўлення першапачатковага выгляду храма.

Старажытныя вобразы

У фондах Рускага музея ў Пецярбургу захоўваецца старажытны абраз Божае Маці, вядомы пад назваю Адзігітрыя Полацкая. Гэты жывапісны твор XII стагоддзя мае вельмі цікавую гісторыю.

Яна пачынаецца з намеру Еўфрасінні аздобіць сабор, пабудаваны ў заснаваным ёю Багародзіцкім мужчынскім манастыры. З «Жыццяпісу» мы даведваемся, што знакамітая палачанка паслала слугу Міхаіла ў Царгорад (Канстанцінопаль) да візантыйскага імператара Мануіла Камніна і патрыярха Лукі Хрысаверга. Пасланец вёз багатыя дарункі і просьбу Еўфрасінні прыслаць ёй абраз Багародзіцы Эфескай, адзін з трох, што, паводле візантыйскае традыцыі, яшчэ пры жыцці Дзевы Марыі намаляваў з яе першы іканапісец апостал Лука, які з гэтае прычыны ў сераднявеччы лічыўся апекуном мастакоў.

Імператар паставіўся да просьбы полацкай сваячкі з разуменнем. Адпраўленыя ім у Эфес сто воінаў прынеслі абраз у Канстанцінопаль, адкуль пасля багаславення патрыярхам у храме святой Сафіі рэліквію паслалі Еўфрасінні. «Она же, — чытаем у «Жыццяпісе», — внесше въ церковь святей Богородици и постави ю<яе>... и украси ю златом и камением многоценным».

Трэба сказаць, што нямала даследчыкаў, у тым ліку і царкоўныя гісторыкі, выказваюць слушныя сумневы, што ў Полацк трапіў

арыгінал старажытнага твора. Сапраўды, навошта было патрыярху багаслаўляць абраз, намаляваны апосталам і ўслаўлены шматлікімі дзівосамі? Калі ж гэта была копія, патрыярхавы дзеянні выглядаюць цалкам лагічна. Прычым гаворку больш слушна будзе весці пра копію не з Эфескага, а з Царгародскага абраза Адзігітрыі.

Адны рэдакцыі «Жыццяпісу» паведамляюць, што прысланая Еўфрасінні рэліквія захоўвалася ў храме Спаса, іншыя — што ў царкве Багародзіцы. Такая разбежнасць звестак, напэўна, тлумачыцца тагачасным звычаем насіць Адзігітрыю (у перакладзе з грэцкае — Пуцяводную) па ўсіх полацкіх бажніцах. Пры гэтым найдаўжэй яна магла затрымлівацца якраз у двух манастырскіх саборах. Выносілі абраз па аўторках — як і Адзігітрыю Царгародскую ў Канстанцінопалі.

* Адзігітрыя Полацкая.

* Одигитрия Полоцкая.

Ёсць сведчанні, што ў 1239 годзе абраз перанеслі з Полацка ў горад Тарапец і перадалі ў тамтэйшую Уваскрасенскую царкву. Прычынаю шчодрага ахвяравання было вянчанне ў гэтым храме дачкі полацкага князя Брачыслава князёўны Параскевы з роду Рагвалодавічаў і князя Аляксандра Яраславіча, пазней названага Неўскім. Паводле іншае версіі, Полацкая Адзігітрыя трапіла ў Тарапец падчас Лівонскае вайны ў XVI стагоддзі разам з чарніцамі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, што ратаваліся ад «православнейшего» манарха Івана IV Жахлівага.

У нашым стагоддзі рэліквія «пераехала» ў пецярбургскі музей. Зрэшты, гэтыя версіі адказваюць не на ўсе пытанні.

У 1663 годзе, у часе цяжкай вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай, яшчэ адзін выдатны палачанін — пісьменнік, педагог, царкоўны дзеяч Сімяон Полацкі піша верш «Априль 27. Взенто образ насвентшэй Богородзицы з Полоцка до Москвы». Ён звяртаецца да святой Еўфрасінні з малітваю аб вяртанні ў Полацк забранага расейцамі цудатворнага абраза Багародзіцы:

Ты еси мати, о Еуфросиние,
Жытелем града всим удобрение.
Яже потщася икону святую
Внести здалеча в страну Полоцкую.
От Цариграда або из Иефесе
Цар благоверны всечестна прынесе,
Твоего ради зельна прошения,
Россыйских дело стран украшения.
Прыподи к ногам небесного цара,
Да не лишыт нас толикаго дара.
Потшыся паки возвращченей быти,
Иконе святей Полоцк украсити.
Отчынный град твой, в нем же бы трудися,
Христу жениху си уневестися.
Ибо толико град нам украшает
Девыя образ ы всюду вславляет.
Якое ест слонцем небо украшенно,
Светлыми звезды дивно упестренно.
Полотски граду бе утвержение,
Столп, стена, помошч ы огражение.
Нине без него како нам пребыти? —
Аки без слонца не удобно жыти.
Убо, о Мати, прыпади за нами
Господу Богу твоими рабами,
Да возвратил бы нам икону святую
Просветил землю Белороссыйскую

Пра які ж абраз кажа паэт?

Пра той, што трапіў у Полацк з Візантыі ў XII стагоддзі? (Звернем увагу на радок: «От Цариграда або из Иефесе», які можа быць ускосным сведчаннем, што візантыйскія майстры знялі копію з намаляванага апосталам Лукой Царгародскага абраза. Прынамсі, Сімя-

он Полацкі дакладна не ведае, адкуль трапіла святыня ў яго родны горад.)

Пра копію, якую зрабілі полацкія мастакі перад тым, як абраз Адзігітрыі, якому малілася калісьці найпадобнейшая Еўфрасіння, быў адпраўлены ў Тарапец?

Адзігітрыя Полацкая — самы ранні ўзор гэтага іканаграфічнага тыпу на ўсходнеславянскіх землях. Такія помнікі маюць надзвычай вялікае значэнне, бо з іх звычайна пачынаецца мастацкая традыцыя. Мабыць, невыпадкова выява Адзігітрыі — адзін з самых улюбёных сюжэтаў беларускіх іканапісцаў.

Абраз уражвае сваёй ганарыстай паставай, бездакорнымі прапорцыямі. На плечы Багародзіцы ўрачыста спадае мафорый (жаночы галаўны ўбор) з па-майстэрску намаляванымі складкамі.

Сапраўдная Полацкая Адзігітрыя сёння схаваная пад больш познімі фарбамі, аднак уяўленне пра першапачатковую выяву дае фотаздымак, зроблены электронна-аптычнымі прыборамі ў інфрачырвоным спектры. Даследчык старажытнага твора Віктар Шматаў піша пра яго чыстыя і звонкія фарбы, спакойнае высакародства і чысціню вобраза святой, пра спагадлівы ветлы выраз крыху наіўнага прыгожага твару і пяшчоту ў шырока расплюшчаных вачах.

Вучоны дапускае, што абраз з фондаў Рускага музея мог быць створаны не ў Візантыі, а ў самім Полацку паводле прысланага імператарам Мануілам грэцкага ўзору, які да нашых дзён не захаваўся. Пэўныя падставы для гэтай гіпотэзы дае стылёвае падабенства Полацкай Маці Божай з манументальным жывапісам Спасаўскай царквы.

Як вядома, замоўцаю фрэсак у пабудаваным Іаанам храме была Еўфрасіння. Тут яна зноў выступае як збіральніца і апякунка талентаў.

Спасаўская царква — адзіны на Беларусі храм, дзе фрэскавыя размалёўкі XII стагоддзя захаваліся амаль цалкам. Размешчаныя ярусамі фрэскі ўпрыгожвалі сцены, слупы і купал, з вышыні якога багаслаўляў вернікаў Збавіцель. Шматфігурныя кампазіцыі чаргаваліся з аднафігурнымі. Старажытныя выявы і цяпер хвалююць сваёй адухоўленасцю, стрыманай, але багатаю гамай, у якой спалучаюцца брунатныя, чырвоныя, жоўтыя, сінія, смарагдава-зялёныя колеры і адценні.

Першыя спробы расчысціць схаваныя пад алейнымі фарбамі

XIX стагоддзя полацкія фрэскі былі зробленыя ў 1929 годзе экспедыцыяй Цэнтральнай дзяржаўнай рэстаўрацыйнай майстэрні (Масква), у склад якой уваходзіў вядомы жывапісец і мастацтвазнаўца І. Грабар. У 80-я гады фрэскі вывучала экспедыцыя сектара старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Грунтоўны іх аналіз зроблены В. Церашчатавай у яе кнізе «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI–XVIII стагоддзяў», а таксама А. Сяліцкім у манаграфіі «Живопись Полоцкой земли XI–XIII веков». Дадамо, што ўжо некалькі гадоў у царкве працуюць мастакі-рэстаўратары, і гэта дае надзею ўбачыць унікальныя размалёўкі ў іх спрадвечным харастве.

Ці не самым цікавым адкрыццём апошняга часу сталі фрагменты размалёвак у келлі самой Еўфрасінні. Прастору сцен яе малельні займалі кампазіцыі сяміфігурнага «Дэісуса», «Звеставання», «Укрыжавання», «Грамніц» і іншыя. Адметныя рысы гэтых фрэсак — іхняя камернасць і маляўнічасць. Тут захавалася выява Дзевы Марыі, тонкія дасканалыя лініі твару якой нагадваюць найлепшыя грэцкія ўзоры.

Фрэскі Спасаўскай царквы ўражваюць псіхалагічнай глыбінёю, эмацыянальнасцю, духоўнай актыўнасцю вобразаў. Полацкія майстры былі добра знаёмыя з класічнай візантыйскаю манерай жывапісу той эпохі, а таксама з прыёмамі раманскага мастацтва. Некалькі манер малявання (абліччы з буйнымі рысамі, суровым змрочным выразам, з павялічанымі вачыма на адных фрэсках і амаль партрэтныя выявы на іншых) наводзяць на думку, што тут працавалі некалькі жывапісцаў.

Найбольш індывідуалізаваныя ў храме Спаса — жаночыя вобразы. На такі жыццёва верагодны паказ не адважваліся ні кіеўскія, ні наўгародскія мастакі. Самае моцнае ўражанне пакідае святая на паўночна-заходнім гранёным слупе, які падтрымлівае хоры. Твар з дугападобнымі бровамі і асабліва вочы намаляваныя настолькі пранікнёна, з такой жыццёвай пераканаўчасцю, што міжволі ўзнікае думка: перад намі не святая, а рэальная зямная жанчына. Дапытлівы і цвёрды позірк яе глыбокіх вачэй кажа пра багатае і напружанае духоўнае жыццё, наводзіць на роздум аб годнасці чалавека, сэнсе ягонага існавання. Няма нічога дзіўна-

га ў тым, што некаторыя даследчыкі ўжо даўно называюць гэты фрагмент партрэтам самой Еўфрасінні Полацкай. Ва ўсякім разе, на мастака не магла не ўплываць цялесная і духоўная прыгажосць асветніцы і яе сясцёр.

З імем найпадобнейшай Еўфрасінні навечна звязана і стварэнне полацкім майстрам Лазарам Богшам славутага Крыжа — шэдэўра старажытнабеларускага ювелірнага мастацтва, якому наканавана было зрабіцца нашай нацыянальнай святыняй. Пра загадкавы і драматычны лёс Крыжа святой Еўфрасінні і падзвіжніцкую працу дзеля яго ўзнаўлення ў нашы дні пойдзе гаворка ў наступных раздзелах кнігі. Пакуль жа прадоўжым апавяданне пра зямны шлях полацкай ігуменні і прызнанне яе святасці.

Пра што маўчыць «Жыццяпіс»

Еўфрасіння, як і іншыя ўсходнеславянскія падзвіжнікі, ніколі не губляла сувязяў з народам, была яму настаўніцай і суддзёй.

Створаны паводле канонаў свайго жанру, «Жыццяпіс» маўчыць пра драматычныя падзеі, якія ў той час адбываліся на зямлі нашых продкаў. Але асветніца, несумнеўна, была іх чыннай удзельніцаю і амаль паўстагоддзя істотна ўплывала на палітыку Полацка.

Незалежнае Полацкае княства ў XII стагоддзі ўступіла ў заканамерны працэс феадальнага драблення на паасобныя ўдзелы: Менскі, Друцкі, Ізяслаўскі, Віцебскі, Лагойскі... У іх валадарылі сыны Усяслава Брачыславіча Чарадзея і іхнія нашчадкі, якія вялі між сабою зацятую барацьбу за полацкі пасад. Сярод іх вылучаўся менскі князь Глеб Усяславіч, што працяглы час даволі паспяхова ваяваў з Уладзімірам Манамахам, але ўсё ж быў пераможаны і ў 1119 годзе памёр (відаць, быў атручаны) у Кіеве.

У маладосці Еўфрасіння была сведкаю паходу на Полацкую зямлю, арганізаванага наступнікам Манамаха вялікім кіеўскім князем Мсціславам. Тады, у 1127 годзе, аб'яднаныя сілы васьмі князёў да Полацка не дайшлі, але палачане вымушаныя былі прагнаць свайго князя Давыда з сынамі і прыняць, напэўна, больш дагоднага Кіеву Барыса Усяславіча. Праз два гады пасля гэтага Рагвалодавічы адмаўляюцца ісці на полаўцаў, і Мсціслаў адпраўляе непакорлівых князёў у Візантыю.

Падчас высылкі Рагвалодавічаў ігумення Еўфрасіння заставалася, магчыма, адзінаю прадстаўніцаю полацкай дынастыі на радзіме. Кіеўскія стаўленікі рабавалі краіну, падрываючы эканамічную базу Полацкай зямлі, хадзілі паходамі на яе даннікаў, распраўляліся з прыхільнікамі адпраўленых у Візантыю князёў. Укрыўшыся за манастырскімі сценамі, асветніца была своеасаблівым сцягам змагання палачан за незалежнасць.

Цяжка меркаваць, ці брала Еўфрасіння непасрэдны ўдзел у вечавых сходах, але яе ўздзеянне на веча было вельмі значным. Праз яго ігумення ўплывала не толькі на запрашэнне ў Полацк князёў, але і на прызначэнне епіскапаў, бо веча павінна было ўхваліць прапанаваную кіеўскім мітрапалітам кандыдатуру.

Думаецца, менавіта са згоды Еўфрасінні, а можа, і за яе наказам у 1132 годзе жыхары Полацка выгналі прысланага з Кіева Святаполка Мсціславіча і абвясцілі сваім князем Васільку Святаславіча з дынастыі Рагвалодавічаў, які таемна вярнуўся з Візантыі або нейкім чынам здолеў пазбегнуць высылкі. «Полочане же рекше: «лишается нас» и выгнаша Святополка, а Василка посадиша Святославича», — паведамляе пра гэтыя падзеі летапіс.

У якасці міратворыцы магла выступіць князёўна-ігумення і ў 1137 годзе, калі паўз Полацк праходзіў з дружынаю на Пскоў асуд-

* Пячатка Еўфрасінні.

* Печать Евфросинии.

жаны наўгародцамі на выгнанне князь Усевалад Мсціславіч, сын таго самага Мсціслава, што высылаў Рагвалодавічаў у Візантыю. Полацкі валадар Васілька меў дастаткова сілаў, каб паквітацца з сынам за жорсткасць бацькі, але замест гэтага зычліва правёў Усевалада праз свае воласці і прысягнуў забыцца на даўнюю варажнечу. Наўрад ці без удзелу Еўфрасінні, якая імкнулася спыніць спадчынную варожасць Рагвалодавічаў і нашчадкаў Яраслава Мудрага, абышоўся і шлюб дачкі полацкага князя Васількі і сына прыязна прынятага ім Усевалада.

Надзеленая не толькі ясным розумам, але і моцнай воляю й рашучасцю, Еўфрасіння мела вялікую вагу ў вырашэнні палітычных пытанняў і надалей. Яна не магла стаяць убаку ад падзеяў 1151 года, калі полацкае веча адмовіла ў даверы князю Рагвалоду-Васілю і запрасіла з Менска Расціслава Глебавіча. Праз восем гадоў палачане зноў прынялі да сябе Рагвалода, што пачаў барацьбу з менскімі Глебавічамі. Пра гэта падрабязна апавядае Кіеўскі летапіс. Мы даведваемся, што ў Полацку «бысть мятеж велик... мнози бо хотяху Рогволода». У горадзе ўзнікла змова супроць Расціслава. «Князе нашь, — пісалі палачане да Рагвалода, — согрешили есмь к Богу и к тебе, оже вестахом на тя без вины и жизнь твою всю разграбихом и твоея дружины, а самого емше выдахом тя Глебовичем на великую муку. Да еще ныне помянеши всего того, иже створихом своим безумием, и хрест к нам целуеши, то мы людие твое, а ты еси нашь князь, а Ростислава ти емше вдамы в руче <захапіўшы, аддамо табе ў рукі>, а еже хощеши, то створиши ему...»

Замах на Расціслава прызначылі на дзень святога Пятра, калі князя можна было выклікаць на братчыну ля царквы (старой) Багародзіцы. Аднак папярэджаны некім князь прыехаў, апрануўшы пад святочнае адзенне кальчугу і ўзяўшы з сабой вялікую ахову. На наступны дзень ягоных прыхільнікаў пазбівалі на вечы, а сам Расціслаў з дружынаю ўцёк і «многа зла створи волости Полотьской, воюя и скоты и челядь».

Аўтарытэт, што мела тады князёўна-ігумення, дазваляе прылічыць яе да магчымых аўтараў ліста князю Рагвалоду-Васілю.

У тагачаснай складанай палітычнай сітуацыі Полацк спачатку ўваходзіць у саюз са Смаленскам, потым змагаецца супроць нядаўніх хаўруснікаў з дапамогаю Чарнігава. Усобіцы працягваюцца

з пераменным поспехам. Вялікіх ахвяраў каштавала ў 1162 годзе бітва Рагвалода з Валадарам. Пад 1167 годам летапіс паведамляе, што менскаму князю Валадару ўдалося ненадоўга захапіць Полацк.

Патрыётка сваёй зямлі, Еўфрасіння не магла не прымаць яе нягодаў блізка да сэрца. «Жыццяпіс» кажа, што яна «ни хотяше видети никого же которающася <у стане варожасці>: ні князя со князем, ни бояри с боярином, ни служанина со служанином — но всех хотяше имети, яко едину душю».

У апошнія гады жыцця асветніцы ў Полацку княжыў Усяслаў Васількавіч. Еўфрасіння параўноўвала гэтага князя са сваім славутым дзедам, ягоным аднайменнікам. Лёгка здагадацца, што параўнанне было не на карысць Усяслава II. І ўсё ж яму, пэўна, не без дапамогі князёўны-ігуменні ўдаецца прыцішыць міжусобныя спрэчкі Рагвалодавічаў (у канцы княжання Усяслава Васількавіча шэсць полацкіх князёў бралі ўдзел у паходзе на Друцак, дзе сядзеў смаленскі стаўленік). Магчыма, адносны спакой у Полацкай зямлі таксама паўплываў на рашэнне Еўфрасінні зрабіць падарожжа ў Ерусалім.

Асветніца добра разумела, што замірэнне гэтае — часовае і на змену яму прыйдуць новыя братазабойчыя войны, вынікі якіх могуць быць катастрафічнымі. Мы ўжо адзначалі тоеснасць ідэй знакамітай палачанкі і аўтара «Слова пра паход Ігаравы».

Князевы міжусобіцы — згуба
для нас ад паганых. Казаць стаў
брат брату: гэта маё і тое ж маё!

Яраслаўле і ўсе ўнукі Усяслаўлевы!
Апусціце ўжо сцягі свае!
Пахавайце мячы свае пашчарбаныя!
Вы бо сваімі нязгодамі пачалі
наводзіць паганых на Рускую зямлю,
на надзел Усяслава, ад чаго і
насілле пайшло ад зямлі
Палавецкай*.

* Празаічны пераклад Янкі Купалы.

Паміж смерцю асветніцы і нараджэннем выдатнага твора нашай старажытнай літаратуры мінулася каля дваццаці гадоў, але мы маем поўнае права сцвярджаць, што такія думкі маглі належаць і Еўфрасінні.

Апошняя дарога

На схіле жыцця Еўфрасіння вырашыла здзейсніць духоўны чын паломніцтва ў Святую Зямлю. Брат Вячаслаў з іншымі сваякамі і ўсе жыхары Полацка, сабраўшыся ў Спасаўскім манастыры, прасілі ігуменню не пакідаць іх. Найпадобнейшая суцешыла землякоў, што паедзе маліцца за іх і за родную зямлю. Як мы ўжо ведаем, у тыя дні Еўфрасіння зрабіла Хрыстовымі нявестамі дзвюх сваіх пляменніц — Вольгу і Кірыану.

Перадаўшы ігуменства малодшай сястры Еўдакіі, сама Еўфрасіння пачала рыхтавацца да ад'езду. У той час у далёкія вандраванні выпраўляліся зазвычай — каб запабегчы бездарожжа — на пачатку зімы або раннім летам. Выехаўшы з Полацка неўзабаве па Калядах, увесну можна было дасягнуць межаў Візантыі. Відаць, адсвяткаваўшы Нараджэнне Хрыстова, вырушылі ў дарогу і полацкія паломнікі.

Еўфрасінню суправаджалі стрыечная сястра Еўпраксія і брат Давыд. Спачатку падарожнікі, напэўна, ехалі па рэках на санях, а потым часткова сухазем'ем, часткова вадою, пераадольваючы за дзень 30–40 вёрстаў. Паўсюль ва ўсходнеславянскіх княствах славутую палачанку чакала гасцінная прыняццё. На сваім шляху яна мела сустрэчу з візантыйскім імператарам Мануілам Камнінам, які ішоў вайною на ўграў. Кесар прыняў сваячку вельмі прыязна і «съ великою честью посла ю<яе> въ Царьград». Там паломнікі наведалі сабор св. Сафіі, набылі залатую кадзільніцу, дарагія фіміямы і іншыя неабходныя ў Святых Мясцінах рэчы і, атрымаўшы ад патрыярха багаславенне, паехалі далей.

Між іншым, сустрэча Еўфрасінні з імператарам Мануілам дае пэўныя падставы паставіць пад сумнеў прынятую згодна з «Жыццяпісам» дату паломніцтва і смерці святой (1173). Згаданы візантыйскі кесар апошні раз ваяваў з уграмі ў 1167 годзе, прычым вырушыў у паход на Вялікдзень, 8 красавіка. Прыкладна ў той

MUNIKAT.org

* План Канстанцінопаля. Сераднявечная гравюра.

* План Константинополя. Средневековая гравюра.

самы час абшараў ягонае дзяржавы павінны былі дапясці і полацкія паломнікі.

Звернем увагу яшчэ і на тое, што Еўфрасінніных пляменніц пастрыгаў у манастыр епіскап Дыянісій, які заняў полацкую катэдру пасля 1166 года. На падставе гэтых фактаў царкоўны гісторык Леў Гарошка, Аляксей Мельнікаў і іншыя даследчыкі прапанавалі адмовіцца ад агульнапрынятае даты, якая ўвайшла ў некаторыя энцыклапедыі, і лічыць годам смерці святой Еўфрасінні 1167-ы. Менавіта гэтую, удакладненую дату называе сучасная «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі».

У канцы красавіка ігумення і яе спадарожнікі прыйшлі да старажытных ерусалімскіх муроў. Паводле «Жыццяпісу», Еўфрасіння паслала свайго слугу Міхаіла да патрыярха прасіць, каб ёй адчынілі

* План Ерусаліма. Сераднявечная гравюра.

* План Иерусалима. Средневековая гравюра.

Хрыстовую браму. Пэўна, маецца на ўвазе Залатая брама, праз якую з боку Элеонскае гары Хрыстос увайшоў у Ерусалім у Вербную нядзелю.

Падчас паломніцтва найпадобнейшай князёўны-ігуменні Ерусалім належаў крыжакам, а валадарыў у ім кароль Амальрых I. Цікава, што гэты манарх, на думку некаторых гісторыкаў, таксама быў у сваяцтве з Еўфрасінняю — праз жонку французскага караля Генрыха I Ганну, якая была дачкою Яраслава Мудрага, сына княгіні Рагнеды Рагвалодаўны. Апрача таго, Амальрых I быў жанаты з пляменніцаю імператара Мануіла Камніна.

Усё гэта, відаць, спрыяла атрыманню дазволу. Еўфрасіння ўвайшла ў горад праз Хрыстовую браму і пайшла да Труны Гасподняй, дзе шчыра малілася і кадзіла з залатой кадзільніцы дарагімі фіміямамі. Пасяліўшыся ў манастыры святой Багародзіцы, полацкая паломніца прыходзіла да Труны тры дні запар. На трэці дзень яна пакінула там набытую ў Царгорадзе кадзільніцу і іншыя залатыя дарункі, а таксама шматлікія фіміямы і звярнулася да Госпада

з малітваю, у якой прасіла, каб дазволіў ёй памерці ў святым горадзе, дзе адбылося збаўленне роду чалавечага.

У хуткім часе найпадобнейшая Еўфрасіння захварэла. Гэта не дазволіла ёй самой схадзіць на раку Іярдан, і яна выправіла туды брата з сястрою і слугаў. Тыя прынеслі гаспадыні іярданскае вады, і паломніца, падняўшыся з ложка, напілася і акрапіла сябе ёю, а потым зноў легла, просячы Госпада хутчэй узяць да сябе яе душу.

«Жыццяпіс» апавядае, што Усявышні паслаў да Еўфрасінні анёла, які паведаміў, што яе малітвы пачутыя і на небе ўжо чакаюць сустрэчы з ёю. Відаць, наследуючы Еўфрасінні Александрыйскай, якая пад выглядам мужчыны жыла і была пахаваная ў мужчынскім манастыры, полацкая ігумення выправіла слугу прасіць месца на пахаванне да архімандрыта ерусалімскага манастыра святога Савы. Адказ быў ветлівы, але адмоўны: статут манастыра, паводле волі свайго святога, забараняў хаваць жанчын. Архімандрыт параіў звярнуцца ў Феадосіеў манастыр св. Багародзіцы, дзе спачывалі парэшткі мацярок святых Савы і Феадосія ды святых бяссрэбнікаў Казьмы і Даміяна. Еўфрасіння прыняла параду і купіла сабе там месца і дамавіну.

На дваццаць чацвёрты дзень хваробы яна адчула хуткі скон, паклікала святара і, паспавядаўшыся і прыняўшы прычасце, аддала сваю душу Усявышняму. «Давыд же и Евпраксия и с прочими спряташа тело ея честно».

У сціхірах* у гонар Еўфрасінні (спіс канца XVI стагоддзя) пяецца:

Яко винограде Рускои земли Полтеску граду,
насадив бого преже тебе,
ныне же принесе и преложи в землю обетованную,
преподобная Ефросиние, мнихомо удобрение.

Умертвивоши тело и душу оживила еси,
из земли отеческыя Полотскаго града,
воздвигоши во Сионе преиде
и всего своего богатества раздала еси,
и тамо приемоши небесеная.

* С ц і х і р а — царкоўны спеў ў гонар свята або святога.

Мошчы і цуды князёўны-ігуменні

Неўзабаве пасля смерці знакамітай полацкай паломніцы Святой Зямлі пачалі пагражаць магаметане. У 1187 годзе, рыхтуючыся да прыступу Ерусаліма, султан Саладзін за выкуп дазволіў хрысціянам пакінуць горад разам са сваімі рэліквіямі. Як велізарны скарб усходнеславянскія манахі везлі з сабою раку* з нятленнымі парэшткамі Еўфрасінні.

Калі верыць паданню, манахі меліся перанесці святыню адразу ў Полацк, але гэтаму перашкодзіла адвечная варожасць кіеўскіх і полацкіх князёў. Мошчы паклалі ў дальніх пячорах Кіеўскага Пячорскага манастыра ў падземным храме Звеставання Найсвяцейшай Багародзіцы, дзе рэліквіі давялося спачываць болей за сем стагоддзяў. На радзіме грымелі войны, занепадаў і зноў адраджаўся Спасаўскі манастыр, а тут панаваў вечны спакой. Вечка срэбнай ракі было адчыненае і прымацаванае да сцяны, астанкі найпадобнейшай Еўфрасінні — закрытыя покрывам; у галавах вісеў абраз святой і гарэла непагасная лампадка.

Першыя вядомыя нам спробы перанесці мошчы нябеснай заступніцы Беларусі ў яе родны горад адбыліся ў цараванне імператара Аляксандра II. Пра гэта спачатку хадайнічалі жыхары Полацка, потым, у 1864 годзе, ад імя насельніцтва трынаццаці воласцяў Полацкага павета і, ведама ж, са сваімі мэтамі душыцель нацыянальна-вызвольнага паўстання Кастуся Каліноўскага граф М. Мураўёў-Вешальнік. Пасля трэцяга хадайніцтва полацкага епіскапа Савы ў 1871 годзе з дазволу Свяцейшага Сіноду вярнулася і 23 траўня ст. стылю, на дзень памяці святой, была ўрачыста перанесеная ў Спасаўскі манастыр невялікая частка мошчаў — сярэдні палец правай рукі.

Наступныя просьбы Пецярбург нязменна адхіляў, а за Аляксандрам III палачанам наогул забаранілі звяртацца з гэтай нагоды ў вышэйшыя інстанцыі. Духоўная і свецкая ўлады ведалі, што паводле векавой традыцыі Еўфрасінню Полацкую шанавалі як сваю святую і прыхільнікі гвалтоўна скасаванай рускім царызмам Уніі, і баяліся вяртаннем рэліквіі стварыць прычыны для росту «сепаратызму».

Тым не менш, просьбы аб пераносе мошчаў найпадобнейшай Еўфрасінні працягвалі ісці як з Полацка, так і з іншых гарадоў бе-

* Р а к а — своеасаблівы куфар, дзе захоўваюцца святыя мошчы.

* Від Ерусаліма. Сераднявечная гравюра.

* Вид Иерусалима. Средневековая гравюра.

ларускіх губерняў. Два даклады на гэтую тэму былі прачытаныя ў 1908 годзе на Усерасійскім місіянерскім з'ездзе ў Кіеве. З'езд, удзельнікамі якога былі 30 праваслаўных іерархаў і блізу 300 святароў, прыняў рэзалюцыю аб неабходнасці вяртання святыні ў Полацк. Аналагічныя пастановы пачалі прымацца на з'ездах вернікаў і духавенства па ўсёй Беларусі. Свяцейшы Сінод стварыў адмысловую камісію, якая нарэшце прыняла станоўчае рашэнне. Відаць, гэтаму ў нейкай меры паспрыяў і тагачасны дырэктар канцылярыі обер-пракурора Сінода нараджэнец Полацкай епархіі В. Яцкевіч, які вывучаў жыццё і духоўныя подзвігі Еўфрасінні і выступіў з дакладам.

Мікалай II згадзіўся даць аўгусцейшы дазвол, але, відавочна, не без асцярогі. І цар, і Сінод цудоўна разумелі, што маюць справу з «нябеснаю апякункаю Беларусі». Так Еўфрасінню часамі называла расейская прэса, хоць сама назва «Беларусь» у афіцыйных дакументах паводле царскага ўказа была яшчэ ў 1840-м (праз год пасля знішчэння Уніі) забароненая і замененая на «Северо-Западный край». У друку чуліся галасы пратэсту праваслаўна-рускіх патрыётаў. «Труды Киевской Духовной Академии» тады, у прыватнасці, пісалі: «Католікі, як вядома з гісторыі, схільныя прызнаць найпа-

* Капліца па дарозе ў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.

* Часовня по дороге в Спасо-Евфросиниевский монастырь.

добнейшую Еўфрасінню святою свае царквы. Таму можна нават баяцца, каб праз планаваны перанос мошчаў... з Кіева ў Полацк не прычыніліся вялікія непрыемнасці і шкоды праваслаўю».

Адразу пасля дазволу вярнуць нятленныя парэшткі пачалася прапагандысцкая кампанія, скіраваная на тое, каб будучая ўрачыстасць паслужыла «ўмацаванню праваслаўя ў Полацкім краі і барацьбе з каталіцызмам».

19 красавіка 1910 года, на другі дзень Вялікадня, у пячорным храме Звеставання, дзе спачывалі мошчы святой, адбылося ўсяночнае набажэнства. Назаўтра ў новай кіпарысавай рацы святыню вынеслі з пячоры да багамольцаў, якіх у Лаўры сабралася болей за 20 тысяч. 22 красавіка Кіеў развітваўся з полацкай князёўнаю. Газеты паведамлялі, што жыхары горада запоўнілі вуліцы і схілы пагоркаў, галубцы і дахі дамоў. Па дарозе з Лаўры да Дняпра стаялі вайсковыя шыхты.

На перавоз мошчаў былі прызначаныя дзяржаўныя параходы: «Галавачоў» — для самой рэліквіі, «Кіеў» і «Аляксандраўск» —

для суправаджэнцаў. У насавой частцы аздобленага кветкамі, маем і сцягамі флагмана гэтай флатыліі стаяла капліца з люстранымі вокнамі, абапал яе — дзве залатыя харугвы. Раку з мошчамі паставілі на карме сляпуча белага карабля пад полагам.

Пад спевы трапара* ў гонар Еўфрасінні караблі адышлі ад берага і пачалі сваё ўрачыстае падарожжа. (Варта зазначыць, што ў Кіева-Пячорскай лаўры засталася сімвалічная частка парэшткаў святой. Яна захоўваецца на старым месцы ў падземнай царкве і цяпер, па-ранейшаму прываблiваючы праваслаўных паломнікаў. Але гэты факт, безумоўна, не дае падставаў сцвярджаць, што мошчы святой Еўфрасінні Полацкай спачываюць у Кіеве, як паведамляюць некаторыя ўкраінскія публікацыі. На жаль, такую памылку зрабіла і «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі».)

* Кіеў развітваецца з мошчамі нябеснай заступніцы Беларусі. 1910 год.

* Киев прощается с мощами небесной покровительницы Беларуси. 1910 год.

Флатылія з мошчамі прайшла па Дняпры ад Кіева да Воршы 695 вёрстаў, паўсюль сустраканая сціжмамі вернікаў. Асабліва маляўніча гэта выглядала ўначы, калі на берагах, ля самае вады, гарэлі зыркія вогнішчы, параходы мігцелі сотнямі агеньчыкаў свечак, якія адбіваліся ў люстрах капліцы, а на вяршыні фок-слямгі флагманскага карабля ззяў крыж.

У гарадах Любечы, Рэчыцы, Рагачове, Старым Быхаве, Магілёве і Воршы флатылія спынялася і адпраўляліся ўрачыстыя набажэнствы, якія збіралі велізарную колькасць багамольцаў і паломнікаў з усяго Прыдняпроўя. З Воршы да Полацка мошчы святой падарожнічалі сухазем'ем. Пад багавест полацкіх званоў рэліквію змясцілі спачатку ў катэдральным Мікалаеўскім саборы.

* Т р а п а р — кароткі царкоўны спеў у гонар свята або святога.

* Працэсія з мошчамі святой Еўфрасінні ў ваколіцах Полацка.

* Процессия с мощами святой Евфросинии в окрестностях Полоцка.

22 траўня па дарозе ў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр урачыстая працэсія расцягнулася на дзве вярсты.

Аб тым, якое значэнне надавалі пераносу мошчаў святой Еўфрасінні царскія ўлады, сведчыць удзел у хросным ходзе ў храм Спаса вялікага князя Канстанціна, які прадстаўляў самога імператара, каралевы Грэцыі Вольгі Канстанцінаўны і вялікай княгіні Елізаветы Фёдараўны, роднай сястры царыцы.

У змураваным некалі на замову ігуменні Еўфрасінні Спасаўскім храме святыню змясцілі ў кіпарысавай рацы, абкладзенай срэбрам, аздобленай пазлачонымі чаканнымі барэльефамі, а таксама эмалевымі выявамі крыжоў і арнаментаў. Рака была зробленая ў візантыйскім стылі на ахвяраванні вернікаў і каштавала велізарныя на той час грошы — 12 тысяч рублёў.

Так 23 траўня 1910 года, у дзень памяці святой Еўфрасінні, яе мошчы вярнуліся ў Спасаўскі манастыр.

Да ўрачыстае падзеі гарадское царкоўнае брацтва выдала «Путе-

* Пачатак хроснага ходу з мошчамі Еўфрасінні Полацкай з Мікалаеўскага сабора ў Спасаўскі манастыр. 22 траўня (5 чэрвеня новага стылю) 1910 года.

* Начало крестного хода с мощами Евфросинии Полоцкой из Николаевского собора в Спасский монастырь. 22 мая (5 июня нового стиля) 1910 года.

водитель по городу Полоцку». Сярод змешчаных у гэтым даведніку разнастайных звестак знаходзім і паведамленні пра дзейнасць на радзіме асветніцы Спаса-Еўфрасіннеўскай жаночай епархіяльнай вучэльні і самога царкоўнага брацтва ў імя святога Мікалая і найпадобнейшай Еўфрасінні, што працягвала дабрачынныя традыцыі падзвіжніцы, утрымліваючы жаночую багадзельню і сірочы прытулак, на карысць якога і быў выпушчаны «Путеводитель».

Тады ж у полацкай друкарні Х. Клячко выйшаў таксама прымеркаваны да пераносу мошчаў кароткі гістарычны нарыс «Минувшее и настоящее г. Полоцка». Яго аўтар Н. Зорын карыстаецца выпадкам, каб нагадаць землякам пра занядбанне Сафійскага сабора, дзе некалі жыла святая: «Суровый упрёк несется к нам с высот Верхнего замка от храма св. Софии Премудрости Божьей. Печальный, обезглавленный сти-

* Хросны ход на Чырвоным мосце ў Полацку.

* Крестный ход на Красном мосту в Полоцке.

хией, почти оставленный и полузабытый (службы в нем совершаются только в течение одного мая месяца), разрушенный беспощадным временем — этот храм, дорогое сокровище и сердце древнего Полоцка, теперь с находящимися вокруг него развалинами когда-то красивого и величественного здания, производит самое тяжелое впечатление на наблюдателя и вызывает краску стыда и чувство горькой обиды...»

Звычайна мошчы святых выяўляюць цудадзейную сілу. Пра адно з дзівосаў, што адбылося падчас пераносу астанкаў Еўфрасінні, пакінулі звесткі полацкі краязнаўца сябра Віцебскай вучонай архіўнай камісіі Н. Кайгародаў і старэйшы лекар Полацкага кадэцкага корпуса доктар медыцыны А. Мансветаў. Паводле іх, у Спасаўскім манастыры жыла чарніца, якая цяжка хварэла на верад страўніка і так знясілела, што ўжо амаль не падымалася з ложка. Доктар страціў усялякую надзею выратаваць хворую; ейнае цела было ў пролежнях, а боль сунімалі наркотыкамі.

Калі ў манастыр прыбылі мошчы Еўфрасінні, іх спачатку паставілі

ў Крыжаўзвіжанскім саборы. Па ўсяночнай вернікі стварылі да рэліквіі велізарную чаргу. Манастырскія сёстры, выконваючы просьбу хворай, прывялі яе ў храм і ўзнялі на памост, дзе яна прыхінулася да рэліквіі і пацалавала руку святой Еўфрасінні. Пасля гэтага манашка адчула такі прыліў сіл, што здолела падняцца і ісці без чужой дапамогі. Назаўтра, у часе чарговага візіту да хворай, доктар Мансветаў сустрэў пацыентку на двары, прычым яна ўжо не мела ніякіх відочных прыкметаў немачы. Доктар прызнаецца, што ў гэтым выпадку сутыкнуўся са з'яваю, якая пераўзыходзіць межы людскога разумення.

Манастырская хроніка тых часоў, на жаль, не захавалася. Магчыма, Еўфрасіння працягвала чыніць дзівосы, але ўжо з непазбежнасцю чорнай навальнічнае хмары насоўвалася іншая эпоха.

XX стагоддзе наканавала святыні не спакой, а пакуты.

Пасля бальшавіцкага перавароту 1917 года, калі пачалася бязлітасная вайна супроць рэлігіі, святыя мясціны і рэліквіі зазналі на сабе варварства і здзекі новае ўлады. Драма не абмінула і Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

Люты 1919-га. Народны камісарыят юстыцыі РСФСР выдае пастанову аб арганізаваным ускрыцці мошчаў цудатворцаў па ўсёй краіне. Выкананне бязбожнага рашэння затрымліваецца толькі з прычыны грамадзянскае вайны.

У 1922 годзе адбылося злачыннае ўскрыццё дамавіны з мошчамі святой Еўфрасінні. У фондах Полацкага гістарычна-культурнага запаведніка захаваліся дакументы, што распавядаюць пра гэтае страшэннае блюзнерства. (Друкуюцца з захаваннем арфаграфіі і пунктуацыі арыгінала.)

ПРОТОКОЛ
вскрытия и освидетельствования мощей Ефросинии комиссией, выделенной согласно постановлению Полоцкого уездисполкома, утвержденному губисполкомом, состоявшегося 13 мая 1922 г. в гор. Полоцке в Спасо-Ефросиньевском монастыре.

Присутствовали: от уезд. исполкома т. Хомяков, от укома т. Лейман, от Союза Молодежи т. Пискунов, от женотдела т. Барановская, от уездздрава доктор Ленский, ученый-археолог Дейнис, пред-

ставители красноармейских частей и представители духовенства — священники Черепнин, Покровский, игуменья Елена, казначей общины Ксунина Лариса, монахини, представители верующих, городского населения и крестьян.

В 14 час. коллективно, в присутствии вышеперечисленных и членов комиссии уездисполкома т. Ткачева, начальника и военкома 43-х полоцких ком. курсов т. Фабрициуса, военкома 41-го полка т. Дмитриева, представителя губотдела юстиции т. Шефкуна, члена губисполкома т. Григорьева, представителя губполитуправления т. Секса, врачей: Ленского, Христенсена, Лундберга, ученого-археолога Дейниса, игуменьи и монахинь монастыря; последние приступили к освобождению мощей от облачения.

По наружному виду в гробу лежит нечто имеющее форму человека. По снятии застежек и схимьи, изготовленной в 1910 г., обнажается другая одежда — мантия. Фигура лежит в голубом шелковом ваточнике, видны сложенные накрест руки, в красных ватных перчатках. Ноги обуты в красные шелковые туфли. Голова завернута — сначала ватный чехол розово-полосатого шелка, затем парчовый колпак и красно-шелковый чехол.

Под снятой одеждой находится хитон, шелковый, лилового цвета. Вся фигура обложена — по заявлению монахинь, во избежание тряски при перевозке — парчовыми скуфьями и разными частями церковных одежд. По снятии шелковой сорочки найдена записка современного происхождения, подписанная иереем Клавдием. Кроме того, найдены четки (янтарные), по заявлению монахинь, привезенные с мощами из Иерусалима. Из-под сорочки обнажается костяк, завернутый в шелковые лоскуты. Череп без волос вплотную приложен к туловищу, но с ним не связан. Грудная клетка изломана, кое-где на остатках ребер сохранились заплесневшие и мумифицировавшиеся части мышечной ткани и кожи. Часть ребер провалилась внутрь и подперта каким-то материалом, по развертывании оказавшимся частями парчовых облачений. На реплику одного из присутствующих «Развязывайте скорее» монахиня Неонила заявляет: «Не торопитесь, вас больше ждали», другая заявляет: «Тут ничего нет, одне косточки». Священник Пестман, оттиснутый присутствующими в сторону, настаивает на своем праве быть впереди и удовлетворяется.

ЗАКЛЮЧЕНИЕ
врачебно-научной экспертизы

Доктор Христенсен устанавливает, что череп отделен от туловища вследствие разрушения связочного аппарата; разрушения связочного аппарата — от тления. В середине череп пустой. Лицевая сторона черепа замазана какой-то мастикой давнего происхождения в области глаз, век и верхней челюсти, по предположению врачей — с целью туалета, дабы сгладить неприятное впечатление и придать форму лицу. Больше мастики нигде не замечается. На грудной клетке местами покрытая плесенью незначительно высохшая кожа. На суставах сухожилия мумифицировались и связывают некоторые суставы. По мнению врачебной экспертизы, все кости принадлежат одному трупу; волос нигде нет. Зубы имеются лишь только в верхней челюсти. Труп мумифицировался вследствие благоприятных почвенных условий. Давность мумифицированного трупа установить невозможно, но науке известно, что при благоприятных почвенных условиях трупы сохраняются от 10 до 1000 лет, постепенно подвергаясь разрушению. С указанным мнением согласны и вполне солидарны врачи Лянсберг, Калашников и Ленский.

Ученый-археолог Дейнис считает, что труп плохо сохранился, так как он видел и более хорошо сохранившиеся мумии египетского происхождения. Возможно, что последние более сохранились вследствие искусственной мумификации, тогда как этот труп подвергался мумификации почвенной.

Перакладзем гэты тэкст на беларускую мову: «У лета 6669 (паводле сучаснага летазлічэння, 1161. — *У. А.*) кладзе Еўфрасіння святы крыж у сваім манастыры, у царкве святога Спаса. Дрэва святое бясцэннае, акова ж яго, золата і срэбра, і камяні, і перлы на 100 грыўняў, а да... (пропуск) 40 грыўняў. І хай не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, не аддаюць. Калі ж не паслухаецца хто і вынесе з манастыра, хай не дапаможа яму святы крыж ніў жыцці гэтым, ніў будучым, хай праклятьі будзе ён святой жыватворнаю Тройцаю ды святымі айцамі 300 і 50 (?) сямі сабораў святых айцоў і хай напаткае яго доля Юды, які прадаў Хрыста. Хто ж насмеліцца ўчыніць такое... валадар, або князь, або епіскап ці ігумення, або іншы які чалавек, хай будзе на ім гэты праклён. Еўфрасінняж, раба Хрыстова, што справіла гэты крыж, здабудзе вечнае жыццё з усімі святымі...»

У першай частцы тэксту паведамляецца кошт золата і срэбра, а таксама камянёў, што пайшлі на аздабленне крыжа. 40 грыўняў — мабыць, плата, якую атрымаў сам Лазар Богша. Гэта былі вялікія

на той час грошы: прыкладна столькі плацілі за ўвесь комплекс працаў, звязаных з машчэннем 8000 локцяў (4000 метраў) драўлянай мастоўкі або за 160 лісіных шкураў. Адсюль можна зрабіць выснову, што Богша — заможны рамеснік-ювелір, асабіста свабодны чалавек. Богша — ягонае свецкае імя, магчыма, скарочаная форма ад Багуслаў. Мы памятаем, што наяўнасць двух імёнаў была тады традыцыяй: бацька заказчыцы крыжа князь Георгі меў, напрыклад, яшчэ адно імя — Святаслаў.

Другая палова вялікага надпісу — тыповы заклён той эпохі, калі рабункі цэркваў былі нярэдкаю з'яваю нават у мірны час. Здараліся і выпадкі, калі каштоўныя рэчы, ад'язджаючы, забіралі з сабою з храмаў архірэі.

Цікава, што заклёны падобнага зместу былі пашыраныя як у Полацку, так і ў іншых старажытнабеларускіх землях. На вядомым Полацкім Евангеллі XII–XIV стагоддзяў можна прачытаць: «А хто иметь отнимати от св. Троици или вельможа, или попъ, иметь продавати, да будеть проклятъ в сии векъ и в будущии». У Драгічыне археолагамі былі знойдзеныя касцяныя тронкі нажа XII–XIII стагоддзяў з надпісам: «Ежьковъ ножъ, а и украдет — проклят будеть».

Першая, дзелавая частка захаванага на Крыжы тэксту напісаная на гэтак званай старажытнарускай мове, а ў другой аўтар (верагодна, сама Еўфрасіння) звяртаецца да царкоўнаславянскае і выкарыстоўвае ўласцівыя рэлігійнай літаратуры вобразы. Надпіс мае ўплыў жывой беларускае мовы з ейным аканнем — напрыклад, «манастыр»; гэтае ўздзеянне адчуваецца і ў лексіцы — «пискоупъ» (епіскап), «древо», «злото». Сустракаецца ў надпісах на Крыжы таксама дзесятковае «і».

Геніяльны мастак

Ужо адзначалася, што стваральнік Крыжа Еўфрасінні быў чалавекам асабіста свабодным і дастаткова багатым. Гэта даказваюць і высокая плата, атрыманая за выкананне заказа полацкай ігуменні, і сама магчымасць пакінуць нашчадкам сваё імя. Тут мы сутыкаемся з надзвычай рэдкім выключэннем, бо абсалютная большасць твораў мастацтва той эпохі з'яўляецца ананімнай.

Кароткі надпіс на Крыжы — своеасаблівы аўтограф геніяльнага ювеліра — кажа аб тым, што Богша быў добра вядомым майстрам перагародкавай эмалі і само яго нае імя ўжо служыла гарантыяй дасканаласці зробленай працы. Разам з тым спецыялісты пазнаюць руку стваральніка нашай нацыянальнай рэліквіі і ў цэлым шэрагу іншых, не падпісаных твораў эмальернага мастацтва. Існуюць і больш познія рэчы, зробленыя ў рэчышчы Богшавай традыцыі, а значыць — яго вучнямі.

У адрозненне ад майстроў-сучаснікаў, якія звычайна аддавалі перавагу якому-небудзь аднаму тэхнічнаму прыёму мастацтва эмалі, Богша з віртуознай лёгкасцю карыстаўся ўсімі. Адзенне святых на яго ных абразках то вызначаецца строгім геаметрызмам, то свабодна і маляўніча льецца, калі ювелір выкарыстоўвае тэхніку, пры якой перагародкі як быццам «трымцяць».

Каб асобныя перагародкі стваралі складаны гарманічны малюнак, яго трэба было трымаць перадвачыма. Візантыйскія майстры пазначалі контуры выявы іголкай. На эмалевых вырабах з усходнеславянскіх земляў слядоў такой падрыхтоўкі не выяўлена. Майстры, відаць, малявалі эскіз на пергамене або наносілі абрысы на васкаваную дошчачку, пасля чаго на яе накладвалі залатыя перагародкі розных формаў. Потым перагародкі замацоўваліся клеем на залатой пластцы, запаўняліся эмалевай масай, і адбывалася абпальванне. Усімі гэтымі аперацыямі аўтар Крыжа валодаў як майстра найвышэйшага ўзроўню.

У часе працы над сваім шэдэўрам Богша быў ужо, бясспрэчна, чалавекам сталага веку. У межах гістарычнай верагоднасці знаходзіцца і думка аб тым, што Прадслава-Еўфрасіння была знаёмая са слынным ювелірам з дзіцячых гадоў. У яго ной майстэрні юная князёўна мала выбіраць сабе аздобы, захапляцца дзівоснымі эмалевымі абразкамі і неабходнымі для іх нараджэння складанымі інструментамі.

Характарызуючы полацкага майстра, аўтары кнігі «Крест — хранитель всея Вселенныя» (Минск, 1996) Л. Аляксееў, Т. Макарава і М. Кузьміч пішуць: «Сапраўды, ніхто са старажытнарускіх эмальераў не быў настолькі артыстычным! Выява Хрыста Збавіцеля сярод твораў з перагародкавай эмаллю рускай работы не мае сабе роўных... Яго (Богшы. — *У. А.*) майстэрства — безумоўная вяршыня старажытнарускай эмальернай справы». Там сама робіцца высно-

ва пра тое, што аўтарства яшчэ аднаго выдатнага твора з вобразам Хрыста — медальёна з Кіеўскага скарбу 1824 года — несумнеўна належыць Богшу. А прачаўсяго іншага, гэта можа сведчыць, што ў сярэдзіне XII стагоддзя полацкі ювелір выконваў заказы вялікага кіеўскага князя і, магчыма, нейкі час працаваў у Кіеве. У такім разе зразумела, чаму асаблівасці яго творчага падыходу былі перанятыя разанскімі эмальерамі, якія праходзілі навучанне ў кіеўскіх майстэрнях. Відавочныя сляды ўплыву старажытнабеларускага майстра сустракаюцца і ў вырабах ювеліраў з іншых рускіх земляў.

* Святы Дзімітры на медальёне з кіеўскага скарбу 1824 года.

* Святой Димитрий на медальоне из киевского клада 1824 года.

Інакш кажучы, у эмальерным мастацтве Богша стварыў на Усходзе славянства цэлы самастойны кірунак.

Заканамерна ўзнікае пытанне, дзе вучыўся свайму майстэрству сам Лазар Богша. Ён, безумоўна, добра ведаў традыцыі грэцкіх майстроў. Але мастацтвазнаўчы аналіз яго твораў дазваляе даследчыкам сцвярджаць, што палачанін быў знаёмы таксама з грузінскімі ювелірамі і іх эмалямі. Уплыў грузінскай школы адчуваецца, у прыватнасці, у перадачы вобразаў Збавіцеля і Багародзіцы, у амаль поўным супадзенні некаторых арнаментаў. На ніжнім краі Крыжа Еўфрасінні, на пластцы з выявай святой Сафіі, змешчаны прастакутнік з кароткімі і ўвагнутымі бакамі. Тут на белай эмалевай асновадзі чаргуюцца рады сініх і чырвоных разетак з крыжамі. Такі матыў у рускіх эмаляхадзначаны толькі адной ічы, затое ён да драбніцаў паўтарае арнамент эмалевай аздобы вядомага грузінскага абраза з Курчэлі. Некаторыя даследчыкі лічаць, што полацкі майстар мог пэўны час вучыцца ў Візанты і.

Што да паходжання майстра Богшы, дык сёння ўжо адкінутыя мер-

каванні аб яго быццам бы заходнеславянскіх караняхальбо аб тым, што полацкі ювелір быў выхадцам з «Паўднёва-Заходняй Русі». Імя Богшы ў XII–XIII стагоддзяхбыло пашыранае на ўсходнеславянскіхі асабліва на старажытнабеларускіхземлях. Яно часта сустракаецца іў больш позніхдакументахэпохі Вялікага княства Літоўскага. Утворанае адгэтага імя прозвішча існуе ў Беларусідагэтуль.

Асаблівасці імяннога надпісу на Крыжы таксама сведчаць пра мясцовае паходжанне майстра.

Такім чынам, мы маем вельмі важкія падставы называць геніяльнага мастака нашым суайчыннікам.

Адысея рэліквіі

Змешчаны на Крыжы заклён, што абяцаў страшную кару таму, хто ўкрадзе або аддасць ці прадасць святыню, безумоўна, дзейнічаў на сучаснікаў Еўфрасінніі на іхніх нашчадкаў. І ўсё ж страх перад праклёнам не быў неадольным. Пасля смерціасветніцы Крыж Лазара Богшы заставаўся ў Спасаўскім манастыры нядоўга. Відаць, ужо на мяжы XII–XIII стагоддзяў яго вывезлі з Полацка смаленскія князі. Крыж захоўваўся ў іх, пакуль вялікі князь Васіль III, захапіўшы ў 1514 годзе Смаленск, не забраў рэліквію ў Маскву. Згадаем, што жыхары старажытнага беларускага горада Смаленска глыбока шанавалізвязаную з імем святой Еўфрасінні рэліквію. Яна знаходзілася, відаць, ва Успенскім саборы або ў адным з манастыроў. Каб у час абрадаў асвячэння вады не пашкодзіць каштоўныя хрысціянскія святыні, у 1495 годзе была зробленая досыць блізкая копія крыжа, якую выкарыстоўвалі ў падобныхвыпадках.

Пад 1563 годам Ніканаўскі летапіс паведамляе: «Когда же боголюбезный царь и великий князь (Іван Жахлівы. — *У. А.*) мысля итти на отступников крестьянския веры на безбожную Литву, бе же тогда в его царской казне крест Полоцкий украшен златом и камением драгим, написано же на кресте: «Зделан сий крест в Полотцску повелением княжны Евфросинии и поставлен во церкви всемилостиваго Спаса, да не изнесит его ис тое церкви никтоже; егда же кто его из церкви изнесет, да приимет с тем суд в день судный». Нацыи же поведают: в прежнии некогда Смолняне и Полочане дер-

* Вялікі князь маскоўскі Васіль III, пры якім Крыж святой Еўфрасінні быў перавезены са Смаленска ў Маскву.

* Великий князь московский Василий III, при котором Крестсвятой Евфросинии был перевезен из Смоленска в Москву.

жаше у себя государей князей по своим волям и межь себя смолняне съ полочаны воевахуться и тот крест честный Смолняне въ Полотцку взяша в войне и привезоша въ Смоленеск; егда же благочестивый государь князь великий Василий Ивановичь всеа Русии вотчину свою Смоленеск взял, тогда же и тот честный крест во царствующий град Москву привезен. Царь же и великий князь тот крест обновити велел и украсити. И тот крест взя с собою и имея надежду на милосердаго Бога и на крестьную силу, победити врага своя, еже и бысть».

Падчас аблогі Полацка зімою 1563 года Іван Жахлівы спыняўся паблізу Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Магчыма, тады, просячы ў неба перамогі і знаходзячыся пад уздзеяннем змешчанага на Крыжы страшнага заклёну, цар і загадаў вярнуць полацкую святыню на яе спрадвечнае месца. Мог ён зрабіць гэта ікрыху пазней — калі замольваў грахі пасля ўчыненых на ягоны загад ў Полацку крывавых злачынстваў. Як сведчаць гістарычныя крыніцы, пасля захопу Полацка маскоўскім войскам там было знішчана ўсё іншавернае насельніцтва. 11 060 сялян, якія схаваліся ад захопнікаў у Ніжнім замку, цар раздаў падначаленым. 50 000 мяшчан і шляхты таксама былі ўзятыя ў палон. Тысячы галодных, абы-як апранутых людзей пагналі па зімовых дарогах на ўсход, у Масковію. Тыя, хто адмовіўся ад царскай службы, разам з жонкамі і дзецьмі доўга сядзелі па турмах у кайданах, а 665 палонных па волі Івана Жахлівага былі забітыя.

У 1579 годзе горад узялі войскі караля і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя. Неўзабаве царква Спаса, дзе знаходзіўся Крыж Еўфрасінні, перайшла да езуітаў. З гэтага часу палачане захоўвалі рэліквію ў Сафійскім саборы, які з канца XVI стагоддзя да 1839 года

быў уніяцкім храмам. Згодна з падлікамі беларускага гісторыка Анатоля Грыцкевіча, у канцы XVIII стагоддзя ўніяты, або грэка-каталікі, складалі на беларускіх землях не меней за тры чвэрткі насельніцтва. Уніяцтва зрабілася, па сутнасці, нацыянальнай рэлігіяй.

Добра разумеючы ўплыў рэліквіі на вернікаў-беларусаў, езуіты распачалі судовы працэс, каб вярнуць Крыж у Спасаўскую царкву. Цікава, што галоўным іхаргументам быў старажытны надпіс. Прайграўшы суд, новыя гаспадары Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра паспрабавалі атрымаць святыню хітрасцю. Паданне кажа, што аднойчы, калі на свята Узвіжання рэліквію вынеслі на сярэдзіну храма, пасланец езуітаў падмяніў яе, паклаўшы на аналой падрыхтаваную загадзя падробку. Але вернікі-ўніяты хутка заўважылі падмену і здагналі выкрадальніка на вуліцы, вярнуўшы святыню ў сабор.

* Іван Жахлівы.

* Иван Грозный.

Вядомы ўніяцкі дзеяч першай паловы XVIII стагоддзя Ігнат Кульчыцкі пакінуў наступны запіс: «Будучы доктарам філасофіі ў нашым манастыры, я часта назіраў, як шануюць памяць гэтае святыні манашкі нашага кляштара іжыхары полацкія, а таксама ўсяго вялікага ваяводства. У кафедральнай царкве полацкай сёння захоўваецца цудоўны залаты крыж з рознымі мошчамі».

8 ліпеня 1812 года ў Полацку спынялася на днёўку 1-я расейская армія, што адыходзіла з Дрысы на Віцебск. Услед за ёю ў горад уступілі войскі маршала Нэя. У свой час уніяцкія святары адмовіліся чытаць у храмах пасланне царскага Сінода, дзе Напалеона абвяшчалі папярэднікам Антыхрыста. Тым не менш, манахі-базыльяне палічылі за лепшае замураваць Крыж святой Еўфрасінніі ў сцяне Сафійскага сабора. Яны не памыліліся: сярод Нэевых жаўнераў знайшлося шмат аматараў

* УзяццеПолацка вялікім князем літоўскім Стэфанам Баторыем у 1579 годзе. Тагачасная гравюра.

* Взятие Полоцка великим князем литовским Стефаном Баторием в 1579 году. Гравюра того времени.

лёгкай здабычы. Рашуча спыніў рабункі толькі маршал Удзіно, чые войскі перайшлі Дзвіну і занялі Полацк 14 ліпеня.

У замураванай нішы сабора рэліквія знаходзілася да пачатку кастрычніка, калі французы былі выбітыя з горада.

Пасля аднаўлення праваслаўнага Спасаўскага сабора з'явіліся ўмовы для вяртання рэліквіі на месца, вызначанае ёй некалі самой полацкай князёўнай-ігуменняй. Былы ўніяцкі архіепіскап Васіль Лужынскі, які перайшоў у праваслаўе, зрабіў з Крыжам святой Еўфрасінні падарожжа ў Маскву і Пецярбург.

У старажытнай расейскай сталіцы Крыж змясцілі на адмысло-

вым «прекрасном налое» ва Успенскім саборы Крамля, які быў адчынены багамольцам з пяці гадзін раніцы да дзесяці вечара. «З дазволу мітрапаліта Філарэта, — успамінаў архіепіскап Васіль, — саборнае духавенства ўначы з асаблівай багавейлівасцю вазіла святыню па дамах вышэйшых чыноўнікаў, вяльможаў, князёў і графаў і багатых купцоў дзеля малебнаў з асвячэннем вады... Крыж гэты штораніцы мусіў аглядаць прысутны пры мне рэктар Полацкай семінарыі і пісьмова сведчыць мне аб ягонай непашкоджанасці». Трэба сказаць, што Маскву Васіль Лужынскі пакідаў, далікатна кажучы, не ў гуморы: усе сабраныя ва Успенскім саборы ахвяраванніў полацкага ўладыкі адабралі на карысць крамлёўскіх цэркваў.

* Вялікі князь літоўскі і кароль польскі Стэфан Баторы.

* Великий князь литовский и король польский Стефан Баторий.

У Санкт-Пецярбургу Крыж святой Еўфрасінні спачатку паклалі ў Сінадальнай царкве, а потым, паводле загаду Мікалая I, перанеслі ў Казанскі сабор. Імператар пажадаў асабіста агледзець полацкую рэліквію. Існавала рэальная небяспека, што святыня можа назаўсёды застацца ў Пецярбургу, але на цара і прыдворных, відаць, паўплываў старажытны заклён.

23 траўня (ст. стылю) 1841 года хросны ход урачыста перанёс рэліквію з Сафійскага сабора ў храм Спаса. Крыж паклалі ў келлі, дзе найпадобнейшая Еўфрасіння пражыла свае апошнія гады.

Увосень таго ж 1841 года сінадальнай друкарняй Пецярбургскай епархіі была выдадзеная кніжка «Исторические сведения о

жизни преподобной Евфросинии, княжны полоцкой с описанием и изображением креста, принесенного ею в дар полоцкой Спасской обители». Малюнак святыні зрабіў у часе знаходжання ў сталіцы архіепіскапа Лужынскага мастак Мянцоў, што, як паведамляюць дакументы, меў магчымасць працаваць толькі ўначы і надта спяшаўся. У выніку гэтая выява Крыжа атрымалася вельмі прыблізнаю і ў часе працы над яго ўзнаўленнем ніякім чынам не магла замяніць больш позніх фатаграфіі рэліквіі.

Як вынікае з пададзенага ў кнізе апісання Крыжа, на той момант ён знаходзіўся яшчэ ў даволі добрым стане. З эмаляў адсутнічала толькі выява Рыгора Багаслова, быў сцёрты абразок апостала Пятра і пашкоджаная выява Еўфрасінні Александрыйскай. У вопісу 1841 года нідзе не згадваюцца вядомае з пазнейшых дакументальных сведчанняў фарбаванае шкло, прыбіты цвікамі аметыст.

Дадамо, што ў адным з беларускіх летапісаў — «Хроніцы Быхаўца» — ёсць згадка пра дачку полацкага князя Васіля Параскеву, што была абвешчаная ў Рыме святою пад імем Праксэды. Гэтая князёўна пастрыглася ў манастыр Спаса над Палатой, дзе сем гадоў перапісвала кнігі. Потым яна прыехала ў Рым і жыла, аддана служачы Богу. Там памерла і была пахаваная, прычым у яе гонар пабудавалі бажніцу. Некаторыя аўтары лічаць гэтае летапіснае апавяданне каталіцкай рэдакцыяй жыццяпісу Еўфрасінні. Захаваліся звесткі пра крыж з надпісам, што ў ім ёсць частка святога дрэва, падараванага Праксэдзе рымскім папам Аляксандрам IV. Гэты крыж быў копіяй Крыжа Еўфрасінні. Цяпер ён знаходзіцца ў Яраслаўска-Растоўскім музеі-запаведніку.

Пра існаванне яшчэ адной малавядомай копіі рэліквіі можна даведацца з кнігі беларускага фалькларыста, этнографа і педагога Сяргея Сахарава, які даследаваў жыццё, звычаі і традыцыі беларусаў і праваслаўнага насельніцтва Латвіі. У кнізе «Православные церкви в Латгалии» (Рыга, 1939) ён згадвае, што ў Абрэнскай царкве «знаходзіцца копія каштоўнага Крыжа найпадобнейшай Еўфрасінні, князёўны Полацкай». (У жніўні 1944 года горад Абрэнэ быў перададзены ў склад Пскоўскай вобласці Расейскай Федэрацыі і атрымаў назву Пыталава.)

Экспедыцыя Вацлава Ластоўскага

Лёс Крыжа Еўфрасінні Полацкай у савецкі час варты асобнага нарыса, які будзе моцна нагадваць дэтэктыў.

У 1921 годзе Крыж сярод іншых царкоўных каштоўнасцяў рэквізавалі бальшавікі. Так з-пад апекі духавенства ён трапіў пад чорнае крыло ОГПУ, установы, што займалася ў краіне ўсім, у тым ліку і нацыянальнымі святынямі.

З канца дваццатых гадоў не забяспечаная дэмакратызацыяй грамадства палітыка адраджэння нацыянальнай культуры, вядомая пад назваю «беларусізацыя», пачала па камандзе з Масквы хутка згортвацца. Пасля публікацыі ў 1928 годзе пагромнага артыкула сакратара ЦККП(б) Беларусі Вільгельма Кнорына «Аб рашаючых «дробязях» у вялікім пытанні» распачынаецца падрыхтоўка да расправы з нацыянальнай інтэлігенцыяй. Наперадзе незлічоныя арышты, этапы, лагеры і расстрэлы...

У той трывожны час былы прэм'ер БНР* дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея Вацлаў Ластоўскі выязджае з адмысловаю экспедыцыяй у Полацк. Мэта — пошукі неацэннага твора Лазара Богшы.

Крыж Еўфрасінні «знайшоўся» ў мясцовым фінаддзеле і быў перавезены ў Менск**. Але надрэліквіяй ужо навісла пагроза. Наступ на беларускую культуру працягваўся. «Чыстка» ішла не толькі сярод людзей, але і паміж музейнымі экспанатамі. Грунтоўна ператрасалі фонды і найперш, вядома, у музеі, на чале якога стаяў такі нядобранадзейны чалавек, як Ластоўскі. Частку экспанатаў на загад пільных апекуноў нацыянальнае культуры вывозілі за межы Беларусі або проста знішчалі. Найбольш дарагія рэчы забіралі ў сталіцу сталінскае імперыі. Паводле звестак беларускага даследчыка з ЗША Вітаўта Тумаша, зроблены ў часе другой сусветнай вайны перагляд інвентарных кніг паказаў, што ў 20–30-х гадах з Беларускага дзяржаўнага музея ў Маскву вывезлі ўсе самыя каштоўныя абразы, увесь залаты і срэбны посуд, збор слуцкіх паясоў і народных строяў, калекцыю старажытных манет з беларускіх скарбаў, унікальныя архіўныя матэрыялы. Пад кіраўніцтвам ОГПУ ад-

* Беларуская Народная Рэспубліка, абвешчаная 25 сакавіка 1918 года.
** Так сталіца БССР афіцыйна называлася да 1939 г. уключна.

* Сілуэты старажытнага Полацка.

* Силуэты древнего Полоцка.

бываўся рабунак культурнае спадчыны народа з мэтаю разбурэння яго нацыянальнае свядомасці.

Гэтае злачынства напачатку праходзіла падвыглядам эвакуацыі каштоўнасцяў далей ад дзяржаўнае мяжы. Страх перад «інтэрвенцыяй міжнароднай буржуазіі» разам з іншымі, унутранымі і прычынамі нарадзіў ідэю перанесці сталіцу БССР у Магілёў. Горад рыхтаваўся да новай ролі. Ішло метадычнае знішчэнне храмаў, у адначас на новае месца пераводзіліся рэспубліканскія ўстановы, будаваўся Дом урада. У 1929 годзе ў Магілёў трапіў і Крыж Еўфрасінні Полацкай.

Апублікаваныя доктарам Тумашам у «Запісах Беларускага інстытута навукі й мастацтва» ў Нью-Ёрку дакументы дазваляюць прасачыць ход гэтых падзей.

21 лістапада супрацоўнік аддзела фельд'егерскай сувязі паўнамоцнага прадстаўніцтва ОГПУ па Беларускай вайсковай акрузе став. Лугаўцоў атрымаў ад начальства даверанасць «на право получения ценностей из Государственного Музея, для отправки таковых в гор. Могилев». Даверанасць падпісалі начальнік фельдаддзела А. Іваноў і інструктар А. Пішчык.

Тым самым днём датаваны і акт аб перадачы Крыжа Еўфрасінніў рукі Лугаўцова. У гэты час В. Ластоўскіў жо не працаваў дырэктарам, аднак нацыянальную рэліквію ён перадаваў «чэкісту» яшчэ за сваім подпісам, бо, відаць, быў за яе асабіста адказны. Зрэшты, дамо слова самому дакументу, захаваўшы яго арфаграфію і пунктуацыю.

АКТ

1929 г. 21-га лістапада складзены гэты акт аб перадачы Беларускім Дзяржаўным Музэям у Менску Беларускаму Музэю ў Магілеве крыжа Эфросініі Полацкай.

1) Футляр медны пасярэбраны, пазалочаны з пабітым шклом, у сярэдзіне крыжу футляр падобны.

б) на футляры ёсьць славянскія надпісы.

2) Крыж зроблены з дубовага* дрэва і абложаны золатам і славянскімі буквамі.

3) Пад верхняй папярэчкай крыжа не дастае 2-х кавалкаў золата і дрэва.

4) На верхняй папярэчцы крыж, якібыў вылажаны каменьнямі, каменьняў няма.

5) Унізе крыжа зроблена надстаўка.

6) На верхнім канцы крыжа ёсьць уноў-дароблена выабражэньне Багародзіцы (жоўтага мэталю).

7) Правае крыло верхняга боку крыжа заложана такой самай устаўкай новага мэталю.

8) З ліцавога боку крыж кругом абведзены шнурком на нітцы жэмчуга.

9) З ліцавога боку выламана тры эмалі прэабражэньня сьвятых.

10. 10-ць выабражэньняў сьвятых папсаваны.

11) У верхняй папярэчцы ў пазах 4-хкантовага крыжу 4 гнязды, у якіх няма каменьняў.

12) У ніжняй папярэчцы ў пазах 4-хкантовага крыжу 4 гнязды, у якіх няма каменьняў.

13) З ліцавога боку 8 гнёзд, запоўненых каменямі, з якіх 3 на дзержаньніавальнай формы, 2 сініхі 1 цёмна-чырвон.

* Насамрэч, як ужо згадвалася, — з кіпарысавага.

14) На правым баку ніжняй папярэчцы круглы амэціст прыбіты 2-мя цьвікамі і на левым баку ніжняй папярэчцы белы камень.

15) Паміж верхняй і ніжняй папярэчкай белы камень авальнай формы.

16) На верхняй папярэчцы 2 камені белага шкла.

17) На адвароце крыж гладкі пакрыты эмалью з выабражэньнем 3-хсьвятых папсаван. З трох гнёзд рэліквіі адно пустое.

18) З верхняга боку крыжа паложана рубчатая якоўка, у якой трымаецца жамчуг, часьці яе з правага боку пад палу круглым пазухам аблямана. (А пісаньне зроблена паводле акту, складзенаму у Полацку пры перадачы крыжа Ластоўскаму і акту прыёмачнаму складзенаму ў Менску.)

Далей падаецца апісаньне паводле акту камісіі з удзелам ювэліра-экспэрта:

1. На рукаятцы 1 ніжні блакітны авальны камень — ёсьць афарбаванае шкло.

2. Другі знізу на рукаятцы цёмна-чырвонага колеру, авальны камень — ёсьць гранат, каштоўнасьць якога прыблізна 3–5 рублёў.

3. Трэйці на рукаятцы авальны блакітны камень — ёсьць афарбаванае шкло.

II. На ніжняй папярэчцы злева авальны белы камень сэрдалікавага пераліву — ёсьць афарбаванае шкло; з правага боку гэтай папярэчцы гранёны круглы камень — ёсьць амэтыст, пастаўлены значна пазьней, каштоўнасьць яго каля 1-го рубля.

III. Паміж ніжняй і верхняй папярэчкай авальна-гладкі камень сэрдалікавага пераліву — ёсьць афарбаванае шкло.

IV. На верхняй папярэчцы 2 круглыя, плоскія, гладкія камяні лунна-га колёру — шкло.

Усяго на крыжу 8 каменьняў, з якіх 6 — шкло, 1 амэтыст і 1 гранат.

V. Шнурок жэмчугу, якім абведзены весь крыж, важыць 32 і 5 грама разам з ніткай. Жэмчуг увесь праўдзівы, рода дзкі *(? — У.А.)* перамяшаны з так званым яўрэйскім, прыблізная каштоўнасць іх усіх — каля 200 рубл.

(Далейшы тэкст акту дапісаны чарнілам, рукою Вацлава Ластоўскага):

Крыж гэты запісаны ў кнігу экспанатаў Беларускага Дзяржаўнага Музэю ў Менску пад № 7591.

Крыж здадзены, згодна распараджэньню Наркомасьветы, былым дырэктарам БДМ тав. Ластоўскім В.Ю., прадстаўніку Фэльдаддзела ПП ОГПУ по БВО тав. Лугаўцову, згодна даверанасьці

Фэльдаддзела ПП ад 21/XI.29 г. за № 68813 для дастаўкі ў Магілеўскі Дзяржаўны Музэй і перадачы яго асабіста дырэктару Музэю тав. Вінікаву У. Л.

Перадача адбылася ў прысутнасьці: дырэктара БДМ у Менску тав. М. І. Шапавалава, дырэктара БДМ у Магілеве тав. У. Л. Вінікава, нам. дыр. БДМ у Менску тав. А. В. Бурдзейкі.

Здаў В. Ластоўскі (подпіс).

Для перадачы дырэктару Магілеўскага Музэю т. Вінікаву прыняў Лугаўцоў (подпіс).

Прысутнічалі: М. Шапавалаў (подпіс).
В. Виников (подпіс).
А. Бурдзейка (подпіс).

(Далейшая дапіска зробленая 22 лістапада 1929 г. ужо ў Магілеве.)

Вызначаны ў гэтым акце крыж у стане згодна акту 1929 году, лістапада 22 дня а дзевятай гадзіне ў вечары на месцы атрымаў ад т. Лугаўцова, прыставіўшага гэты крыж па даручэньню БДМ у Магілеўскі Дзярж. Музэй.

Дырэктар Магілеўскага Дзярж. Музэю —
В. Виников (подпіс).
Крыж здаў Лугаўцоў (подпіс).
Прысутнічалі: Навуковы супрац. Магілеўскага Дзярж. Музэю
(подпіс нечытэльны)
(другі подпіс нечытэльны)
Круглая пячатка з надпісам у сярэдзіне:
Археографический Научный Музэй.
Надпіс навокала: Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

Дакументы сведчаць, што ў той самы дзень В. Ластоўскі здаў Лугаўцову за сваім подпісам і перапісанае ў 1582 годзе слуцкім князем Юрыем Алелькавічам Евангелле, якое паходзіла з бібліятэкі Свята-Траецкага манастыра ў Слуцку. Дзе гэтая ўнікальная кніга сёння — таксама загадка.

Але наша гаворка — пра таямніцу Крыжа Еўфрасінні.

Напрыканцы XIX стагоддзя сябра рады Полацкага царкоўнага брацтва святар М. Дуброўскі зрабіў вопіс рэліквіі, які цікава па-

раўнаць са звесткамі пададзенага вышэй акта. Паводле першага вопіса, з 20 эмалевых абразкоў на Крыжы няма аднаго, а пяць іншых — пашкоджаныя. У 1929 годзе тры выявы святых ужо выламаныя, а 13 — папсаваныя. З усіх каштоўных камянёў ацалелі два — аметыст і гранат. На месцы астатніх засталіся пустыя гнёзды або з'явіліся кавалачкі рознакаляровага шкла. На верхняй папярэчыне не хапала двух кавалкаў золата і дрэва. Як бачым, «ваяўнічыя атэісты», а дакладней — варвары-бязбожнікі, за лічаныя гады ўчынілі святыні шкоду шматкроць большую за ўсе страты папярэдніх сямі з паловаю стагоддзяў.

Хто выкраў святыню?

Па ўспамінах краязнаўцы і былога супрацоўніка Магілёўскага дзяржаўнага музея Ераніма Філіповіча, на новым месцы Крыж Еўфрасінні змясцілі ў музейную экспазіцыю, але шмат хто з наведнікаў, асабліва жанчыны, пачалі перад святыняю маліцца і адбіваць ёй паклоны. Напэўна, гэта таксама адыграла ролю ў перавозе Крыжа з музея ў будынак былога зямельнага банка, дзе ў 30-я гады мясціліся абкам і гаркам партыі. Будынак меў адмысловы пакой з масіўнымі кратамі на вокнах і браняванымі дзвярыма таўшчынёю 15 сантыметраў, за якімі былі яшчэ адны — кратаваныя. Менавіта ў гэтым пакоі-сейфе колішняга банка на пачатку вайны разам з іншымі найкаштоўнейшымі музейнымі экспанатамі захоўваўся Крыж Еўфрасінні Полацкай. Згодна з афіцыйнай версіяй, адтуль у 1941 годзе яго выкралі фашыстоўскія захопнікі.

Але ці так было ў сапраўднасці? Магілёў жа знаходзіўся за паўтысячы кіламетраў ад дзяржаўнае мяжы, і час дазваляў правесці эвакуацыю скарбаў. Гэта і нарадзіла чуткі, што рэліквія паехала ў гады ваеннага ліхалецця на ўсход. Такім размовам спрыяла і тое, што і афіцыйныя ўлады, і гэтак званыя кампетэнтныя органы чамусьці пазбягалі расследавання або праводзілі яго таемна, не паведамляючы вынікаў.

У 60-я гады Магілёўскі абласны музей звярнуўся з запытам на контрлёсу Крыжа ў Эрмітаж. Адтуль прыйшоў не падмацаваны ніякімі дакументамі адказ, што Крыж Еўфрасінні Полацкай трапіў у зборы мільянераў Морганаў і знаходзіцца ў Нью-Ёрку.

* Полацк пачатку XX стагоддзя.

* Полоцк начала XX века.

Праз нейкі час гэтая заблытаная гісторыя прыцягнула ўвагу вядомых вучоных, супрацоўнікаў Акадэміі навук Беларусі літаратуразнаўца Адама Мальдзіса і археолага Георгія Штыхава. Вынікам іхняе паездкі ў Магілёў стаўся зварот да вышэйшых рэспубліканскіх інстанцый, пасля чаго названых вучоных, а таксама дырэктара абласнога музея І. Скварцова і былога дырэктара І. Мігуліна выклікаў да сябе тагачасны намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі І. Клімаў, які ўзначальваў Рэспубліканскае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Як прыгадвае Скварцоў, размова адбывалася прыкладна ў такім тоне:

«Клімаў: Что вам нужно?

Скварцоў: Мне лично ничего не нужно. Пропали ценнейшие белорусские реликвии, но ими никто не интересуется.

Клімаў: Какие у вас есть документы?»

Дырэктар музея працягнуў чыноўніку адказ з Эрмітажа пра знаходжанне Крыжа ў калекцыі Морганаў. Прачытаўшы паперыну, Клімаў павярнуўся да І. Мігуліна, які ўзначальваў Магілёўскі музей напярэдадні вайны: «Ну, расскажи, старик...»

* Будынак былога Магілёўскага зямельнага банка, дзе знаходзіўся пакой-сейф, адкуль у ліпені 1941 года знік Крыж Еўфрасінні Полацкай.

* Здание бывшего Могилевского земельного банка, где находилась комната-сейф, откуда в июле 1941 года исчез Крест Евфросинии Полоцкой.

І той падзяліўся ўспамінамі, яку першыя дні вайны яго ўзялі ў апалчэнне, а 29 чэрвеня 1941 года ён з двума такімі самымі апалчэнцамі апынуўся каля горада Бялынічы, дзе яны рэквізавалі коней і вярнуліся ў Магілёў. Там ён прыйшоў у абласны ваенкамат і запатрабаваў транспарт для эвакуацыі свайго музея, але нічога не дасягнуў і заняўся эвакуацыяй жонкі і дзяцей. На станцыях з вагонаў нікога не выпускалі, і пра ўзяцце Магілёва немцамі Мігулін даведаўся толькі на пятнаццатыя суткі.

І. Клімаў паспачуваў, зазначыўшы, што і сам ведае, як цяжка было праводзіць эвакуацыю. Гутарка скончылася перадачаю яму копіі акта аб стратах абласнога музея ў выніку нямецкае акупацыі.

Пра гэта ў артыкуле «Таямніца крыжа» ў 1990 годзе распавёў на старонках газеты «Советская Белоруссия» супрацоўнік Магілёўскага абласнога аддзялення Беларускага фонда культуры В. Юшкевіч. Ён падае і вышэй названы акт, які з прычыны яго важнасці для пошукаў страчаных нацыянальных каштоўнасцяў падаем цалкам.

АКТ

22.XII.1944 года. гор. Могилев.

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе 3-х человек: директора музея тов. Мигулина Ивана Сергеевича, учителя Мог. педучилища тов. Авсеенкова Вячеслава Дмитриевича и инженера Мог. обл. к-ры промбанка тов. Кроера Сергея Митрофановича с участием эксперта-свидетеля художника г. Могилева тов. Пономарева Владимира Александровича составили настоящий акт об ущербе, причиненном немецко-фашистскими захватчиками и их сообщниками Могилевскому областному государственному историческому музею, находящемуся в г. Могилеве по ул. Ленинской.

Сожжено и разграблено немецкими оккупантами в 1941 году. Перечень отдельных видов разрушенного, уничтоженного, расхищенного и поврежденного имущества:

№№ пп	Виды имущества (по номенклатуре)	Един. изм.	Кол-во полностью разрушенного, уничтоженного, расхищенного	Стоимость причиненного ущерба (в руб.)
1.	Археологическая коллекция каменных орудий и предметов материальной культуры	Предм.	500	2.000.000
2.	Собрание белорусских рукописных и старопечатных книг и грамот	Экз.	175	3.000.000
3.	Нумизматическая коллекция	Монет	18000	1.500.000
4.	Коллекция холодного и огнестрельного оружия X–XIV вв. и др. доспехов и вооружения	Предм.	280	1.000.000
5.	Коллекция образцов художественной работы по дереву белорусских мастеров XVI–XVIII вв.	Предм.	120	3.000.000
6.	Коллекция художеств. фарфоровых изделий XVIII–XIX вв.	–	170	500.000

7.	Историческая библиотека	Томов	1200	500.000
8.	Ризы, оклады и др. церковная и бытовая утварь XIV–XVIII вв. Художеств. работы местных мастеров	Предм.	1900	10.000.000
9.	Коллекция икон письма XIII–XVIII вв. Работы белорусских мастеров	Экз.	150	5.000.000
10.	Крест Ефросиньи Полоцкой работы византийских мастеров	Шт.	1	6.000.000
11.	Золотой, серебряный ключ гор. Могилева ювелирной работы XVIII века	Шт.	1	1.000.000
12.	«Екатерина Святая» работы Боровиковского	Масло	1	5.000.000
13.	«Иосиф Обручник» работы его же	-”-	1	4.000.000
14.	«Мария» работы его же	-”-	1	2.000.000
15.	«Христос» работы его же	-”-	1	2.000.000
16.	«Портрет неизвестной дамы»	-”-	1	1.000.000
17.	Портрет Зубова работы Левицкого	-”-	1	2.000.000
18.	Этнографическая коллекция белорусской одежды XVII–XIX вв.			1.500.000

Всего по настоящему акту: 60.256.876

Паколькі спіс 1944 года быў няпоўны, разам з копіяй акта І. Клімаву ўручылі таксама запіску з пералікам іншых украдзеных з музеяў рэчаў, сярод якіх былі: срэбная булава караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы; дзве срэбныя пячаткі, атрыманыя Магілёвам разам з магдэбургскім правам; срэбная мітра магілёўскага праваслаўнага архіепіскапа Георгія Каніскага; вялікі кантовы срэбны спод з ціснёнымі выявамі сімвалічных сцэнаў, прысвечаных расейскаму цару Аляксею Міхайлавічу; вялікі срэбны кубак з партрэтам Пятра І; ужо згаданае раней слуцкае Евангелле 1582 года; колькі антычных залатых рэчаў (каралі, пярсцёнкі з каштоўнымі

камянямі) з раскопкаў Пампеі ды іншыя ўнікальныя каштоўнасці. У гады вайны з музея зніклі таксама славутыя магілёўскі брацкі абраз з надзвычай багатым акладам ібялыніцкі абраз Божай Маці. Пра гэтыя святыні ўжо не адно дзесяцігоддзе ходзяць упартыя чуткі, што яны закапаныя дзесьці ў Магілёве.

Пасля сустрэчы з І. Клімавым рэспубліканскія ўлады на ўсе запыты вучоных адказвалі маўчаннем. Лёс нацыянальных скарбаў іх не цікавіў. Тады дырэктар музея І. Скварцоў запісаўся на прыём да начальніка абласнога ўпраўлення КДБ тав. Дзямідава. Той выявіў зацікаўленасць і паабяцаў заняцца справаю пры ўмове, што атрымае каманду з абкама. Але хто і якую каманду даў Дзямідаву, засталося загадкаю, бо яго ў хуткім часе перавялі ў іншае месца.

Цяпер вернемся да падзей пачатку вайны. Усе, хто гаварыў з былым дырэктарам, персанальным пенсіянерам саюзнага значэння І. Мігуліным, звяртаюць увагу на блытаніну ў яго ных словах. Часам ён сцвярджае наогул малаверагодныя рэчы. Як мы ўжо ведаем, у першыя дні вайны Мігуліна ўзялі ў апалчэнне. Але ж ён быў інвалід — меў толькі адну руку, прычым левую.

Калі верыць аднаруканму апалчэнцу, у будынку абкама ў гады акупацыі стаяла вайсковая частка. Доўгі час на пакой-сейф за браніраванымі дзвярыма ніхто не звяртаў увагі, але аднаго разу цікаўны жаўнер знадворку дапяў па драбінах да закратаванага акна і ўбачыў, што за ім нешта блішчыць. Пасля гэтага немцы нібыта зрэзалі цяжкія дзверы аўтагенам, ашалелі ад ззяння золата, срэбра і каштоўных камянёў і вывезлі ўсё нема ведама куды. Такую гісторыю малюе Мігулін са словаў нейкіх магілёўцаў, што перажылі акупацыю.

Але ж сотні людзей могуць засведчыць, што старыя жалезныя дзверы (апрача таго, абсалютна цэлыя) у былым будынку зямельнага банка па вуліцы Міронава, 33 знялі толькі гадоў пяць-шэсць таму, а другія, кратаваныя, па-ранейшаму на месцы. Значыцца, версія закупантамі, узброенымі аўтагенам, здымаецца.

На нашую думку, бліжэйшымі да праўды выглядаюць паведамленні старых магілёўскіх жыхароў, што ў чэрвені 1941 года ў будынак банка зайшла група людзей у форме НКВД, якія адчынілі пакой-сейф ключом, склалі каштоўнасці ў падрыхтаваныя загадзя мяхі і ад'ехалі ў невядомым кірунку.

Калі ўсё здарылася менавіта так, тыя НКВДэшнікі былі б яўна

* Нашы суайчыннікі з ЗША (злева направа): Антон Шукялайць, Антон Адамовіч і Вітаўт Кіпель, якія ў розны час займаліся пошукамі Крыжа святой Еўфрасінні.

* Наши соотечественники из США (слева направо): Антон Шукелайть, Антон Адамович и Витовт Кипель, в разное время занимавшиеся поисками Креста святой Евфросинии.

задаволеныя, прачытаўшы ў 1981 годзе ў газеце «Голас Радзімы» (якая, заўважым, выдаецца для замежных беларусаў) навелу Г. Ланеўскага «Украдзены крыж». Дзеянне ў гэтым творы адбываецца ў чэрвені 41-га. Крыж, вядома, крадуць акупанты, прычым не з асабняка, у якім некалі мясціўся зямельны банк, а з музея, дзе рэліквіі, як сведчаць факты, ужо даўно не было.

Дваццаць пяць гадоў таму Адам Мальдзіс надрукаваў у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» артыкул «Сляды продкаў», выклаўшы там некаторыя з пададзеных раней звестак. Ішла гаворка і пра тое, што след рэліквіі можа знайсціся за акіянам. Пасля гэтага двое вядомых беларусаў-эмігрантаў Вітаўт Тумаш і Вітаўт Кіпель а дімя Беларускага інстытута навукі й мастацтва ў ЗША звярнуліся да супрацоўнікаў размешчаных у Нью-Ёрку Морганаўскіх установаў — бібліятэкі і калекцыі твораў мастацтва.

Спроба даведацца пра лёс Крыжа нешта новае не дала ніякіх

вынікаў. Паведамляючы пра гэта ў друку, доктар Тумаш вельмі слушна зазначыў: дапамагчы ў пошуку магло б абнародаванне назваў савецкіх устаноў і асобаў, на адказнасці якіх Крыж быў напярэдадні вайны. Канчаткова не абвяргаючы іверсію захопу рэліквіі немцамі, замежны навуковец лічыў, што ў тых умовах Крыж маглі лёгка прыбраць да рук «давераныя» асобы партыі і НКВД. У такім разе ён сапраўды паехаў з Магілёва не на захад, а на ўсход. Аднак жа і такі шлях не выключае магчымасці продажу нашай святыні на аўкцыёне (або таемна) за мяжу. Пагатоў, аўтар выдадзенай ў 1949 годзе ў Парыжы кнігі «Сьв. Еўфрасіня-Прадслава» Леў Гарошка пісаў: «Каля 1930 г. былі паявіліся весткі ў газэтах, што бальшавікі мелі яго (Крыж. — *У. А.*) прадаць у Швэцыю».

Магілёвец Е. Філіповіч прапанаваў А. Мальдзісу яшчэ адну нітачку пошукаў, пра якую вучоны расказаў у сваёй кнізе «Таямніцы старажытных сховішчаў»: «Настаяцель царквы ў імя Еўфрасінні ў Полацку Міхаіл Кузьменка называў прозвішча другога мільянера — Ракфелера. Нібыта ў архіве Ракфелера працаваў у 1962 годзе прафесар-гісторык з эмігрантаў Уладзімір Скаралеці, які і бачыў там Крыж».

За акіянам

А маль на два дзесяцігоддзі росшукі прыпыніліся. Іх працягнуў у 1990 годзе, апынуўшыся ў ЗША, вядомы беларускі журналіст Алесь Лукашук.

Варта зазначыць, што перад ад'ездам за акіян адзін дасведчаны ў такіх справах чалавек параіў яму ніякімі пошукамі не займацца, бо гэта можа кепска скончыцца. Тым не менш, Алесь выявіў зайздросную энергію.

Яму ўдалося пагутарыць з мастацкім экспертам Ракфелераўскага цэнтраў Нью-Ёрку Оліў Брагозі. Выслухаўшы апісанне нашай нацыянальнай рэліквіі, яна запэўніла, што падобнага крыжа ў мастацкай калекцыі Ракфелераў няма і ніколі не было.

З рэкамендацыі спадарыні Брагозі А. Лукашук звярнуўся ў прыватнае нью-ёркскае агенцтва, якое выдае сусветны каталог украдзеных твораў мастацтва. Аднак, як высветлілася, гэты каталог фіксуе толькі рэчы, што знаходзяцца ў вышуку пасля 1945 года, і

не ўлічвае твораў, якія зніклі ў гады Другой сусветнай вайны. Не абнадзеіла і тэлефонная размова з начальнікам агенцтва. Той сказаў, што, калі Крыж у Злучаных Штатах у прыватным зборы, знайсці яго практычна немагчыма. Такая інфармацыя можа выплысці на свет толькі выпадкова (напрыклад, пасля смерці калекцыянера будуць шукаць спадкаемцаў), дый гэта вельмі малаверагодна. Тое самае меркаванне выклаў А. Лукашуку і адзін з нашых суайчыннікаў-эмігрантаў, які шмат гадоў сочыць за каталогамі найбуйнейшых у свеце аўкцыёнаў па продажы мастацкіх твораў — «Сотбі» і «Крысці».

Наведаў беларускі журналіст і фундацыю Моргана. (Так называецца калекцыя, збіраць якую пачаў у другой палове XIX стагоддзя Перпонт Морган і якая цяпер з прычыны вялікае культурнае значнасці мае грамадскі статус.) Супрацоўнікі фундацыі і бібліятэкі Перпонта Моргана на ўсе роспыты ветліва адказвалі, што нічога не ведаюць і не могуць даць ніякай інфармацыі. Вядома, наіўна было б адразу бачыць у гэтым нейкую змову. Прыкладна такія адказы, пэўна ж, чуе большасць наведнікаў, што можна растлумачыць прафесійнай асцярожнасцю. Узгадайма, колькі сусветна вядомых твораў мастацтва было ўкрадзена за апошнія гады ў розных краінах.

Трапіўшы на экскурсію ў ФБР, Алесь Лукашук выкарыстаў і гэтую магчымасць. Супрацоўніца аддзела экспертызы ласкава згадзілася пашукаць якія-небудзь звесткі пра рэліквію ў электроннай памяці сваіх кампутараў. Адказ зноў быў несуцяшальны: тыя пра Крыж Еўфрасінні нічога не ведалі.

Загадка Крыжа не давала спакою і Адаму Мальдзісу. У часе ўрачыстасцяў, прысвечаных 500-годдзю ўсходнеславянскага першадрукара Францішка Скарыны, выпадак звёў беларускага вучонага з доктарам гістарычных навук супрацоўнікам Эрмітажа Барысам Сапуновым. Пасля літургіі ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры з размовы нечакана высветлілася, што пецярбургскі госць якраз і пісаў некалі адказу магілёўскі музей. Ён з гатоўнасцю пацвердзіў: Крыж Еўфрасіннізакуплены ў калекцыю Морганаў на аўкцыёне ў Заходняй Еўропе адразу па вайне...

А прача таго, А. Мальдзісу ўдалося даведацца, што пошукамі Крыжа ў 60-я гады займаўся супрацоўнік Эрмітажа Бебут Шаўкоўнікаў. Гэты, відаць, прадпрымальны чалавек прыватна ездзіў у ЗША, імкнуўся пранікнуць у зборы Морганаў, але выявіў праз-

мерны імпэті атрымаў ад нейкіх маладзёнаў атлетычнага выгляду ветлівую прапанову ўгамавацца. У адваротным выпадку яны не гарантавалі госцю з СССР вяртання дадому.

У 1966 годзе Шаўкоўнікаў апублікаваў артыкул пра Крыж Еўфрасінніў амерыканскім мастацкім часопісе «Journal of glass studies», аднак абзац са згадкаю пра тое, дзе знаходзіцца рэліквія цяпер, у рэдакцыі выкраслілі без згоды аўтара. На жаль, новая нітачка расследаванню нічога не дала, таму што Б. Шаўкоўнікаў ужо пакінуў гэты свет.

Праз колькі тыдняў пасля размовы ў Полацку А. Мальдзіс у складзе афіцыйнай беларускае дэлегацыі прыехаў у Нью-Ёрк на чарговую сесію ААН. Абавязак вучонага і грамадзяніна Беларусі, натуральна, прывёў яго ў фундацыю Моргана, дзе адбылася сустрэча з пані Яўгеніяй Зазоўскай, рускай з паходжання, якая займаецца ў бібліятэцы Перпонта Моргана славянскімі рукапісамі і рэдкімі выданнямі.

«На маё пытанне, ці можна набыць або паглядзець каталог музейных фондаў, доктар Зазоўская адказала, што пра яго існаванне ёй невядома. Што знаходзіцца ў сутарэннях будынка — а там асноўнае багацце — цалкам, бадай, невядома нікому», — пісаў А. Мальдзіс у сваім «Нью-ёркскім дзённіку» ў 1990 годзе.

Зазначым адну дзіўную супярэчнасць. У 1974 годзе доктар В. Тумаш паведамляў у «Запісах Беларускага інстытута навукі й мастацтва» аб сваёй спробе высветліць месца знаходжанне Крыжа «і па каталогу калекцыі, і беспасярэднімі роспытамі». Атрымліваецца, што гэты каталог быў, як кажуць, у наяўнасці. Доктару Зазоўскай пра ягонае існаванне ўжо невядома. Яшчэ адна таямніца?

Там сама, у Нью-Ёрку, А. Мальдзіс сустрэўся са спадаром Антонам Шукялайцем, які ў гады нямецкае акупацыі ўзначальваў Менскі гістарычна-мастацкі музей, што ў 1941-м не паспелі эвакуяваць. Ці не апынуўся Крыж, як ходзяць чуткі, у Аўстраліі? Ці не разабралі яго, каб паасобку прадаць золата, срэбра і каштоўныя камяні з эмалямі? У гаворках з Адамам Мальдзісам і, пазней, з аўтарам гэтае кнігі спадар Шукялайць выказаў меркаванне, што шэдэўр полацкага ювеліра Лазара Богшы, найверагодней, вывезлі ўсё ж на ўсход. Ён абвяргае іверсію пра разбор рэліквіі на часткі, із ім цяжка не пагадзіцца, бо кошт золата і камянёў на Крыжы параўнаўча невялікі.

Нью-ёркскія пошукі завяршыліся ў кастрычніку 1990 года

візітам у Морганаўскую фундацыю міністра замежных спраў БССР П. Краўчанкі, якога суправаджалі А. Мальдзіс і супрацоўнік беларускага прадстаўніцтва пры ААНУ. Шчасны. Дырэктару фундацыі быў перададзены афіцыйны зварот наконт Крыжа Еўфрасінні Полацкай. Міністр растлумачыў, што гаворка ідзе пра нацыянальную святыню. «Калі б яе ўдалося вярнуць на Радзіму, — сказаў пры гэтым П. Краўчанка, — няхай за выкуп, у аэрапорце рэліквію сустракалі б дзесяткі тысяч людзей».

Калі прыйдзе дзень такой сустрэчы і ці прыйдзе ён наогул? На запыт свайго тагачаснага кіраўніка Міністэрства замежных спраў Беларусі атрымала афіцыйны адказ, што ў самой фундацыі Моргана Крыжа няма. Але ж у сям'і Морганаў ёсць і прыватныя зборы, а за іх, як вынікае з прысланага дакумента, адміністрацыя фундацыі не адказвае...

Сляды вядуць у Расею

У расследаванні загадкавай гісторыі знікнення Крыжа Еўфрасіннінямала зрабіў у апошнія гады супрацоўнік упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Магілёўскай вобласці Сяргей Багдановіч. Яго пяру належаць некалькі грунтоўных публікацыяў у перыёдыцы, сярод якіх і артыкул пад красамоўнаю назвай «І ўсё ж след вядзе на ўсход», надрукаваны ў 1997 годзе ў двух нумарах газеты «Рэспубліка».

Напачатку С. Багдановіч аднаўляе храналогію звязаных з Магілёвам падзей першых дзён вайны. 30 чэрвеня Сталін патэлефанаваў тагачаснаму першаму сакратару ЦК Кампартыі Беларусі Панцеляймону Панамарэнку, што знаходзіўся ў Магілёве, і даў санкцыю на эвакуацыю насельніцтва і матэрыяльных скарбаў. 3 ліпеня радыё перадало загад крамлёўскага ўладара аб знішчэнні архіваў і каштоўнасцяў, якія не паспелі вывезці ў тыл. 8 ліпеня горад пакінулі работнікі ЦК, а 15–16-га немцы замкнулі акружэнне.

Прааналізаваўшы дакументы і ўспаміны відавочцаў, аўтар артыкула робіць выснову, што, нягледзячы на шэраг нявысветленых да канца акалічнасцяў, падазраваць былога дырэктара музея І. Мігуліна ў якіх-небудзь махінацыях падстаў няма.

Звяртаючыся да версіі аб дачыненні да знікнення рэліквіі суп-

рацоўнікаў НКВД, С. Багдановіч згадвае, што на пачатку ліпеня 1941 года ў Магілёў прыбыла з Масквы з нейкім «асобым даручэннем» група на чале з капітанам Віктарам Пудзіным. Зваблівa думаць, быццам яна якраз і мела заданне вывезці з пакоя-сейфа ў абкаме партыі каштоўнасці, якія лічыліся рэчамі антыкварнага фонду СССР. Аднак у такім разе гаворка ішла б пра асаблівы ўлік і кантроль і пра запіс у адмысловы рэестр створанага тады фонду пад назваю «Золата партыі». Інакш кажучы, Крыж і астатнія скарбы былі б, на думку Багдановіча, абавязкова выратаваныя. У выніку ён схіляецца да таго, што «асобым даручэннем» Пудзіна было ўсё-такі наладжванне на гэтым участку Заходняга фронта аператыўнай сувязі і разведвальнай работы. Праўда, у артыкуле канчаткова не выключаецца і сітуацыя, пры якой, суправаджаючы каштоўны груз у аўтакалоне і трапіўшы ў акружэнне, група Пудзіна магла схаваць рэліквіі недзе па дарозе ў Расею.

Дапусціўшы верагоднасць (хай сабе, на нашу думку, і вельмі нязначную) такога павароту справы, нельга не згадаць артыкула кандыдата геаграфічных навук А. Чарткова «Таямніцы глухога возера», змешчанага ў 1993 годзе ў газеце «Советская Белоруссия». У публікацыі ідзе гаворка пра зусім маленькую — дыяметрам блізу 30 метраў, але надзвычай глыбокую азярыну Акнішча, што хаваецца ў лясной глухамані на Краснапольшчыне. Аўтар артыкула мяркуе, што возера ўтварылася пасля падзення метэарыту. А прача навуковых дадзеных, на карысць гэтага сведчаць і тамтэйшыя паданні пра звязаныя з бяздонным лясным «вокам» нябесныя сілы.

Аднак да загадкавай гісторыі Акнішча мелі дачыненне і сілы зусім зямныя. Прыкладна ў тых мясцінах на пачатку апошняй вайны прарываліся з нямецкага акружэння часткі 13-й арміі. «Калі лінія фронту адсунулася на ўсход, — піша А. Чарткоў, — на возеры Акнішча, на паўночна-усходнім яго беразе, былі спіленыя дзве хваіны, што расліпобач. Па іх спускаліў возера нейкія буйныя рэчы. Гэта магла быць цяжкая зброя альбо іншыя рэчы, запакаваныя ў скрынкі...» Далей ставіцца слушнае пытанне: навошта ж так надзейна хаваць вайсковы рыштунак, тым больш, ужо ў глыбокім варожым тыле? У навакольных лясах і без таго было пакінута шмат зброі, тэхнікі і боепрыпасаў. З другога боку, каб армейская маёмасць не дасталася фашыстам, яе прасцей было б знішчыць ці сапсаваць. А.

Чарткоў лічыць больш праўдападобным іншы варыянт: «У возеры затопленыя рэчы, якія немагчыма было пакінуць ці знішчыць і рызыкоўна перавозіць далей на ўсход па занятай ворагам тэрыторыі. Гэта маглі быць каштоўнасці, эвакуяваныя з музеяў і сховішчаў Брэста, Беластока, Магілёва... А што, калі там захаваныя скарбы Магілёўскага браняванага пакоя, пошукі якіх дагэтуль безвыніковыя?.. Пасля разгрому гітлераўскай Нямеччыны шмат якія каштоўнасці вернутыя на Бацькаўшчыну. Але сярод іх не аказалася ніводнай рэчы з неацэнных скарбаў Магілёва, куды зусёй Беларусі звозіліся археалагічныя і культавыя рэліквіі народа».

Раскрыць таямніцы Акнішча зможа, безумоўна, толькі добра падрыхтаваная комплексная экспедыцыя.

Але вернемся да росшукаў, праведзеных С. Багдановічам. Значна верагоднейшаю яму здаецца версія, якая ўзнікла пасля атрымання ім надзвычай цікавага водгука на адну з уласных публікацыяў. 75-гадовы жыхар Магілёва Пётр Паддубскі непахісна ўпэўнены, што менавіта ён вывозіў на сваёй машыне музейныя каштоўнасці разам з Крыжам святой Еўфрасінні на ўсход.

Каліпрагрымелі першыя залпы вайны, выпускнік сельскагаспадарчага тэхнікума Паддубскі служыў у войску кіроўцам. У разгар баёў за Магілёў яго выклікалі да начальніка гарадскога гарнізо-

* Памятны крыж Тысячагоддзя Хрысціянства ў Беларусі, асвечаны ў 1988 годзе ў Мідлэндзе (Канада).

* Памятный крест Тысячелетия Христианства в Беларуси, освященный в 1988 году в Мидленде (Канада).

на І. Ваяводзіна, які загадаў забраць з абкама партыі важны груз. Раніцою 13 ліпеня Пётр пад'ехаў да патрэбнага будынку. Некалькі людзей у цывільным адзенні ўзяліся грузіць мяшкі і пакункі. Найдаражэйшыя рэчы запакоўвалі ў акутую жалезам скрынку. Паддубскі пачуў, як хтосьці з «грузчыкаў» усклікнуў: «Які крыж прыгожы!» Потым шасцёра супрацоўнікаў НКВД на чале з маёрам узялі машыну пад ахову і загадалі ехаць у бок банка, дзе загружаліся мяхамі з грашыма яшчэ два аўтамабілі.

надалей называць старажытнага полацкага майстра не Лазарам Богшам, а «майстрам Богшам, у хрышчэнні Лазарам».

На гэтым быў, па сутнасці, завершаны першы этап велізарнай працы.

Аднак надышоў час сустрэчы чытача з Майстрам, якому было наканавана пераствaрыць Крыж святой Еўфрасінніі праз гэта пакінуць сваё імя ў гісторыі Беларусі.

Спадкаемец Лазара Богшы

Ён з'явіўся на свету 1950-м у палескай вёсцы Вулька Драгічынскага раёна, што на Берасцейшчыне. Беларускі сялянскі род Кузьмічоў даваў не толькі земляробаў, але і знакамітых у наваколлі майстроў. У родных мясцінах Міколы некалі добра ведалі яго нага дзеда Нікіфара, найлепшага на дзесяткі вёрстаў каваля, які ўмеў і хвацка падкаваць каня, і вырабіць у сваёй кузні сапраўдныя дзівосы — кандэлябры, жалезныя кветкі, ліхтарні. Мікола лічыць, што ўспадчыў па генах ад дзеда шмат: працавітасць, жыццёвую філасофію, схільнасць да працы з металам... (Ліхтары, што вісяць у Брэсце над уваходам у Музей выратаваных каштоўнасцяў, выкаваныя Міколавымі рукамі.)

Мастацкія здольнасці мела і Міколава маці. У маладосці, калі шпалеры ў вёсках былі вялікай рэдкасцю, яна не мела адбою ад заказаў суседзяў, што прасілі аздобіць сцены ў хатах адмысловымі ўзорамі, якія вясковая мастачка наносіла на тынк з дапамогаю вынайдзеных ёй самою арыгінальных разетак-формаў з сырой бульбы.

У 60-я гады Міколавы бацькі, Пятро Нікіфаравіч і Ніна Трафімаўна, пераехалі «на цаліну», у Растоўскую вобласць, дзе жылі, між іншым, побач з шолахаўскай станіцай Вёшанскай. Бацька будучага мастака памёр зусім рана, ледзьве пераступіўшы сарака годдзе. Старэйшым у родзе мужчынам застаўся Мікола. Прыслухаўшыся да таго, што падказвала душа, ён перавёз сям'ю назад, на Бацькаўшчыну. Схільнасць да мастацтва ў хлопчыка выявілася рана, яшчэ ў малодшых класах, але магчымасць вучыцца доўгі час заставалася мараю. Дыплом аб заканчэнні Менскай мастацкай вучэльні імя Глебава па спецыяльнасці дэкаратыўна-ўжытковае ма-

стацтва Мікола Кузьміч атрымаў толькі ў 1982-м. (З выкладчыкаў ён з найбольшай удзячнасцю ўспамінае Міколу Хведаравіча Пракапенку.) Літаральна праз лічаныя гады яго імя ўжо набыло ў мастацкім свеце сталую вядомасць.

Пазначаныя бясспрэчным талентам і адметным светаўспрыманнем, багатыя асацыятыўным зместам і выкананыя ў арыгінальных формах і тэхнікахтворы Кузьміча пачалі рэгулярна выстаўляцца ў Беларусі і за яе межамі. Мастак працаваў з каштоўнымі металамі, з тытанам, бронзай, мельхіёрам, але яго любоўю была эмаль. Пазней, ужо ў часе працы над Крыжам, майстар скажа: «Метал — гэта якцудоўная, неверагодна прыгожая жанчына, якая можа адказаць узаемнасцю, але дасягнуць гэтага можна толькі коштам велізарных намаганняў... Так і з эмаллю. Гэтыя танюткія перагародкі, нагрэеш іх да 800 градусаў — а яны разлятаюцца ва ўсе бакі...»

Прызнаннем таленту і высокага майстэрства Міколы Кузьміча сталася экспанаванне яго твораў у Расеі, Польшчы, Францыі, Нямеччыне, Злучаных Штатах Амерыкі... Фотарэпрадукцыі яго эмаляў усё часцей з'яўляліся ў міжнародных мастацкіх каталогах і зборніках. Маскоўскім музей дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва набыў у сваю экспазіцыю створаную берасцейскім ювелірам серыю з шасці брошак.

М. Кузьміч удзельнічае ў многіх міжнародных сімпозіумах мастакоў-эмальераў. Найбольш плённай была паездка ў 1990 годзе ў

* Спадкаемец традыцыйЛазара Богшы Мікола Кузьміч (справа) і пісьменнік Уладзімір Арлоў у апошнія дні працы майстра над вобразам Жыватворнага Крыжа.

* Наследник традиций Лазаря Богши Микола Кузьмич (справа) и писатель Владимир Орлов в последние дни работы мастера над образом Животворного Креста.

Гішпанію, дзе ягоныя працы атрымалі высокую ацэнку калегаў і былі адзначаныя спецыяльным дыпломам. Яму, адзінаму з Саюза мастакоў Беларусі, прыйшло запрашэнне на III сусветны з'езд эмальераў.

Значны і, як паказалі падзеі, лёсавызначальны ўплыў на светапогляд мастака мела яго глыбокае захапленне гісторыяй Беларусіі, асабліва, мінулым Полацкай зямлі, якая была калыскаю нашай дзяржаўнасціі нацыянальнай культуры і дала Бацькаўшчыне цэлае сузор'е імёнаў сусветнае значнасці, дзе зоркаю першай велічыні заззяла святая Еўфрасіння. Менавіта ўвага да мінуўшчыны як падмурка сучаснага бытнавання народа і яго культуры прывяла Кузьміча да ўнікальнага праекта стварэння цыклу эмалевых партрэтаў выдатных дзеячаў беларускай гісторыі. Першым з іх стала выкананая на медзі выява вялікага князя Усяслава Чарадзея, іканаграфічнай асновою якой паслужыла адна з мініяцюраў Радзівілаўскага летапісу. Мастака не мог не натхняць і вобраз Чарадзеевай унучкі Прадславы-Еўфрасінні. М. Кузьміча вабілі эпоха асветніцы і, вядома, творчасць яго сераднявечнага калегі ювеліра Богшы.

У той час берасцейскім майстар яшчэ не ведаў, што яму будзе дадзена вялікае шчасце аднавіць сакрэты старажытных эмальераў і прадоўжыць іх традыцыю. Але тое, што прапанову ўзнавіць вобраз нашай нацыянальнай рэліквіі, створанай у 1161 годзе, атрымаў якраз Мікола Кузьмі ч, не выглядае выпадковым. Тут згадваецца выслоўе філосафа пра выпадковасць як скрыжаванні некалькіх заканамернасцяў.

Аднак да таго моманту, калі доктар гістарычных навук Таццяна Макарава напіша на сваёй кнізе «Перегородчатые эмали древней Руси»: «Мікалаю Пятровічу Кузьмічу, эмальеру і спадкаемцу Лазара Богшы», заставалася яшчэ некалькі гадоў пакутліва цяжкай працы.

У Сургуце думаюць пра Беларусь

На прэс-канферэнцыі, скліканай з нагоды заканчэння працы над вобразам Крыжа, аўтар гэтай кнігі запытаўся ў нашага сібірскага суайчынніка Анатоля Сілівончыка, што змусіла яго на некалькі гадоў зрабіць клопат пра нацыянальную святыню беларусаў адной з найважнейшых спраў свайго неспакойнага і пераменлівага жыцця прадпрымальніка. У адказ з вуснаў гэтага неардынарнага, шчодра

надзеленага ад прыроды чалавека прагучала амаль фантастычная — асабліва для людзей далёкіх ад веры — гісторыя.

Анатоль узгадаў, як вяртаўся да сябе ў Сургут пасля наведвання Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, дзе ён быў удастоены гонару прыкласціся да мошчаў святой палачанкі і падняцца ў яе келлю. Тады, у самалёце, яму была праява: вачам раптам адкрыўся блакітны, размаляваны дзівоснымі старажытнымі фрэскамі царкоўны купал, адрэстаўраваны фрагмент якога паломнікбачыў у полацкім Спасаўскім храме.

«Я, чалавек, які ў прынцыпе верыў толькі ў сябе ды ў свае здольнасці і ўдачу, — успамінае Сілівончык, — адчуў, што сапраўды існуе нейкая іншая, магутная і ўладарная сіла, якая цягне мяне з Сібіры ў Беларусь, змушае думаць і пра лёс Крыжа Еўфрасінні, і пра нас, раскіданых па ўсім свеце беларусаў... А днаго разу на прысвечаным адраджэнню Крыжа паседжанні я папытаў у прысутных ды і ў самога сябе, чаму цяжар адказнасці за гэтую працу — і фінансаванне, і куратарскія абавязкі — бярэ на сябе чалавек, што жыве далёка ад Беларусі. Міграпаліт адказаў мне безроздуму: «Богу лепей відаць». Ігэты аргументуладыкі аказаўся надзвычай пераканаўчым...»

Спачатку жыццёвы шлях Анатоля Сілівончыка складваўся досыць тыпова.

Ён нарадзіўся ў вёсцы Гамза, што ў цяперашнім Светлагорскім раёне, дзе і сёння жыве ягоная маці, сціплая вясковая працаўніца пенсіянерка Настасся Несцераўна, якой яшчэ вельмі цяжка даць ейныя 75 гадоў. Яе бацька быў лесніком і знакамітым у сваіх мясцінах пчаляром, які трымаў у лесе 50 пчаліных «ставоў» і пастаўляў воск на царкоўныя свечкі. Анатоль успамінае, што дзеда не кусалі пчолы і што той за ўсё жыццё не прадаў ніводнага кілаграма мёду — увесь раздаваў вяскоўцам, асабліва шчодра надзяляючы хлапчукоў.

Дабрыню, шчодрасць і гаспадарлівасць разам з абвостраным пачуццём справядлівасці Сілівончыкі лічаць сваімі генетычна закладзенымі фамільнымі рысамі. Да іх варта, пэўна, дадаць і жыццёвую вытрываласць: апавядаючы пра сына, Настасся Несцераўна зазвычай згадвае, як у маленстве ён, адбываючы пакаранне, цэлую гадзіну без слёз і скаргаў выстаяў на каленях на грэчцы.

Бацька, Павел Паўлавіч, працаваў шафёрам. Відаць, гэта і паўплывала на цвёрды намер хлопца з гомельскага Палесся пасту-

паць у Бабруйскіаўтатранспартны тэхнікум. Атрымаўшы дыплом аб яго заканчэнні, пайшоў у войска.

А вось пасля армейскай службы Анатоль, можна сказаць, кінуў выклік лёсу і падаўся ў Сібір.

Цюмень, Табольск, Сургут..

Цяжкі хлеб шафёра на нафтапромыслах. (З тых часоў захаваўся ў Анатоля і ўлюбёны дэвіз: «Ім чацца хутчэй за ўсіх, але пры гэтым нікому не замінаць ехаць у тым самым кірунку» і звычка заўсёды, задарма і на любыя адлегласці падвозіць на машыне спадарожнікаў.)

Доўгія месяцы жыцця сярод хантаў і мансі — сапраўдных дзяцей прыроды, у якіх, як сцвярджае Анатоль, ён шмат чаму навучыўся і якім цяпер імкнецца аддзячыць: то падорыць паўтары тоны бісеру для народных промыслаў, то прышле перад святам некалькі тонаў шакаладавых цукерак...

А яшчэ былі мары пра сваю ўласную справу, якія непазбежна разбіваліся аб тагачасную рэальнасць.

У Сургуце ён з'явіўся ў жніўні 1978 года, маючы, як прызнаецца, напалеонаўскія планы і пяць рублёў у кішэні.

З самых першых дзён узяўся сваімі рукамі будаваць дом. Той па-беларуску грунтоўны дом з печчу, дзе маці, калі гасцявала ў сына, пякла духмяны вясковы хлеб, стаіць у Сургуце і сёння. Печ таксама змураваў сам Анатоль.

З таго часу з Сургутам звязаныя ўжо дваццаць гадоў жыцця. Рашучы паварот у ім адбыўся ў 1985, калі Анатоль кінуў круціць абаранку і заняўся бізнесам.

На абранай дарозе прадпрымальны беларус, у якім быццам быс фа-кусаваліся працавітасць, кемлівасць, мэтанакіраванасць і здаровыя амбіцыі ўсяго роду Сілівончыкаў, зведаў і шчасце ўзлётаў і горкія расчараванні. Можна не сумнявацца, што сюжэтаў і калізій тут хапіла б на цэлую кнігу, якая калі-небудзь, магчыма, будзе напісана. Мы ж абмяжуемся тым, што паведамім чытачу неабходны мінімум інфармацыі. Сёння А. Сілівончык з'яўляецца генеральным дырэктарам закрытага акцыянернага таварыства «Сібдорсервіс» і вучыцца ў Акадэміі народнай гаспадаркі пры ўрадзе Расейскай Федэрацыі. Калі знаходзіцца вольны час, прысвячае яго паляванню і рыбалцы, а найперш — працы на ўласнай фермерскай гаспадарцы, якая займае 130 гектараў і здзіўляе гасцей сваімі ўраджаямі. У Сібіры падрастаюць двое ягоных сыноў —

названы па дзеду Павелі старэйшы Генадзь, якому бацька даў імя свайго ранапамерлага брата.

Да таго, што нам ужо вядома пра дзейнасць Анатоля Сілівончыка — мецэната варта дадаць яшчэ колькі істотных штрыхоў. 100 мільёнаў расейскіх рублёў у 1996 годзе ён перавёў дзіцячаму дому ў Сургуце. Выдатны падарунак атрымала і родная вёска Гамза. Для яе (наколькі нам вядома, гэта пакуль што адзіны ў Беларусі выпадак) зямляк з Сібіры набыў аўтобус, які чатыры дні на тыдзень, працуючы па графіку, возіць вяскоўцаў у Парычы, Светлагорск і Бабруйск і кругласутачна дзейнічае як «хуткая дапамога», дастаўляючы хворых у больніцу. А прача таго па святах прыватны аўтобус адвозіць вернікаў у храм.

Значныя сродкі былі ўкладзеныя нашым суайчыннікам у зняты рэжысёрам Віктарам Шавялевічам паводле сцэнарыя Сяргея Тарасава кінафільм «Пастка для зубра», у цэнтры якога — асоба выдатнага дзеяча айчыннай гісторыі, уладара Вялікага княства Літоўскага Вітаўта. А пошнім па часе фільмам Шавялевіча сталася дакументальная стужка, якая апавядае пра адраджэнне Крыжа святой Еўфрасінні. Фундаваў фільм, гэтаксама як і кнігу пра нашу нацыянальную рэліквію, Анатоль Сілівончык.

Дзякуючы земляку з Сургута, убачыла свет адна з новых кніг беларускага паэта з Санкт-Пецярбурга Анатоля Кірвеля. Сілівончык стаў фундатарам мемарыяльнай дошкі ў гонар супрацоўнікаў Інстытута беларускай культуры (Інбелкульту), які паслужыў правобразам Беларускай акадэміі навук.

А. Сілівончык удзельнічаў у фінансаванні Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету.

Прыехаўшы ў ліпені 1997 года на Другі з'езд, Анатоль разам са старшынёй ЗБС «Бацькаўшчына» Ганнай Сурмач наведаў у Брэсце майстэрню Міколы Кузьміча, якому заставаліся ўжо лічаныя дні да завяршэння пяцігадовай працы над Крыжам.

Тады ж пачала набываць канкрэтныя абрысы прапанова аб заснаванні Міжнароднага дабрачыннага фонду Жыватворнага Крыжа святой Еўфрасінні. Аўтарамі ідэі былі сібірскі прадпрымальнік і яго калега і сябар, старшыня праўлення сумеснага прадпрыемства «Міжнародны цэнтр прадпрымальнікаў беларускай дыяспары» Барыс Стук. (Цікава, што Анатоль і Барыс нарадзіліся ў адзін дзень

* Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр сёння.

* Полоцкий Спасо-Евфросиниевский монастырь сегодня.

— 4 траўня 1957 года, што, напэўна, дабратворна ўплывае на іхсупольную дзейнасць.)

Сілівончык прызнае, што на самым пачатку ягоны ўдзел у аднаўленні вобраза Крыжа Еўфрасіннімеў папулісцкае адценне. Але хутка клопаты пра святыню перараслі ў глыбокае адчуванне сваёй далучанасці да вялікага патрыятычнага чыну, прычым гэтае пачуццё зрабілася агульным для ўсёй сям'і. Прадпрымальнік сцвярджае, што ягоная дапамога ва ўзнаўленні рэліквіі, яго імкненне арганізаваць справу так, каб фінансавы стан фірмы не ўплываў на працу над Крыжам, атрымлівалі зваротную сувязь. Крыж таксама дапамагаў — прыносіў маральнае задавальненне, падказваў выйсце ў складаных сітуацыях на працы і дарыў зусім іншую атмасферу дома, нараджаў новыя ідэі і праекты. Адным з іх стаўся намер збудаваць у Сургуцкім раёне першую ў Сібіры царкву ў гонар святой Еўфрасінні Полацкай.

Доказы Георгія Штыхава

Ідэя адраджэння Крыжа полацкай асветніцы выклікала новы ўсплёск цікавасці да асобы Еўфрасінні і гісторыі стварэння яе рэліквіі з боку літаратараў, мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў. У навуковай сферы найбольш зроблена было тут доктарам гістарычных навук, загадчыкам аддзела археалогіі і гісторыі Полацкай зямлі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Георгіем Штыхавым. Ён у дакладніў шэраг спрэчных пазіцый і зрабіў свае высновы здабыткам чытачоў у публікацыях, сярод якіх вылучаецца змешчаны ў часопісе «Полацак» (ён па-беларуску выходзіць у амерыканскім горадзе Кліўлендзе) артыкул «З гісторыі вывучэння крыжа прэпадобнай Еўфрасіньні».

Раней нашу нацыянальную святыню звычайна адносілі да гэтак званых напрастольных крыжоў. Такой думкі, упрыватнасці, трымаўся імаскоўскі гісторык Л. Аляксееў. Аднак нам ужо вядома, што на навуковай канферэнцыі з нагоды 830-х угодкаў стварэння Крыжа святой Еўфрасінні (найперш дзякуючы даследаванням Васіля Пуцко) была зробленая высновa аб тым, што полацкая рэліквія з'яўляецца крыжам узвіжальным, іншымі словамі, звязаным са святам Узвіжання. Аб гэтым, дарэчы, у сваёй доктарскай дысертацыі яшчэ на пачатку 80-х гадоў пісаў і сам Г. Штыхаў. Цяпер ён падкрэслівае, што, з улікам аналогіяў, меркаванне В. Пуцко трэба лічыць канчаткова даказаным. А рашэнне Еўфрасінні падараваць Спасаўскай царкве менавіта ўзвіжальны крыж, мае, на думку беларускага гісторыка, сваё тлумачэнне.

Рэч у тым, што пасля прыняцця хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях сярод князёў пашырыўся звычай цалаваць крыжа для пацверджання ўзятых на сябе абавязкаў. Калі ў час паўстання 1068 года ў Кіеве гараджане вызвалілі полацкага князя Усяслава Чарадзея з вязніцы і абвясцілі яго вялікім князем кіеўскім, сучаснікі палічылі гэтую падзею сімвалічнай, бо адбылася яна ў дзень Узвіжання Крыжа Гасподняга. І ў Кіеве, і ў Полацку добра памяталі, як улетку 1067 года, пасля крывавай бітвы на Нямізе, калі Усяславу Брачыславічу ўдалося адстаяць межы сваёй дзяржавы, кіеўскі князь Ізяслаў запрасіў полацкага валадара на перамовы пад Воршу і падступна захапіў яго з сынамі ў палон, парушыўшы дадзенае крыжовае цалаванне.

Летапісец занатаваў, што, седзячы ў кіеўскай земляной турме,

Усяслаў, уздыхнуўшы, прамовіў: «О крыж святы! Так я верыў табе, ты і пазбаў мяне ад гэтай ямы». У адказ Бог і паказаў сілу крыжа.

У сувязі з лёсам полацкага князя летапіс кажа аб тым, што крыж дапамагае князям у бітвах, ратуе ад бяды тых, хто звяртаецца да яго са шчыраю верай. Нават сам д'ябал не баіцца нічога, апрача крыжа. (У Радзівілаўскім летапісу ёсць мініяцюра, на якой Усяслаў Чарадзей паказаны на кіеўскім пасадзе, дзе князь, на думку старажытнага аўтара, апынуўся якраз у выніку перамогі крыжа над д'яблам.) Ведаючы пра супадзенне выхаду полацкага князя на волю з хрысціянскім святам, Усяслава ва ўнучка Еўфрасіння, як перакананы Георгі Штыхаў, і прысвяціла гэтай незвычайнай падзеі ўзвіжальны крыж.

* Захавальніцы манастырскіх традыцый.

* Хранительницы монастырских традиций.

Згодна з царкоўнымі гісторыкамі, у IV стагоддзі візантыйскі імператар Канстанцін перадвырашальнай бітваю ўбачыў на небе крыж, які абяцаў яму перамогу. Імператар сапраўды адолеў ворагаў, глыбока паверыўшы ў цудатворную сілу святыні, а яго маці, царыца Алена, адшукала ў Палестыне, на Галгофе, крыж, на якім сустрэў смерць Збавіцель роду чалавечага.

Царква святкуе Узвіжанне вельмі ўрачыста. Напярэдадні ўпрыгожаны кветкамі крыж выносяць і ўскладаюць на сярэдзіне храма. Цырымонія адбываецца пад гучанне званоў і спевы. Потым крыж на ўсе чатыры бакі паказваюць вернікам. Папулярнасць свята Узвіжання ў старажытным Полацку пацвярджае зробленая там у 1967 годзе Г. Штыхавым унікальная археалагічная знаходка — каменны абразок з выяваю святых Канстанціна і Алены, што трымаюць перад сабою вялікі крыж.

У згаданым вышэй артыкуле Георгі Штыхаў аргументавана абвяргае і пазіцыю маскоўскай даследчыцы Таццяны Макаравай, якая ў сваёй кнізе «Перегородчатые эмали древней Руси» выказала думку, што Богша быў не полацкім, а кіеўскім майстрам. Беларускі вучоны перакананы, што Богша мог стварыць крыж толькі ў Полацку, бо абавязаны быў працаваць паднаглядам і апекаю самой заказчыцы — Еўфрасінні.

Вельмі важкім сведчаннем на карысць гэтага ёсць знойдзеныя ў 1962 годзе археолагамі на полацкім Верхнім замку рэшткі майстэрні ювеліра-залатара другой паловы XII—пачатку XIII стагоддзя, часу, які часткова супадае з жыццём знакамітай полацкай ігуменні. Пры раскопках былі выяўленыя кавалкі залатой фольгі і фрагмент старажытнай перагародкавай эмалі памерам 0,8 на 0,8 сантыметры з мініяцюрнымі выявамі крыжыкаў. Знойдзеная эмаль мела тры яркія колеры: сіні, чырвоны і белы, якія побач з зялёным (у меншай колькасці) з'яўляюцца асноўнымі і на Крыжы святой Еўфрасінні. Гэтая акалічнасць таксама пацвярджае версію, паводле якой у 1962 годзе была раскапаная майстэрня некаго-небудзь, а самога Богшы.

Разглядаючы дэкор святыні, Штыхаў заўважае, што значнае месца ў ім належыць разеткам у форме кветкі з васьмю пялёсткамі. Гэткі матыў салярнай арнаментыкі, як сведчаць археалагічныя знаходкі (асабліва каменныя формы для адліўкі жаночых аздобаў) быў распаўсюджаны ў старажытным Полацку. Варта згадаць і тое, што яшчэ ў 1977 годзе спецыялісту галіне гісторыі дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва В. Васіленка прыйшоў да высновы, што Крыж найпадобнейшай Еўфрасінні «адрозніваецца ад кіеўскіх эмаляў, прадстаўляючы полацкую эмальерную школу».

Яшчэ адзін аргумент — тое, што выконваць свае заказы полацкая асветніца, як мы ведаем на прыкладзе будаўніцтва дойлідам Іаанам храма Спаса, даручала мясцовым талентам.

Трэба дадаць, што — гэта ўжо адзначалася раней у раздзеле «Помнік беларускага пісьменства» — надпіс на Крыжы адлюстроўваў некаторыя рысы жывой гаворкі Полацкай зямлі.

«З усяго вышэйсказанага, — падсумоўвае Г. Штыхаў, — вынікае, што Лазар Богша з'яўляецца полацкім майстрам-залатаром і эмальерам вельмі высокага ўзроўню, і месцам яго сталага жыхарства быў Полацк».

Шляхам спроб і памылак

Сказаць, што перад Міколам Кузьмічом стаяла архіскладаная задача,— значыцца, не сказаць амаль нічога. Дастаткова нагадаць, што сакрэт тэхналогіі перагародкавай эмалі быў страчаны на ўсходнеславянскіх землях яшчэ ў эпоху геніяльнага полацкага ювеліра Богшы, восем стагоддзяў таму.

Але, першчым мастак наблізіўся да свайго галоўнага адкрыцця, першчым на доўгія месяцы, як некалі сераднявечныя алхімікі, зачыніўся ад свету ў чатырох сценах сваёй майстэрніі перайшоў да працы з матэрыялам, было яшчэ паўтара года папярэдніх пошукаў, мноства кансультацый з дактарамі гістарычных навук Т. Макаравай і Л. Аляксеевым і іхменскімі калегамі.

Выступаючы ў ліпені 1994 года на паседжанні створанай пры ЗБС «Бацькаўшчына» навукова-грамадскай рады са справаздачай пра першы этап працы, майстар быў не надта шматслоўны: «Скрупулёзна вывучаліся помнікі дэкаратыўнага мастацтва са збораў Збройнай палаты, у прыватнасці разанскія бармы XII стагоддзя. У Санкт-Пецярбургу, у Музеі гістарычных каштоўнасцяў, пазнаёміўся са шклянымі негатывамі здымкаў Крыжа, зробленымі ў 1896 годзе фатографам Чысцяковым. З іх аддрукаваныя першыя ідэнтычныя фота рэліквіі. Таццянай Іванаўнай Макаравай было адмыслова падрыхтаванае поўнае апісанне Крыжа, што дало наймагутнейшы імпульс у аднаўленні ягонае іканаграфіі. Леанід Васільевіч Аляксееў узнавіў творчае аблічча майстра Богшы і яго эпохі, што дазволіла пераадолець велізарную часавую дыстанцыю, так бы мовіць, падсвядомасцю адчуць подыхстаражытнага ювелірнага горна, спазнаць неўміручую прыгажосць старажытнай эмалі, усвядоміць велізарнае майстэрства і ўпакораную цярплівасць, з якімі стваралі тагачасныя ювеліры... Вывучаны манаграфічныя даследаванні, прысвечаныя візантыйскім, старажытнарускім і грузінскім (VII–XIII стст.) эмалям. Адбылося знаёмства запісаннем метадаў і прыёмаў рэстаўрацыі кароны венгерскіх каралёў (XII ст.)...»

Страчаныя альбо пашкоджаныя эмалевыя выявы з Крыжа святой Еўфрасінні ўзнаўляліся паводле класічных узораў візантыйскага і старажытнага усходнеславянскага мастацтва ў строгай адпаведнасці з канонамі. Гэтаксама карпатліва ішла рэканструкцыя калары-

* Яны абралі шлях служэння Госпаду.

* Они избрали путь служения Господу.

стычнай гамы старажытных абразкоў. Дзеля дасягнення максімальнай дакладнасці выкарыстоўваўся метад фатаграфічнага аналізу. Іначай кажучы, былі зробленыя сотні шматкратных фотапавелічэнняў усіх паверхняў Крыжа, дэталяў фігур святых, арнаментаў і надпісаў.

Дапамога доктара гістарычных навук Т. Макаравай была на гэтым этапе проста неацэнная. Павялічаныя фатаграфіі віселі над яе сталом. «Кожная маленькая пластачка, — успамінае Таццяна Іванаўна, — была намаляваная і расфарбаваная; да яе былі падабраныя аналогіі, бо захавалася болей за трыста старажытнарускіх рэчаў з перагародкавай эмаллю, якія я малявала ў розных музеях былога Саюза».

Абмяркоўваліся літаральна ўсе дэталі: які гіматый* будзе ў Хрыста, як павінна выглядаць рука святога з багаславеннем?.. Удакладняліся нюансы. Напрыклад, тое, што ў старажытных усходнеславянскіх

* Г і м а т ы й — верхняе адзенне ў выглядзе плашча.

эмалях мастакі не паказвалі на тварах румянаў і паўценяў, альбо што кожная лакальная колераваяпляма мела сваю перагародку.

Толькі тады майстар зрабіў у колеры рабочыя малюнкі-рэканструкцыі, якія былі ўхваленыя спецыялістамі і пасля памяншэння да памераў рэальнага Крыжа далі магчымасць распачаць непасрэдную працу.

Рызыкуючы стаміць чытача тэхналагічнымі тонкасцямі, усё ж паспрабуем хаця б схематычна паказаць велізарную складанасць праблемаў, што паўсталі ў гэты момант перад беларускім майстрам.

З трактатам ягонага калегі з XII стагоддзя, прасвітэра Тэафіла, мы ўжо знаёміліся, калі ішла гаворка пра вяршыні мастацтва старажытныхювеліраў. Дзеля аднаўлення страчанай тэхнікі перагародкавай эмалі трэба было ўлічыць і ўсе дадзеныя пра сённяшнюю вытворчасць эмаляў, якія вельмі розняцца і складам і характарам падрыхтоўкі асновы. Адрозненні ў складзе эмалевай масы вызначаюцца прафесійнымі здольнасцямі майстра і мастацкай традыцыяй той ці іншай школы эмальераў. Усе рэцэпты эмаляў, пры іхбясконцым мноcтве, з'яўляюцца, між тым, варыянтамі алавяна-каліевага шкла. Шкляная маса раздрабняецца ў адмысловых ступках на парашок, які і служыць эмальеру сыравінай.

У вырабе перагародкавай эмалі ў часы Богшы на ўсходнеславянскіх землях выкарыстоўваліся як гэтак званыя глухія, так і прасветленыя (апалавыя) сплавы. Адзенне на выявах рабілася з эмаляў першага кшталту, а твары, рукі і іншыя дэталі — з апалавых.

Старажытныя ювеліры працавалі з золатам 70–80-й пробы. Пасля адпаведных маніпуляцыяў з матрыцай, на якой штампаваўся асноўны абрыс малюнка, выява пераносілася на тонкую залатую пластку. На ёй асцярожна праціскалася паглыбленне, у выніку чаго прызначаны для запаўнення эмаллю малюнак апынаўся як быццам у латачку глыбінёю 1–1,5 міліметра. Далей майстар нарыхтоўваў найтанчэйшыя (на дзесятыя і сотыя долі міліметра) залатыя палоскі і з дапамогаю пінцэта і клею выкладаў перагародкі, якія ствараліву-земкі* пад эмаль.

У адрозненне адзаходнееўрапейскіх, нашы сераднявечныя майстры карысталіся толькі чыстымі тонамі. Ювелір мусіў для кожна-

* В у з е м к а — беларускі адпаведнік расейскага слова « ячейка» .

га колеру стварыць асобную, цалкам іваляваную вуземку з залатых перагародак. Калі мастак паказваў чалавечы твар, то, напрыклад, рабілася маленькая вуземка для вока, а ў сярэдзіне ў яе — яшчэ меншая для зрэнкі. Прытым сам твар могмець у дыяметры ўсяго тры міліметры.

Наклеіўшы дэталі малюнка, майстар насыпаў у вуземкі прывар і ставіў залатую пластку на жарніцу, каб прылітаваць перагародкі. Калі залатая аснова была гатовая, кожная вуземка запаўнялася эмалевым парашком пэўнага колеру. Пасля плаўлення эмалевай масы паверхня пласткі шліфавалася датуль, пакуль залатая асноведзь, эмаль і перагародкі не ператвараліся ў суцэльную гладкую паверхню. І ўсё гэта паўтаралася мноства разоў.

Сучаснаму спадкаемцу старажытных ювеліраў даводзілася працаваць літаральна наўслеп, навобмацак, шляхам сотняў спроб і памылак, спадзеючыся не толькі на набытыя веды, але і на інтуіцыю, на Божую дапамогу.

Аднаўляючы надпіс на Крыжы, Мікола Кузьміч вырабіў больш за 300 чаканаў. Кожны — асобная літара. Кожны рабіўся падмікраскопам. Здавалася, што істотная частка працы засталася ззаду. Але пасля кансультацыяў са спецыялістамі высветлілася, што ў XII стагоддзі Богша не мог карыстацца такой тэхналогіяй, бо яе проста не існавала. Зноў трэба было пачынаць спачатку.

Аднак самае адказнае — 20 мініяцюрных эмалевых «партрэтаў» — яшчэ чакала наперадзе.

Кузьмін авалодаў тэхнікай «малявання» танюткімі перагародкамі, але тут узнікла новая цяжкасць: як прылітаваць іх да залатой асновы? Мастак ведаў, што, калі ў XIV стагоддзі расейскія майстры спрабавалі аднавіць тэхніку перагародкавай эмалі пры двары мітрапаліта Алексія, якраз згаданая аперацыя — злучэнне перагародак з латуню — паўстала неадольнаю перашкодай.

Над гэтаю таямніцай найбольш пакутаваў і Мікола. «Бывала, усё нібыта зробіш, як трэба, паставіш загатоўку ў муфельную печ, а перагародкі ўзялі і «паплылі» — малюнак збіўся, работа ідзе ў брак».

Колькі разоў усё адпраўляліў пераплаўку, колькі разоў агортвала роспач, — ведае толькі сам Мікола ды яшчэ ягоны вучань Віталь Якавук, які няраз у хвіліны паняверкі і расчаравання не мог стрымаць слёз.

Мастак сцвярджае, што былі выпадкі, калі знайсці выйсце дапамагалі шчырыя малітвы, пасля чаго, уначы, ён прачынаўся ад голаса, які падказваў элементарнае рашэнне, што ляжала, здавалася, навідавоку, але бясконцае мноства разоў выслізвала з рук. Майстар упэўнены, што менавіта голас з неба навёў яго ў адзін з самых складаных перыядаў пошукаў на думку запаволіць рэакцыю эмалі адмысловай прысыпкай. Для лёсу адноўленага Крыжа гэтае адкрыццё было ледзьве не вырашальным.

Кожную пластку з эмалевымі мініяцюрамі перараблялі некалькі разоў. Найцяжэйшым псіхалагічным эпізодам усёй працы Кузьмічлічыць той выпадак, калі ён з вучнямі мусіў сарваць здраўлянай асновы ўвесь верхні бок Крыжа, бо зразумеў, што ідзе аблудным шляхам. «Каб пакінулі, — атрымалася б усяго тандэтная копія, бо перагародкі ў нас выходзілі тоўстыя — 0,16 міліметра, а трэба было 0,04. У такім малюнку не было трапёткасці, вытанчанасці, у ім застываў след не рукі, а інструмента».

Пераадолець сумневы, выбрацца з тупіка мастаку і яго вучням дапамагала ўвага мітрапаліта Філарэта, падтрымка сяброў і блізкіх. Два першыя гады працу фінансаваў Анатоль Сілівончык. З мэтаю прыцягнення да праекту дзяржаўных сродкаў Згуртаванне беларусаў свету вяло перамовы з Міністэрствам культуры і Камітэтам па справах рэлігій. Аднак тыя гады ў найноўшай гісторыі Беларусі былі пераломныя. Мянялася вярхоўная ўлада, мяняліся міністры і прэм'ер-міністры. І кожны раз у радавыя кабінеты трэба было абыходзіць зноў... Сітуацыя няпэўнасці нарэшце змянілася, калі частку выдаткаў узяла на сябе Цар-

* Вечна юны храм Спаса.

* Вечно юный храм Спаса.

ква. Пасля звароту ўладыкі Філарэта да прэзідэнта дзяржава выдзеліла майстру патрэбную колькасць золата.

Някідкім, але надзвычай адчувальным быў удзел прадстаўнікоў Камітэта дзяржбяспекі, якія выконвалі так званую аператыўную і ахоўную функцыі. «Усе пяць гадоў, — кажа Мікола Кузьміч, — у маёй майстэрні сядзеў ахоўнік — бярог мяне і рэліквію. Сяргей Якімук, супрацоўнік Камітэта, без перабольшання быў маім ценем. Баюся, без гэтай арганізацыі я нічога б не зрабіў».

На ўзнаўленне Крыжа сапраўды патрабаваліся вялікія матэрыяльныя каштоўнасці: золата, срэбра, некалькі сотняў рачных перлін, каштоўныя камяні...

А пярэджваючы падзеі, заўважым, што некалькі тыдняў перад завяршэннем працы ў майстэрні неадлучна дзяжурылі супрацоўнікі дзяржбяспекі, узброеныя аўтаматамі. На пытанне аўтара кнігі, ціне былі такія захады празмернымі, С. Якімук адказаў, што, згодна з неафіцыйнымі дадзенымі, напады на майстэрню сапраўды планаваліся. Прычым не выключана, што злачынцаў цікавілі не золата і жомчуг, а — сам Крыж, чыё паўторнае выкраданне мало б стацца ўжо не крымінальнай акцыяй, а набыць палітычны характар.

4 красавіка 1996 года ў Брэсце адбылося выязное паседжанне навукова-кансультацыйнай групы па адраджэнні Крыжа. Падрахоўваючы абмеркаванне, што праходзіла ў майстэрні М. Кузьміча, доктар гістарычных навук Леанід Аляксееў, не хаваючы хвалявання, казаў: «Аднаўленне Полацкага крыжа — з'ява бяспрыкладная. Бо гэта — старажытная візантыйская тэхніка, абсалютна страчаная ва ўсім свеце. І вось сёння тут, у Беларусі, гэтая тэхніка адноўленая! У нас нарадзіўся новы Лазар Богша!»

Мікола Кузьміч перакананы, што цяпер шмат што зрабіў бы крыху іначай і, вядома, бліжэй да дасканаласці. Калі Крыж ужо быў амаль гатовы, мастак прапанаваў мітрапаліту Філарэту паўтарыць тыя пласткі, якія лічыў не зусім удалымі. Аднак уладыка даў мудрую параду пакінуць рэліквію без мастацкага «рэдагавання», каб захаваць для гісторыі не толькі вынік, але і рэчыўнае ўвасабленне самога працэсу адраджэння святыні.

Паломніцтва ў Святую Зямлю

Мікола Кузьміч прызнаецца, што ніколі не быў атэістам, але яго сапраўднае вяртанне да веры адбылося ў часе ўзнаўлення Крыжа найпадобнейшай Еўфрасінні. Мастак упэўнены, што, нават калі б яму былі забяспечаныя найлепшыя ўмовы, ён не здолеў бы зрабіць гэтую працу без духоўнай згоды ў душы. Чым далей майстар судакранаўся з Крыжам, тым глыбей адчуваў непарыўную сувязь стану душы з тым, наколькі паспяхова ідуць пошукі, наколькі бліжэй ён робіцца да свайго адкрыцця. «Шукаць у сабе гэтую духоўную згоду,— кажа Мікола,— магчыма толькі праз малітву, праз рэлігію».

Ён часта ўзгадвае глыбокае духоўнае ўзрушэнне, перажытае ў той момант, калі прыклаўся да прывезенай уладыкам Філарэтам часцінкі Святога жыватворнага дрэва ад Крыжа Гасподняга.

У адным са сваіх інтэрв'ю Кузьміч успамінаў першую паездку да мітрапаліта. Імёны святых мастак тады зазубрываў, як школьнік, аднак, прыехаўшы, усё пераблытаў. «Але ж вывучаць трэба было не толькі імёны, а кожную драбніцу ў іхнім адзенні, бо ўсё мае свой сэнс. Нават у адценнях колеру. Жомчуг, напрыклад, сімвалізуе чысціню і беззаганнасць, рубін — колер жыцця і крыві Гасподняй, сапфір — колер яснага неба... Да працы над Крыжам я нават як след Бібліі не чытаў, гартаў толькі. А дзеля таго, каб яно адкрылася, Святое Пісьмо трэба чытаць з жаданнем, вераю... За гэтыя пяць гадоў я ўсвядоміў галоўнае: жыццё хуткаплыннае і трэба спяшацца рабіць дабро».

Людзі, якія добра ведаюць Міколу, могуць засведчыць: гады, прысвечаныя адраджэнню нацыянальнай святыні, сапраўды сталіся для берасцейскага майстра часам уласнага духоўнага адраджэння.

Надзвычай важную ролю ў гэтым ўзыходжанні адыграў удзел мастака ў летку 1994 года ў паломніцтве прадстаўнікоў Беларускай праваслаўнай царквы ў Ерусалім.

Паломнікі на чале з мітрапалітам Менскім і Слуцкім Філарэтам везлі з сабою ўжо выраблену аснову будучай святыні. Дрэва на яе было, дзякуючы ўладыку, ўзятае ў тым самым гаі, дзе некалі рос кіпарыс, што пайшоў на Крыж, на якім сустрэўся са смерцю Сын Божы.

Крыж-аснова ляжаў на Труне Гасподняй. Разам з Крыжам пада-

рожнікі з Беларусі наведалі месца апошняга зямнога прыстанку святой Еўфрасінні ў Феадосіевым манастыры. Па вяртанні ўладыка Філарэт казаў у інтэрв'ю, што «размова аб тым, ці зможа стаць новая мастацкая сакральная каштоўнасць беларускай святыняй — беспрадметная. Гэта ўжо святыня... Адчуваецца багаславенне Ерусаліма, якое мы ўзялі ў ерусалімскага патрыярха Дыядора II, у Труны Гасподняй».

Мікола Кузьміч называе паломніцтва ў Святую Зямлю адной з найгалоўнейшых падзеяў свайго жыцця. «Ерусалім — гэта велічны помнік Богу... — успамінае пра свае ўражанні і пачуцці мастак. — Мяне ўразіла літаральна ўсё: ад візантыйскіх мазаік да цудоўнай разьбы па камені, мармуры і граніце, ад шэдэўраў архітэктуры да горных манастыроў. Мы прайшлі па шляху Еўфрасінні Полацкай, затрымаліся каля месца, дзе яна была пахаваная; там манахі далі кожнаму з нас па крыжыку з мошчамі Феадосія Вялікага. Мы слухалі, як натхнёна ўладыка вёў набажэнства. Мы прайшлі шляхам Хрыста, наведалі ў Ерусаліме ўсе месцы, звязаныя з Сынам Божым. А на гары Спакусы я ледзьве не памёр... Напэўна, ад нясцерпнае спякоты атрымаў сонечны ўдар. Дзве гадзіны ляжаў на старажытнай паліраванай пліце. Святыя айцы сказалі: гэта рукі'ябла... Але багаславенне ерусалімскага патрыярха Дыядора дапамагло, і потым я заўсёды адчуваў ягоную духоўную сілу. Якраз па багаславенне, па Божую дапамогу мы і ехалі да Труны Гасподняй...

Наперадзе тады былі яшчэ тры гады працы.

У лета 1997-е

Улетку 1997 года пакутлівая і шчаслівая праца над узнаўленнем нацыянальнай святыні наблізілася да завяршэння.

Чытач, які добра знаёмы з апісаннем рэліквіі XII стагоддзя, павінен ведаць таксама мастацкія і тэхнічныя характарыстыкі адроджанага Крыжа.

Залатыя пласткі з перагародкавымі эмалямі сучасны майстар выканаў з металу 986-й пробы і прымацаваў да кіпарысавай асновы цвікамі з золата. На пластках, апрача эмалевых «партрэтаў», былі падрыхтаваныя месцы дзеля закладання хрысціянскіх рэліквіяў, якія

* На ўрачыстасці, прысвечаныя вяртанню вобраза Крыжа Еўфрасінні ў Полацк, прыехаў прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Лінг.

* На празднества, посвященные возвращению образа Креста Евфросинии в Полоцк, приехал премьер-министр Республики Беларусь Сергей Линг.

знаходзіліся ў старажытным Крыжы і якія, дзякуючы намаганням Царквы, пашчасціла атрымаць іў наш час.

Пакінутыя ў верхнім і ніжнім перакрыжаваннях каўчэгі для «Крыві Хрыстовай» і «Дрэва Жыватворнага» былі дэкараваныя ажурнымі крыжыкамі. Яшчэ тры каўчэгі такой самай формы для мошчаў святых Стэфана, Панцялеймана і крыві святога Дзімітрыя меліся пад іх выявамі на адваротнай паверхні святыні.

Крыж быў аблямаваны акоўкаю паджом чуг. А гулам спатрэбілася каля пяцісот перлін дыяметрам 4–5 міліметраў. А коўка збіралася з сегментаў. Па яе баках мясцілася пакладзеная ў філігранныя кружкі зернь. Жом чуг знаходзіўся на залатой нітцы дыяметрам 0,3 міліметра.

Верхнібок Крыжа аздаблялі каштоўныя камяні, апрацаваныя

кабашонам* каштоўныя камяні: горны крышталь (чатыры камяні), гранат-альмандын** і два сапфіры.

Латачкі пад выявы святых і арнаменты былі ціснёнымі з наступным прачаканьваннем і дасягалі глыбіні два міліметры. Перагародкі рабіліся з ліставога металу і мацаваліся прыліткай. Палітру эмалевых колераў майстар вытрымаў у дакладнай адпаведнасці з аналагамі эпохі Еўфрасінні.

Бакавы надпіс з імем майстра выкананы на срэбры 982-й пробы з таўшчынёю металу 0,2–0,3 міліметры. У тых месцах, дзе Крыж-арыгінал быў пашкоджаны, Мікола Кузьмічэ зрабіў рэканструкцыю паводле перагародкавых эмаляў часоў ювеліра Богшы. Браліся пад увагу творы жывапісу і дробнай пластыкі з каменю, якія мог бачыць сераднявечны полацкі майстар, іфрэскавыя размалёўкі Спасаўскага храма, якія цяпер аднаўляюцца рэстаўратарамі на чале з Уладзімірам Ракіцкім.

Напрыканцы ліпеня ў берасцейскім Свята-Сімяонаўскім кафедральным саборы з удзелам міграпаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі Філарэта адбыўся абрад закладання ў адноўлены Крыж хрысціянскіх рэліквіяў. 24 жніўня 1997 года ў тым самым храме прайшла ўрачыстая цырымонія перадачы адроджанай святыні Беларускай праваслаўнай царкве. На наступны дзень атрымалі магчымасць пакланіцца Крыжу прыхаджане кафедральнага Свята-Духаўскага сабора ў сталіцы нашай дзяржавы.

24 верасня праходзіла выніковая нарада непасрэдных удзельнікаў працы па аднаўленні вобраза Крыжа, дзе міграпаліт Філарэт урачыста абвясціў аб тым, што неверагодна складаная справа адраджэння нацыянальнай святыні агульнымі і саборнымі намаганнямі Царквы, грамадскасці і дзяржавы паспяхова завершаная. Уладыка нагадаў прысутным, што перад імі не проста выдатны твор мастацтва, але, найперш, неацэнная сакральная каштоўнасць, якую неабходна вярнуць на яе спрадвечнае законнае месца — у полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.

Дактары гістарычных навук Леанід Аляксееў і Георгі Штыхаў не шкадавалі ўзнёслых слоў, справядліва назваўшы працу берасцейскага майстра навуковым і творчым подзвігам, вартым та-

---

* Кабашон — форма лінзы альбо паўсферы, якую надаюць каштоўным камяням у выніку шліфавання.

** Гранат-альмандын — камень насычанага чырвонага колеру з фіялетавым адценнем.

го, каб застацца ў памяці наступных пакаленняў. Іхкалега Таццяна Макарава параўнала значнасць узнаўлення вобраза Крыжа святой Еўфрасінні для духоўнага адраджэння Беларусі з тым, якую ролю адыгрывае для Расеі адбудова знішчанага бальшавікамі маскоўскага храма Хрыста Збавіцеля.

Вынікам шырокага абмену думкамі стаўся наступны дакумент.

КАМЮНІКЕ

паседжання навуковай рады, скліканай у сувязі з заканчэннем працы над узнаўленнем вобраза Крыжа найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай

24 верасня 1997 года ў будынку Беларускай экзархіі адбылося пашыранае паседжанне навуковай рады, скліканай у сувязі з завяршэннем працы па стварэнні вобраза Крыжа найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай. У паседжанні ўзялі ўдзел прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы, Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», Беларускай дзяржавы, навуковай і творчай грамадскасці.

Сябры навуковай рады адмыслова адзначылі, што да задумы ўзнаўлення Полацкай святыні прычынілася ўсведамленне ўсеагульнага духоўнага і маральнага заняпаду і грамадзянскай раз'яднанасці нашага грамадства. Бо святыні пакідаюць нас, калі мы робімся нявартымі іх, і вяртаюцца да людзей, душы якіх імкнуцца да ачышчэння ў пакаянні.

Удзельнікі паседжання з глыбокай сардэчнай радасцю адзначылі, што надзвычай складаная ў навуковым, тэхнічным і чалавечым плане справа ўзнаўлення вобраза старажытнага полацкага Крыжа паспяхова завершана.

Прайшло роўна пяць гадоў аддзён святкавання 1000-годдзя Полацкай епархіі, калі нарадзілася задума адраджэння Крыжа, якая атрымала сваё развіццё на Першым сходзе беларусаў блізкага замежжа.

Неўзабаве, атрымаўшы багаславенне ад святыняў Града Ерусаліма, пачалася надзвычай цяжкая праца стварэння Крыжа пры духоўным кармленні і апекаванні Маці Царквы.

Аддаючы падзяку Усемагутнаму Богу, сёння сябры навуковай рады сведчаць, што першапачатковая задума цалкам выкананая, бо Крыж ускладаецца на месца, вызначанае найпадобнейшай Еўфрасінняю ў 1161 годзе.

Удзельнікі паседжання выказваюць шчырае спадзяванне, што ў Спаса-Еўфрасіннеўскім полацкім манастыры, які ёсць духоўны агмень Белай Русі, як іў часы яго найпадобнейшай заснавальніцы, будзе ўзносіцца несупынная малітва аб адзінстве сыноў і дачок Бацькаўшчыны нашай, у роднай зямліі ў рассеяннісутных.

Паседжанне завяршылася прэс-канферэнцыяй, дзе мітрапаліт Філарэт і іншыя сябры рады зноў падкрэслілі, што створаны Міколам Кузьмічом Крыж — не копія, не рэканструкцыя, не муляж, а новая сакральная каштоўнасць, святыня, якая ёсць масток паміж мінулым і сучаснасцю і абавязвае ўсіх нас задумацца пра драматычны шлях нашай краіны і яе гістарычную перспектыву. Было выказанае меркаванне, што, калісёння Крыж і здаецца камусьці «несапраўдным», праз два-тры пакаленні ён ужо зможа без агаворак успрымацца як святыня-арыгінал.

Разам з тым дырэктар Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францішка Скарыны Адам Мальдзіс засяродзіў увагу на тым, што адраджэнне Крыжа ніякім чынам не пазбаўляе актуальнасці праблему далейшых пошукаў і вяртання законнаму гаспадару — беларускаму народу — святыні XII стагоддзя. Пагатоў, ёсць дастаткова важкія доказы таго, што аўтэнтычная полацкая рэліквія знаходзіцца ў музейных сховішчах Расеі.

Як паказалі выступы на прэс-канферэнцыі, існуе і думка, што, паколькі старажытны Крыж святой Еўфрасіннізняважаны і абрабаваны, у выпадку вяртання яго можна разглядаць адно як музейную каштоўнасць. Падобныя разважанні былі ўспрынятыя сябрамі навукова-грамадскай рады як вельмі спрэчныя, бо Крыж XII стагоддзя захоўвае сваю святасць ужо дзякуючы таму, што памятае рукі і малітвы самой полацкай ігуменні, пад кіраўніцтвам і багаславеннем якой ён ствараўся.

Павіншаваўшы мастака з яго творчай перамогай, якой наканавана застацца ў гісторыі, журналісты цікавіліся яго нымі далейшымі планамі. Спадкаемец Богшы, узнагароджаны за адраджэнне Крыжа царкоўным ордэнам роўнаапостальнага вялікага князя Уладзіміра, паведаміў, што наперадзе — праца над стаўратэкай (футаралам) для Крыжа і стварэнне для Царквы абкладу напрастольнага Евангелля, якое будзе своеасаблівым помнікам усім старажытным беларускім Евангеллям, адсу-

часніка Еўфрасінні — Полацкага да славутага Лаўрышаўскага, што захоўваецца ў Бібліятэцы імя Чартарыйскіх у Кракаве.

На пытанне, як ён будзе пачувацца, калі знойдзецца старажытны Крыж, майстар адказаў, што ўзрадуецца з гэтай прычыны болей за каго-небудзь іншага. Як кожны беларус — бо народу будзе вернутая ягоная святыня. І як прафесіянал — бо атрымае магчымасць параўнаць плён сваёй працы з творам геніяльнага папярэдніка. Але мастак лічыць, што «за восем стагоддзяў, прамінулых пакуль Крыж не знік у 1941 годзе з Магілёва, яго няраз рабавалі і аднаўлялі, да яго прыкладалі руку і добрыя і злыя людзі, таму ён істотна змяніў сваё першаснае аблічча. Што з ім сталася за апошнюю палову стагоддзя, і наогул невядома. Іначай кажучы, уявіць новы Крыж з дапамогаю архіваў, успамінаў і г. д. было прасцей, чым зніклы».

Узгадаўшы, што Крыж святой Еўфрасінні валодаў ачышчальнай і гаючаю сілай, хтосьці з журналістаў запытаўся ў М. Кузьміча, ці можна чакаць такіх дзівосаў ад ягонага твору. «Я веру ў гэта, — адказаў мастак. — Па-першае, усе сакральныя атрыбуты ў ім тыя ж, што і ў яго папярэдніка. Кіпарысавае дрэва не толькі прывезенае з Ерусаліма, але і асвечанае на Труне Гасподняй. У Крыжы знаходзяцца ікроплі Ісусавай крыві, і часцінка жыватворнага Крыжа Гасподняга, і часцінкі мошчаў святых Стэфана ды Панцялеймана, і кроў святога Дзімітрыя. Новы Крыж таксама асвечаны паводле ўсіх царкоўных канонаў». А па-другое, працягваў майстар, усё ідзе ад веры. Невыпадкова ж некаторыя абразы называюць «намоленымі». Гэта значыць, што многія гады тысячы людзей прыносілі гэтым абразам сваю веру і самыя запаветныя надзеі. А таму адной ічы такі абраз пачынае вяртаць сканцэнтраваную ў ім энергію, ацаляючы хворых, наталяючы духоўную смагу. Тое самае павінна адбыцца і з адроджанай святыняй. «Так, мой крыжяшчэ «маладзенькі». Але ўсё ў яго будзе. Прынамсі, першы ўнёсак у ягоную гаючую сутнасць ўжо зрабіў, уклаўшы ў яго ісвае рукі, і сілу, і душу, і веру».

Да слоў мастака варта дадаць, што ўжо былі выпадкі, каліна Крыж, як сцвярджае уладыка Філарэт, сыходзіла ім і лажаль Гасподняя. Напрыклад, падчас цырымоніі перадачы святыні ва ўлонне Царквы ўсіх прысутных у храме як быццам працінала токам, і гэта доўжылася два дні. Цудадзейную моц Крыжа выяўляў і тады, калі, як ужо згадвалася, у часе працы майстар раптам перажываў моманты дзівоснага прасвятлення, адкрываючы яшчэ аднутаямніцу старажытнага мастацтва.

Вяртанне ў Полацк

Урачыстае вяртанне святыні на радзіму найпадобнейшай Еўфрасінні, у сталіцу нашай першае дзяржавы, прымеркавалі да вялікага хрысціянскага свята Узвіжання Крыжа Гасподняга, што праваслаўныя адзначаюць 27 верасня паводле новага стылю.

Напярэдадні было надрукаванае прысвечанае гэтай падзеі слова мітрапаліта Філарэта, эпіграфам да якога служылі словы святога апостала Паўла з Першага паслання да Карынфянаў: «Бо слова пра крыж для пагібельных — юродства ёсць, а нам, ратаваным, — сіла Божая».

Уладыка вёў гаворку аб тым, якую значнасць надае Царква крыжу, прыводзячы пры гэтым выказванне аднаго з яе айцоў Іаана Залатаслова: «Крыж — спадзяванне хрысціянаў. Крыж — падмурак Царквы. Крыж — бяспека Сусвету. Крыж — перамога над д'яблам». Але цягам трохстагоддзяў пасля ўкрыжавання і ўзнясення Хрыста вернікі дакладна не ведалі, дзе знаходзіцца гэтая святыня. Можна было адно меркаваць, што тры крыжы — Ісусаў і двух пакараных разам з ім разбойнікаў, закапаныя паблізу месца іхняе смерці. Каб зняважыць ісцерціз людской памяці мясціны, звязаныя з зямным жыццём і сконам Збавіцеля, на Галгофе быў зроблены насып, дзе збудавалі храм у гонар Венеры.

Крыж праляжаў у зямлі да часоў імператара Канстанціна Вялікага, які кіраваў з 306 да 337 года і ўвайшоў у гісторыю як першы рымскі валадар, што спыніў пераслед прыхільнікаў новае веры і стаўся першым хрысціянскім манархам.

На вайне з адным з зацятых ворагаў хрысціянства Канстанціну быў знак: на небе з'явіўся велізарны зіхоткі крыж з надпісам «Гэтым перамагай!» У сне імператара наведаў сам Госпад, які загадаў змясціць крыж на сцягах, зброі, шаломах і тарчах воінаў, абяцаючы за гэта перамогу над любымі ворагамі.

Тады Канстанцін і вырашыў адшукаць святыню — Крыж, на якім распялі Збавіцеля. Выконваючы волю сына, ягоная маці, перакананая хрысціянка царыца Алена, выправілася ў Ерусалім. Пасля доўгіх і цяжкіх пошукаў, у якіх побач зёю знаходзіўся ерусалімскі патрыярх Макарый, вобліз храма Венеры знайшлі ўсе тры закапаныя крыжы. А собна ляжала таблічка: «Ісус Назаранін, Цар Юдэйскі», што

прыбілі на загад Понтыя Пілата да Крыжа, дзе быў распяты Хрыстос.

Дзеля таго, каб вызначыць, які са знойдзеных крыжоў — святы, кожны з іх па чарзе ўсклалі на смяротна хворую жанчыну. Падчас выпрабавання трэцяга крыжа патрыярх, царыца Алена і сціжма народу сталіся сведкамі дзіва: хворая імгненна ачуняла. (Некаторыя царкоўныя гісторыкі паведамляюць, што Крыж Гасподні ўваскрасіў нябожчыка, якога праносілі паўз месца раскопак.) Вестка пра дзівосную моц Крыжа маланкаю абляцела Ерусалім і сабрала безліч людзей, што хацелі пакланіцца святыні. Абкружаны шматтысячным натоўпам патрыярх Макарый пачаў уздымаць — «узвіжаць» Крыж, каб паказаць яго народу.

Так узнікла свята Узвіжання, калі з алтара хросны ход выносіць узвіжальны крыж, які ў часе набажэнства шматразоў высока ўздымаецца архірэем, што стаіць на катэдры ў цэнтры храма.

Мітрапаліт нагадваў, што менавіта такім — узвіжальным — быў і Крыж найпадобнейшай полацкай ігуменні Еўфрасінні, сучаснікамі адраджэння якога ўсім нам пашчасціла быць. Святочнае слова ўладыкі падводзіла кожнага да аналогіяў пам іж пошукам і цудадзейнымі ўласцівасцямі Крыжа Збавіцеля і нашай страчанай і адроджанай святыні.

26 верасня ў Полацку, куды прыбыла ўзноўленая рэліквія, праходзіла прысвечанае гэтай падзеі паседжанне Сінода дзесяці епіскапаў Беларускай праваслаўнай царквы. Таго самага дня ў полацкім Богаяўленскім саборы з удзелам мітрапаліта Менскага і Слуцкага,

* Вобраз старажытнай святыні беларускага народа вярнуўся ў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.

* Образ древней святыни белорусского народа возвратился в Спасо-Евфросиниевский монастырь.

позывает на таковое дело, того послушай прилежно с потщанием». И паки другое чюдо скажу вам, добрии послушници: уже сконьчаней бывши церкви, и мало не доставшим плитам, нечим бяше верха скончати. И поискавше, не обретоша ничтоже. И печаловашеся о том Еуфросиниа, и, воздохнувши, рече: «Слава Тебе, Вседръжителю и Человеколюбьче, даровавый си нам болшая, то дай нам и меньшья, им же свершится церковь Твоа!» И тако ей помолышися, заутра по устроению Божию обретошася в пещи плиты, и того дни свершиша церковь, и крест возставиша.

Преподобная же Еуфросиниа, видивше совръшену церковь, возрадовася душею. И бысть священие и велия радость всем христьяном. И собрашася князи и сильнии мужие, и иноки и инокиня, и простии людие, и бысть тръжество велие, и празноваша дни многи, и разыдошася кождо в свояси. Видевши же блаженная, яко исполнил есть Бог желание сердца ея, и вшедши в церковь, паде ниц на земли, и въздохнувши от глубины душа, лице свое мочащи слезами, и нача глаголати: «Ты, Господи, Сердцевидьче, Благодателю, Боже богом, милостивый Господи, призри на храм Свой, яже создахво имя Твое, якоже рече Соломон: Вышний не в рукотворенах церквах живет. Ты, Господи, призри на мя, на рабу Твою Еуфросинию, и на рабыня Твоя сия, яже собрахво имя Твое, да приимше иго Твое легкое на выя своя, поидут в след Тебе, и сътвори я овца двора Твоего, и буди им пастух и дверник, да ни едино от них не будет въсхыщено волком — губителем дияволом. Буди им, Господи, оружие и забрала, да не приидет нань зло, ни рана не подвижится к телесам нашим, и не погуби нас со безакония нашими, на Тя бо упование наше положихом, яко Ты еси Бог знающим Тя, и Тобе хвалу воспущаю до последняго моего издыханиа. В веки, аминь». Сестры же сице учаше, глаголющи: «Се собрах вы, яко кокош птенца под креле свои, и в паствину, яко овца, да пасетеся в заповедех Божиих, да и аз веселым сердцем подвизаюся учити вас, видящи плоды ваша трудовныя, и толик дождь проливаю к вам учением. А нивы ваша во едину меру стоят, не растуще, ни поступающе горе, а год приспевает во свершение, и лопата на гумне лежит. Но боюся, егда будет плевел в вас и предани будете огню негасимому. Потщитеся, чада моя, убежати сих всех, и створитеся пшеница чиста, и смелитеся в жрънових смирением и молитвами и постом, да хлеб чист принесетеся на трапезу Христову». Сице же ей всегда учаще и

безпрестани, яко мати чадолюбивая г детем своим любовь пока зующи.

Мы же на предлежащая возвратимся. Видевши же преподобная Еуфросиниа манастырь свой украшен и всего блага испольнен, умысли создати вторую церковь камену святей Богородици. И ту свершивши и иконами украси, и освятивьши, предаст ю мнихом, и бысть манастырь велий. Видевши же блаженная манастыря два устроена превелика зело и пребогата, и рече в собе: «Слава Тобе, Владыко, благодарю Тя, Святый! Что есмь восхотела, то дал ми еси, и скончал еси, Господи, желание сердца моего». И паки рече: «Помилуй мя, Господи, и скончай прошение мое, да бых видела пресвятую Богородицю Одигитрию в сей святей церкви».

И посла слугу своего Михаила в Царьград к цареви, нарицаемому именем Мануилу, и к патриярху Луце з дары многоценными, просящи от нею иконы святыя Богородица, еже бе еуаггалист Лука написа 3 иконы еще при жывоте святыя Богородица и постави едину во Ерусалиме, а другую во Цариграде, а третью в Ефесе. Она же с прилежанием прошаше Ефеския иконы святыя Богородица. Видев же царь любовь ея, и посла в Ефес седмь сот оружник своих, и шедше, принесоша икону святыя Богородица в Царьград. Патриярх же Лука собра епископы и собор весь во святую Софию, и, благословив, даст ю слузе преподобныя Еуфросиниа. Он же с радостию п риял и принесе госпожи своей Еуфросинии. Она же, внесши в церковь святыя Богородица, постави ю, и въздевши руце, и рече: «Слава Тебе, Господи, слава Тебе, и еще реку: слава Тебе, Владыко, сподобивый мя видети в днешний образ матере Своея!» И се рекши, украси ю златом и камением многоценным, и устави по вся вторникы носити ю по святым церквам, украси же всю землю Полотскую своима боголепныма манастырема.

И видевши, яко просвети Бог манастыря ея, и въжеле, глаголющи: «Абы ми дойти святаго града Иерусалима и поклонитися гробу Господню и всем святым местом, видети и целовати, и тамо живот свой скончати». Видевши же стадо Божественных овец совокуплено множество, и радовашеся им, яко своему спасению, и на всяк день учаше сестры своя: старыя учаше терпению и въздержанию, уныя же учаше душевней чистоте и безстрастию телесному, говеянию образну, ступанию кротку, гласу смиренну, слову благочинну, ядению и питью безмольвну; при старейшей молчати, мудрейших

послушати, к старейшим покорение, к точным и меньшим любовь без лицемериа; мало вещати, а множае разумети. Тако бо бяше дан дар сей блаженной Еуфросинии от Бога, аще кто яе въпрошаше о коей вещи, она ему разрешаше, чему быти, и кто ея послушаше, той добро получаше, не бо хотяше видети кого которающася: ни князя со князем, ни болярина з болярином, ни от простых кого со своим другом, но всех хотяше имети, яко едину душу.

Посла же по всей братьи своей, поведающи им мысль свою, оже восхоте ити во Иерусалим. Он же, слышавше весть сию, с жалостию многою съехашася отвсюду ко блаженней Еуфросинии и моляхутея со слезами, дабы ихне оставила сирых. Она же ихтешаше благым смыслом своим, яко мати, дети своя любящи. И бе любим ей брат Вячеслав; приеха и той к сестре своей Еуфросинии со княинею и з детьми своими. И пришед, поклонися ей и рече: «Госпоже моя, мати и сестро! Что оставляеши мя, правителю души моей и свете оочию моею!» И горко ему плачющуся. Блаженнаа же Еуфросиниа повеле ему ити к домови; дети же его повеле оставити у сестры своея Евдокеи. Дан же бысть дар блаженней Еуфросинии от Бога, аще кого зряше сочима своима, то разумеяше, в коем человеце сосудбудет избран Богови. Тогда же преблаженнаа Еуфросиниа, видевши братаине свои, и рече има: «Хощу ваю обручити жениху безсмертному и ввести в чертог царства Его». Онема же послушающема, усладися душа ею паче сота медвена словесем преблаженныя Еуфросинии. И, падши на ногу ея, глаголаста к ней: «Воля Господня да будет и твоя святая молитва! Яко же хощеши, створи нама, госпоже!» Преподобная же Еуфросиниа с радостию и с поспешением призвавши брата своего и рече ему: «Аз хощу пострищи Кироанну и Ольгу», — тако бо и бяста нарекла родителя ею. Смяте же ся отец ею о словеси сем и рече: «Госпоже моя, что ми хощеши створити? Два плача прилагаеши души моей: да плачуся отхода твоего ради и сетую чаду деля своею». Мати же ею жалостно тръзашеся. Блаженнаа же Еуфросиниа, пославши, призва епископа, тогда стол правяща святое Софеи, нарицаемого Дионисия, и введши ею в церковь, и повеле острищи ею, и нарече имя Кироанне Агафия, а Ользе Еуфимия, и благословивши и благословением святых отец. Сама же блаженнаа Еуфросиниа, положивши великое устроение обема манастырема, братии и сестрам, и даст дръжати и рядити сестре своей Евдокеи оба манастыря. Сама же,

поклонившися в церкви святаго Спаса и у святое Богородици и рече: «Господи Сердцевидче! Се оставляю дом Твой незатворен никому уже; Ты же, Господи, не затвори от нас небеснаго Ти царствия».

И тако поиде во Иерусалим, поимши с собою брата своего Давида и сестру свою Еупраксию. Вся же братия горко плакахуся отхода ради госпожа своея, и вся гражане выйдоша проводити ея; старии плакаху, яко дщере, ркуще: «Увы нам, вожу старости нашея, просвещение души нашей, подпоре немощи нашей». Юнии же глаголаху: «Камо заходиши, свете оочию нашею! Кто нашу юность укрепит, воздръжание юности нашея? Не оставляй нас сиры, но в молитвах своих не забывай нас». Она же, целовавши всех, благословивши и, возревши на небо: рече: «Ты, Господи Сердцевидче, ходивый со Аврамом, иди и с нами, рабы Твоими, — с Еуфросинией и с Давыдом и с Еупраксиею!» И тако поидоша все, еже суще с нею.

О дивное чюдо! Не бывавши ни в коей стране, ни во граде, ни в селе; ныне же, вземши мужескую крепость, премину вся грады и власти и приимаше от всех князей честь велику. И тако пришедши в страны, и срете ю царь, идый на Угры, с великою честию послаю в Царьград. Она же, пришедши, и вшедши в великую церковь святыя София, и поклонися та же и всем Божиим церквам, и благословися от патриярха, и покупивши разноличныя фимияны и кадильницу злату, и иде во Иерусалим. И пришедши во Иерусалим, посла слугу своего Михаила тогда сущему патриярху, глаголющи: «Владыко святый! Створи милость на мне; повели, да отворят ми ся врата Христова». Он же повеле прошению ея быти. Пришедших ко вратам, паде на земли, глаголющи: «Господи Иисусе Христе! Не вмени ми сего в грех, занеже изволих по стопам Твоим ходити и внидох во святый град сий!» И целовавши врата и сущии с нею, и вниде во град, и иде ко гробу Господню. И пришедши, поклонися, и целова гроб Господень и сущии с нею. И покади гроб Господень златою кадильницею и многоразличными фимияны, и изыде, и обита у святое Богородици в Руском манастыри. И во вторый день иде второе ко гробу Господню, и тако же сътвори: поклонися и целова, и покадивши, изыде. В третий же день то же створи, и давши злата много, и поставивши кадильницу злату на гробе и многоразличныя фимияны, возревши оочима своима, и руце воздевши на небо, и, со слезами воздохнувши из глубины сердца, глаголаше: «Господи Иису-

се Христе, Сыне Божий, рожейся от Приснодевы Мариа спасениа ради нашего! Реклеси: Просите и приимете. А зже, грешнаа, егоже просих, получих от Тебе, Владыко. Се же и еще прошу у Тебе, милостиве, да сконьчаю место прошениа моего: приими дух мой от мене во святем граде Твоем Иерусалиме и пресели мя в вышний град Твой Иерусалим, и покой мя на лоне патриярха Авраама со всеми угожьшими. Аминь». И сице ей глаголавши, изыде в прежереченый манастырь святыя Богородица, идеже бе обитала. Ту же посещением Божиим впаде в недуг и нача болети. И лежащи на ложи своем, глаголаше: «Слава Тебе, Владыко, яко восхоте и створи на мне, рабе Твоей». И тоя же ради болезни не може ити на Иердан. Иде брат ея Давыд и сестра ея Еупраксия и сущии с ними. Она же, лежащи на ложи своем, хваляше Бога, глаголющи: «Господи, призри на рабу Твою Еуфросинию, и помилуй мя!» И приидоша бывше на Иердане, и принесоша ей воды от Иордана. Она же с радостию воставши и приемши и пивши, и облияся по всему телу своему, и возлегши на ложи, и рече: «Благословен Бог, просвещая всякого человека, грядущаго в мир. В векы молюся человеколюбивому Богу, ревнующи Петрову покаанию, еже в отвержении не отчаяша себе, но плакася горко. Господи, приимый того покаяние, приими и мене, недостойную рабу Твою Еуфросинию, молящуся на супротивника своего диявола, да не възглаголет ми на Страшнем Суде ничтоже пред Тобою, Господи, он злый раб, въступих бо ногама своима на змиевую его главу и супротивихся дръзости его оканной, надеющися на Твое человеколюбие, Господи». И услыша Бог молитву ея, и посла Аггела Своего к ней, глаголюща: «Блаженна ты еси в женах, благословен труд твой! Се уже отвръзоша ти ся двери породныя, и все Аггели собрашася, дръжаще свеща, чающе твоего сретениа. А дар, егоже просиши у Бога, даст ти ся». И се рек Аггел, отиде от нея. Блаженнаа же Еуфросиниа возрадовася душею, и въскоре посла в лавру святаго Савы, глаголющи: «Се уже приспе время, да же мя Бог покоит. И приимете мя, а бых легла в церкви святаго Савы?» Отвещаша же ту сущии иноци, глаголюще: «Имеем запрещение от святаго Савы, оже жены не приимати никоеяже. Но се ти есть манастырь святыя Богородица Феодосиев общий, в немже лежат святыя жены: мати святаго Савы, и мати святаго Феодосиа, и мати святую безмезднику Козмы и Дамияна именем Феодотия, и инии мнози святии; ту ти подобает лещи». Пришедшу же

посланному от нея и возвести Еуфросинии. Она же о всем похвали Бога и, пославши, купи гроб в комаре святыя Богородица. Лежаще же в болезни своей 24 дни, и познася при сконьчании, и рече: «Призовите ми прозвитера, да ми даст причащение святых тайн, уже бо зватай близ предстоит, ждый повелениа владычня». И прииде прозвитер, несый причащение. Она же, въставши, и поклонися трижды, и приемши пречистое тело и честную кровь Христову, и возлеже на одре своем, и предаст душу свою в руце Бога жива месяца мая в 24 иде в покой небесный. Давыд же и Еупраксия и с прочими спряташа тело ея честно.

Кыим убо языком, братие, достоит ми похвалити светозарьную память преблаженныя невесты Христовы Еуфросиние! Бяшет бо помощница обидимым, скорбящим утешение, нагим одение, больным посещение, и спроста рещи, всем всяка бысть. Еуфросиниа убо сердце свое напаяше Божиа премудрости. Еуфросиниа неувядающий цветрайскаго сада. Еуфросиниа — небопарный орел, попарившия от запада до въстока, яко луча солнечьнаа, просветившия землю Полотьскую. Тем же, братие, хвалится Селунь о святом Димитрии, а Вышегород мученикома Борисом и Глебом; аз же хвалюся: блажен сей ты, граде Полоцкый, такову леторасль возрастивый — преподобную Еуфросинию. Блажении людие, жывущеи во граде том. Блажени родители твои, блажена утроба, отнея же изыде преподобнаа госпожа Еуфросиниа. Блажено рожество ея, блажено воспитание ея, блажен и возраст ея, Еуфросинии достохвалныя. Блажен труд твой и подвизи, яже к Богу. Блажен и манастырь твой, блажени и живущии в манастыри святаго Спаса и святыя Богородица. Блажении людие, послужившеи тебе. Но, о преблаженая невеста Христа Бога нашего, молися к Богу о стаде своем, еже еси совокупила о Христе, яко Тому подобает всяка слава, честь и покланяние с Отцем и со святым Духом ныне и присно и в веки веком. Аминь.

Рукапіс Расійскай Дзяржаўнай бібліятэкі,
Ф. 113 № 632, л. 206–225 адв.

Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку. Багаславі, Ойча!

Пахвалены Госпад Бог Ізраіля, Бог Аўраама, Бог Ісаака, Бог Іакава, не мёртвых Бог, але жывых. Праведныя бо і пасля смерці жывуць; як кажа Саламону прыпавесцях: «Праведнікі ў вяках жывуць, і ад Госпада іх узнагарода, і клопат пра іх ад Усявышняга. Таму атрымаюць яны вянец з рукі Госпада. Так іёсць. Іяшчэ скажам пра іх: «Прыйдзіце ўсе, хто жыве ангельскім жыццём у пустэльнях і ў гарах: старыя — адкінуўшы немач, маладыя — скачучы, быццам алені,— сыдзіцеся ўсе». Хачу бо даць вам трапезу з такіх страваў, каб, паеўшы, узвесялілі вы свае душы. Бо гэтая трапеза ад страваў нятленных — не тая, што дае асалоду гартані і чэрава насычае, але тая, што душу весяліць і розум умацоўвае на добрыя дзеі. Калі будзе хто есці яе, дык, насыціўшыся, болей не ўжадае, як мовіць Пісанне: «Не заморыць голадам Госпад праведных душы». Але вернемся да таго, з чаго пачалі мы аповесць. Вы ж, дабрачынныя слухачы — князі і баяры, царкоўнікі і пачэсныя сонмы святых, што жывуць у манастырах, і простыя людзі, — прыйдзіце на гэтую казань, паслухайце ўважліва, адкрыўшы вушы свае, памякчыўшы нівы сэрцаў вашых, і прыміце ў іх насенне ўратавальнага жыцця найпадобнейшай жанчыны той, яе подзвігі й працу святую, і любоў да Бога. Скажам спярша пра тое, як яна нарадзілася і гадавалася, як узрасла і як пайшла следам за сваім жаніхом Хрыстом.

Быў у горадзе Полацку князь Усяслаў, і меў жаён многа сыноў. І быў у яго меншы сын імем Георгій, ад якога і нарадзілася шчаснае тое дзяўчо. І ўзрадаваліся бацькі яе нараджэнню разам з усімі роднымі. А праз колькі дзён наказалі хрысціць яе, і хрысцілі яе ў імя Айца, Сына і Духа Святога. І гадавала яе карміцелька, і расло дзень за днём немаўля, жывячы малаком цела, а душу напаўняючы Духам Святым. І дзяўчына была вельмі здольная да кніжнай навукі, нават не дасягнуўшы яшчэ паўналецця, і было гэта плёнам малітвы. Так любіла вучэнне яна, што дзівіўся бацька яе з любові такой да навук. І па ўсіх гарадах разышлася слава пра яе мудрасць, і

добрыя здольнасці да навук, і красу цялесную, бо была яна прыгожая надта аблічча м. Хараство ж яе многіх слаўных князёў прыводзіла да бацькі яе: хацеў кожны з іх заручыць яе сыну свайму. І многія часта прасілі згоды на гэта ў бацькі яе, але адказваў той: «Няхай спраўдзіцца воля Госпада!»

Адзін жа з князёў, найбольш слаўны княжэннем сваім і багаццем, паслаўшы да бацькі яе, папрасіў выдаць дачку за сына свайго. І калі споўнілася дзяўчыне дванаццаць гадоў, пачаў казаць бацька яе да княгіні: «Варта аддаць ужо за князя Прадславу» (так бо называлі яе да хрышчэння). Яна ж адказала: «Хай спраўдзіцца воля Бога і твая, княжа!» Прадслава ж, пачуўшы ўсё тое, падумала, — ці скажу болей: Святым Духам напоўніўся розум яе, — і сказала сабе: «Што будзе, калі бацька надумае аддаць мяне замуж? Калі здарыцца так, смутку гэтага свету нельга будзе пазбыцца!» І яшчэ казала сабе: «Што ж учынілі нашыя роды, якія былі да нас? Жаніліся і выходзілі замуж, і княжылі, але не вечна жылі; жыццё іх праплыло, і загінула іхняя слава, быццам прах, горай за павуцінне. Затое жанчыны, што жылі раней і, узяўшы мужчынскую моц, пайшлі следам за сваім Жаніхом, і целы свае аддалі на пакуты, і паклалі галовы пад меч, а іншыя хоць і не схілілі шыі свае пад жалеза, але мечам духоўным адсеклі плоцкія асалоды, аддаўшы целы пасту, чуйнаванню, і малітоўнаму кленчанню, і зямельнаму ляжанню — тых памятаюць на зямлі, іх імёны напісаны на нябёсах, дзе яны з ангеламі Бога ўсхваляюць. А слава гэтая — пыл і попел, быццам дым разыходзіцца і нібы пара водная гіне!» Так яна думала ў сэрцы сваім, а розум яе больш узмацняўся на любоў Божую. І адзіная думка лепла на сэрца яе, бо казала сабе: «Ціне было б лепей за гэтае жыццё пастрыгчыся ў манашкі і быць падігуменняй, і слухацца сёстраў, і вучыцца, як Божы страх сцвердзіць у сэрцы сваім і як скончыць жыццё?» І гэтак вырашыўшы, пайшла ў манастыр пакрыёма адбацькі і маці і ад усіх родных.

У тыя гады ігуменняю была княгіня Раманава. Прыйшоўшы да яе, Еўфрасіння прасіла, каб дазволіла тая прыняць ёй ангельскі воблік і далучыцца да інакіняў, што жылі там, і быць пад Хрыстоваю ўладай. І ўгледзела шчасная тая жанчына яе маладосць і квітучы ўзрост, і сумелася, і стала пакутаваць целам, і сэрцам жахнулася, і схіліла твар да зямлі, і надоўга ўкленчыла, і схілілася, і ўбачыла маладосць яе, уздыхнула і, плачучы, гэтак сказала: «Дзіця! Як

магу я такое ўчыніць? Твой бацька даведаецца і гнеў свой абрыне на маю галаву. Ды і маладая ты яшчэ векам, каб несці цяжар манаскага жыцця. І як здолееш ты пакінуць княжанне і славу гэтага свету?» І адказвала ёй шчасная тая дзяўчына: «Спадарыня і маці! Усё відочнае на гэтым свеце прыгожае і слаўнае, але хутка мінае, як сон, альбо вяне, бы квет; вечнае ж і невідочнае ў вяках жыве, як гаворыць Пісанне: Вока не бачыць і вуха не чуе, і на сэрца чалавеку не прыйдзе, што рыхтуе Бог тым, хто любіць Яго. Ці дзеля бацькі майго не хочаш пастрыгчы мяне? Не яго бойся, спадарыня мая, а Бога пабойся, Які ўладарыць надусім істварэннямі; не пазбаў мяне ангельскага чыну!»

Шчасная ж тая княгіня здзівілася розуму дзяўчыны і яе любові да Бога і загадала выканаць волю яе. І абвясціў яе іерэй, і пастрыг яе, і даў ёй імя Еўфрасіння, і апрануў яе ў чорныя рызы. І багаславіла яе ігумення багаславеннем святыхайцоў, гэтак мовячы: «Наследуй, дзіця, жанчынам, што жылі раней цябе: Фяўронні і Еўпраксіі і многім іншым, якія цярпелі дзеля Хрыста, і дасць Госпад табе перамогу і сілу на супраціўніка нашага д'ябла!» І так ёй сказаўшы, адпусціла яе ў сваю келлю.

І калі ўведаў усё тое бацька яе, адразу ж пайшоў у манастыр і ў роспачы рваў на сабе валасы, і цалаваў дачку замілавана, і казаў: «Гора мне, дзіця маё! Што ж учыніла ты мне, прынёсшы душы маёй смутак! Што ж раней не сказала ты мне намеру свайго? Дзіця маё салодкае, жаль агортвае сэрца маё! Огора мне, дзіця маё мілае! Якабміне тваё хараство спакусы варожыя? Ужо трэба мне плакаць душою маёю аструпянелай да Госпада Бога майго, каб увайшла ты ў Царства Яго!» І смуткаваў па ёй увесь дом яго. Найпадобнейшая ж Еўфрасіння не зважала на смутак бацькі свайго, але, як добры ваяр, узброілася супраць ворага свайго д'ябла, і сталажыць у манастыры ў паслушэнстве ігуменні і ўсім сёстрам, і ўсіх пераўзыходзіла ў посце, малітвах, чуйнаванні начным. І з тога часу яшчэ руплівейшаю стала, збіраючы дабрачынныя думкі ў сэрцы сваім, як пчала — мёд у соты.

Так жыла яна нейкі час у манастыры, а пасля папрасіла епіскапа Іллю, што кіраваў пасадам Святой Сафіі ў Полацку, каб той дазволіў ёй жыць у царкве Святой Сафіі ў мураванай келлі. І ён дазволіў ёй жыць там. І яна ўвайшла туды, і ўчыніла найпадзвіжнейшы подзвіг посту, і пачала пісаць кнігі сваімі рукамі, і прыбытак ад продажу іх аддавала тым, хто папросіць.

Так жыла яна там пэўны час. І ўадну ноч лепла яна адпачыць пасля доўгіх стаянняў на малітве да Бога, і ўбачыла праяву: узяў яе ангел і павёў туды, дзе была цэркаўка Святога Спаса, метохія Святой Сафіі, што людзі завуць Сяльцом. І паказаў яе ангел Госпадаву, кажучы так: «Еўфрасіння! Тут належыць быць табе!» Яна ж, абудзіўшыся, вельмі здзівілася, кажучы: «Што гэта значыць?» І ў тую ж ноч бачыла гэтае тройчы. І, абудзіўшыся ад сну, узнялася са страхам, славячы Бога й гаворачы: «Слава Табе, Божа, слава Табе, што даў мне ў гэтую ноч бачыць светлае аблічча ангелава!» І пачала пасля чытаць псалом: «Гатовае сэрца маё, Божа, гатовае сэрца маё! Зноў да Цябе прыбягаю ад чэрава маці маёй! Ты — Бог мой; паводле жадання Свайго ўчынім мне, рабе Сваёй!» І скончыла ютрань.

Той жа ночы з'явіўся той ангел епіскапу Іллю, кажучы: «Увядзі рабу Божую Еўфрасінню ў цэркаўку Святога Спаса на святым месцы, званым Сяльцом, бо яна вартая Царства нябеснага; як духмянае міра, узыходзіць да Госпада малітва яе, як вянец на галаве царавай, спачывае на ёй Дух Святы, і як сонца ззяе над усёю зямлёю, так праззяе жыццё яе прад Божымі ангеламі!» Епіскап жа ўзняўся хутка са страхам і трымценнем і прыйшоў да Еўфрасінні. Тая ж, пабачыўшы епіскапа, пакланілася яму і сказала: «Багаславі, святы ўладыка!» Ён жа адказвае: «Бог няхай багаславіць цябе, дзіця, і надасць табе цярпення і сілы на ўсіх ворагаў відочных і невідочных!» Яна ж пакланілася і сказала: «Амін. Хай учыніцца мне паводле слова твайго, святы ўладыка!» І села.

Адкрыў жа той шчасны епіскап вусны свае і пачаў з ёю гутарыць пра ратунак душы. Шчасная ж Еўфрасіння прымала словы яго ў жытніцу душы сваёй, быццам насенне, якое радзіла: адно — 30, другое ж — 60 альбо 100. І доўга гутарыў з ёю епіскап, і пасля сказаў так: «Дачка! Хачу слова мовіць табе; ты ж прымі з любоўю яго!» Яна ж кажа: «З радасцю, найпадобнейшы ойча, прыму слова тваё, быццам дар шматкаштоўны!» І гаворыць епіскап: «Ведаеш, дзіця, што царква, дзе жывеш ты, — саборная; тут усе людзі збіраюцца, і нядобра табе быць тут. Але ж ёсць цэркаўка Святога Спаса ў Сяльцы, дзе брація наша ляжыць — епіскапы, што былі да нас. Калі Бог успаможа, дык малітвамі іхі працай тваёю ўзвялічыцца гэнае месца!»

Еўфрасіння, пачуўшы словы епіскапа, узрадавалася душою і ўзвесялілася сэрцам, веры даўшы з'яўленню ангела і таму, што бачыла і чула ад яго. І прамовіла да епіскапа: «Хай паможа мне Бог тваімі святымі малітвамі, ойча!»

І паклікаў тады епіскап князя Барыса, дзядзьку яе, і бацьку яе Георгія, і найпадобнейшую Еўфрасінню, і пачэсных мужоў і, зрабіўшы іх сведкамі, мовіў: «Вось, аддаю Еўфрасінні месца Святога Спаса пры вас, каб пасля маёй смерці ніхто не судзіўся за гэты дарунак мой». І чулі гэта абодва князі і баяры ўсе ад епіскапа, і пакланіліся яму, кажучы гэтак: «Сапраўды, уладыка святы: сам Бог уклаў у тваё сэрца клопат апекавацца над гэтай дзяўчынаю». Еўфрасінні ж казалі: «Ідзі і паслухай епіскапа, учыні, што ён табе скажа, бо ён усім нам бацька, і трэба слухаць яго». Еўфрасіння ж, узняўшы з усмешкаю твар да іх, мовіла: «Іду з радасцю; як Бог мне накажа, такі будзе; хай будзе на мне воля Госпада!»

Князі ж і баяры ўсе, пачуўшы словы найпадобнейшае Еўфрасінні, узрадаваліся і, атрымаўшы багаславенне епіскапа, пакланіліся Еўфрасінні, пацалавалі з любоўю яе і раз'ехаліся па дамах. А Еўфрасіння, памаліўшыся ў Святой Сафіі, атрымаўшы багаславенне епіскапа, тае ж ночы ўзнялася і, узяўшы з сабою адну манашку, прыйшла на месца, званае Сяльцом, дзе стаяла царква Святога Спаса. І ўвайшла ў царкву, і пакланілася, і прамовіла так: «Ты, Госпадзе, даючы святым Сваім апосталам запавет, казаў: «Не насіце з сабою нічога, апрача посаха. Я ж, слухаючыся слова Твайго, прыйшла на гэтае месца, нічога не ўзяўшы з сабою, маючы ў сабе толькі слова Тваё: Госпадзе, памілуй! А з маёмасці ўсяе ёсць у мяне адно гэтыя кнігі, з якіх мае ўцеху душа і ўзвесяляецца сэрца. І, апрача трох хлябоў, больш не маю нічога, толькі Цябе, успаможніка і карміцеля. Бо Ты — бацька ўбогім, адзенне распранутым, памочнік пакрыўджаным, надзея расчараваным. Хай жа пахвалена будзе імя Тваё на рабе Тваёй Еўфрасінніад сёння й давеку! Амін». Сказаўшы гэта, пайшла з царквы і пачала руплівейшай быць на малітву да Бога.

Пажыўшы тут пэўны час, паслала яна да бацькі свайго з такімі словамі: «Пусці да мяне сястру маю Градзіславу, — так назвалі яе бацькі, — каб навучылася грамаце». І пусціў яе бацька. І Еўфрасіння рупна вучыла яе ратаванню душы, а тая рупна прымала, нібы ўрадлівая ніва, памякчыўшы сэрца сваё і кажучы гэтак: «Госпад Бог хай наставіць мяне на ратунак душы тваім і святым імі малітвамі, панна!» Так казала яна, найпадобнейшая ж Еўфрасіння, прывёўшы яе ў царкву, наказала іерэю, каб, абвясціўшы, апрануў яе ў рызы манаскія, і дала ёй імя Еўдакія. Праз колькі дзён прыслаў па яе бацька, кажучы: «Адпусці ўжо сястру да мяне». Тая ж так адказала: «Не навучылася яшчэ ўсёй грамаце».

Бацька ж, даведаўшыся, што ад яго ўпотай пастрыгла сястру, раз'юшыўся на найпадобнейшую Еўфрасінню, і, палаючы сэрцам, прыехаў да манастыра, і казаў: «Дзіця маё, што ты ўчыніла! Дадала ты сэрцу майму жалю да жалю і смутку да смутку!» І так мовіў ён адгаротнага сэрца свайго, і рэкі слёзаў ліліся з вачэй яго. І казаў ён, з любоўю абдымаючы Еўдакію: «Дзеці мае! Ці ж дзеля гэтага вас нарадзіў я, ці ж на тое ўзгадавала вас маці? Дзеля чаго шлюб вам рыхтаваў? І няўжо палац і шлюбныя шаты вашыя ператворацца ў гора маё? Дзеці мае любасныя, што вы мне ўчынілі? Заместа радасці сэрца маё вы напоўнілі горкім смуткам!» І ўсе баяры, чуўшы жаль князя свайго, горка плакалі аб яго марным смутку. Шчасная ж Еўфрасіння адказвала бацьку: «Што турбуешся ты пра нас? Маем бо мы заступніка і ўспаможніка адзінага — Бога!» Але мала суцешаны гэтымі словамі і найпадобнейшае Еўфрасінні, паехаў бацька яе да свайго дому. А Еўдакія жыла ў манастыры сястры сваёй у паслушэнстве. Шчасная ж Еўфрасіння нястомна малілася Богу, каб зладзіў Ён тое месца.

Была ж у месце Полацкім князёўна Звеніслава Барысаўна, якая прынесла аднойчы ўсе свае рэчы залатыя і шматкаштоўныя шаты да Еўфрасінні і сказала: «Панна і сястра! Не патрэбная мне гожасць гэтага свету. А аддаю ўсё Святому Спасу, а сама хачу схіліць галаву сваю пад Хрыстова ярмо!» Яна ж прыняла сястру з радасцю і наказала іерэю пастрыгчы яе, і назвала яе Еўпраксіяй. І пачала тая жыць у манастыры ў малітвах, з адзінаю думкай пра Бога. І былі яны як адна душа ў двух целах. Пасля ж гэтага паставіла Еўфрасіння царкву каменную Святога Спаса, і збудавалі тую царкву за 30 тыдняў.

І тут хачу вам, братове, расказаць пра дзіва. Быў муж Іван, прыстаўнік над майстрамі царкоўнымі. І колькі разоў на досвітку чуў голас ён, які прамаўляў: «О Іване! Узрушся, ідзі на будоўлю царквы Уседзяржыцеля Спаса!» І аднойчы ён узняўся, і прыйшоў да шчаснае Еўфрасінні, і сказаў ёй: «Ці не ты, панна, па мяне пасылаеш, каб я ўзяўся за працу?» А яна адказвае: «Не». Але, падумаўшы, кажа яму шчасная тая жанчына: «Нават калі і не я цябе ўзрушваю, усё адно паслухай шчыра і ўважліва тога, хто цябе кліча на гэтую працу». І скажу вам яшчэ пра адно дзіва, добрыя слухачы. Ужо збудаваная была царква тая, але крыху не хапіла плінфаў, і не было чым скончыцць верх. І шукалі, але не знайшлі нічога. І зажурылася Еўфрасіння, і, уздыхаючы, мовіла: «Слава Табе, Уладару Уседзяр-

жыцель і чалавекалюбча! Ты, Хто даў нам вялікае ўсё, дай і меншае, каб завяршылася царква Твая!» Так яна памалілася, а назаўтра па Божай волі знайшліся плінфы ў печы, і ў той самы дзень скончаная была царква і ўзнесены крыж.

Найпадобнейшая ж Еўфрасіння, угледзеўшы завершаную царкву, узрадавалася душою. І асвяцілі царкву, і была радасць вялікая ўсім хрысціянам. І сабраліся князі, і ўладарныя мужы, і інакі з інакінямі, і просты люд, і адбылося вялікае свята, і святкавалі яго шматдзён, а пасля разышліся. І бачыла шчасная, што выканаў Бог жаданне сэрца яе, і ўвайшла ў царкву, і ўпала ніцма на зямлю, і ўздыхнула ад глыбіні душы, і свой твар зрасіла слязамі, і пачала мовіць: «Ты, Госпадзе сэрцазнаўча, дабрадзею, Божа багам, міласцівы Госпадзе! Зірні на храм Свой, што паставіла я ў імя Тваё! Як Саламон кажа: Усявышніне ў рукатворныхцэрквахжыве. Ты, Госпадзе, зірні на мяне, рабу Тваю Еўфрасінню, і на рабынь Тваіх, якіх тут сабрала ў імя Тваё, каб, усклаўшы ярмо Тваё лёгкае на шыі свае, пайшлі следам за Табою! Учыні іх авечкамі двара Твайго і будзь ім пастырам і вартаўніком, каб ніводную з іх не ўкраў воўк — згубнік д'ябал. Будзь ім, Госпадзе, зброяю і забралам, каб не сышло на іх зло, каб раны не закранулі цел нашых; не загубі нас з нашымі беззаконнямі, бо на Цябе ўскладаем надзеі свае — на Бога тых, хто Цябе вызнае, і Цябе мы ўсхваляем да апошняга нашага ўздыху! Давеку — амін!» Сёстраў жа так павучала: «Вось сабрала вас, нібы птушанятаў, пад крылы свае і на пашы, нібы авечак, каб вы пасвіліся ў Божых наказах. А я з лёгкім сэрцам стараюся вучыць вас, бачачы плён вашай працы, і такі дождж вучэння на вас праліваю! Але ж вашыя нівы стаяць, не ўзыходзячы і не ўзрастаючы ўгору, а год ужо завяршаецца, і лапата ляжыць на гумне. І баюся, што будзеце вы пустазеллем, і аддадуць вас агню непагаснаму. Пастарайцеся ж, дзеці мае, пазбегнуць яго, і ўчыніце сябе вы пшаніцаю чыстай, і змяліцеся ў жорнах умірання сцю, малітвамі, постам, каб чыстым хлебам прынесціся на трапезу Хрыстову!» Так яна павучала нястомна, нібы дзеталюбная маці дзяцей.

Але ж вернемся да ранейшага. Бачыла найпадобнейшая Еўфрасіння манастыр свой аздоблены і поўны ўсялякага дабра, і задумала паставіць другую царкву мураваную, Святой Багародзіцы. І, завяршыўшы яе, аздобіла абразамі, асвяціла і аддала манахам; і быў там вялікі манастыр. І ўбачыла шчасная два ўзведзеныя мана-

стыры, вельмі вялікія і багатыя, і сказала ў сабе: «Слава Табе, Уладару, дзякуй Табе, Святы! Што хацела я — даў мне і спраўдзіў, Госпадзе, жаданне сэрца майго!» І зноў мовіла: «Памілуй мяне, Госпадзе, спраўдзі прашэнне маё, каб жа бачыла я Найсвяцейшую Багародзіцу Адзігітрыю ў гэтай святой царкве!»

І паслала слугу свайго Міхаіла ў Царгорад да цара Мануіла і да патрыярха Лукі з дарамі каштоўнымі, просячы ў іх абраза Святой Багародзіцы. Напісаў жа евангеліст Лука тры абразы яшчэ пры жыцці Святой Багародзіцы і паставіў адзін у Іерусаліме, другі — у Царгорадзе, а трэці — у Эфесе. Яна ж прасіла Эфескі абраз святой Багародзіцы. І бачыў цар любоў яе, і паслаў у Іерусалім семсотвояў сваіх. І тыя пайшлі і прынеслі абраз Святой Багародзіцы ў Царгорад. Патрыярх жа Лука сабраў епіскапаў і ўвесь сабор у Святую Сафію і, багаславіўшы, аддаў той абраз слузе найпадобнейшае Еўфрасінні. Ён жа зрадасцю ўзяў і прынёс той абраз Еўфрасінні. А яна, унёсшы ў царкву Святой Багародзіцы, паставіла яго і, узняўшы рукі, мовіла: «Слава Табе, Госпадзе, слава Табе, Уладару, што даў сёння мне бачыць аблічча Маці Сваёй!» І, сказаўшы так, аздобіла яго золатам і самацветамі, і ўстанавіла насіць яго кожны аўторак па святых цэрквах. І аздобіла ўсю зямлю Полацкую сваімі багалепнымі манастырамі.

І, бачачы, як прасвятліў Бог манастыры яе, пажадала, молячыся: «Каб жа дайсці мне да святога горада Іерусаліма і пакланіцца гробу Госпадаву і ўсім мясцінам святым, бачыць іхі цалаваць, і там скончыць жыццё сваё!» Гледзячы ж на супольнае мноства статку Божых авечак, радавалася яму, як свайму ўратаванню, і кожны дзень навучала сёстраў сваіх: старых вучыла цярпенню і ўстрыманню, юных — душэўнай чысціні і цялеснаму супакаенню, гавенню чэснаму, хаджэнню рахманаму, голасу ціхмянаму, слову дабрачыннаму, ядзенню і піццю маўкліваму; пры старэйшых маўчаць, мудрых слухаць; да старэйшых — пакоры, да роўных і меншых — любові некрывадушнай; мала казаць, а больш разумець. Такіж мела дар шчасная Еўфрасіння ад Бога: калі хто спытае яе пра што-небудзь, — яна давала адказ, і хто слухаў яе — атрымліваў даброты ўсялякія. І не хацела яна бачыць, каб хто варагаваў: ні князь з князем, ні баярын з баярынам, ні з простых хто са сваім сябрам, але ўсіх жадала бачыць адзінадушнымі.

І паслала да ўсіх братоў сваіх, распавядаючы ім сваю думку,

што вырашыла яна ісці ў Іерусалім. Тыя ж, чуючы гэтую вестку, адусюль з'ехаліся з вялікім смуткам да шчаснае Еўфрасінніі малілі яе са слязамі, каб сіротамі іхне пакінула. Яна ж іх суцяшала разважліва, як маці дзяцей сваіх мілых. І любасны брат Еўфрасінні Вячаслаў прыехаў да сястры сваёй з княгіняй і дзецьмі сваімі. І, прыйшоўшы, пакланіўся і мовіў: «Панна мая, маціі сястра! Што пакідаеш мяне, уладарка душы маёй і святло маіх вачэй!» І горка плакаў. Шчасная ж Еўфрасіння наказала яму ісці дадому, дзяцей жа ягоных загадала пакінуць у сястры сваёй Еўдакіі. Бо быў дадзены шчаснай той Еўфрасінні дар ад Бога: на каго зірне вачыма сваімі — разумее, які чалавек будзе абраны ёмішчам Божым. Калі ж убачыла шчасная Еўфрасіння пляменніц сваіх, сказала ім: «Хачу вас заручыць з Жаніхом несмяротным і ўвесці ў палаты Царства Яго!» Тыя ж пачулі, і ўсцешыліся іх душы словамі найшчаснейшае Еўфрасінні больш чым мядовымі сотамі. І ўпалі яны да яе ног, кажучы ёй: «Хай будзе воля Госпада і твая святая малітва! Як хочаш, так і ўчыні нам, панна!» Найпадобнейшая ж Еўфрасіння паслала па епіскапа Дыянісія, які кіраваў пасадам Святой Сафіі, і ўвяла іху царкву, і загадала пастрыгчы іх, і назвала Кірыану Агаф'яй, а Вольгу — Яўфіміяй. І багаславіла іх багаславеннем святых айцоў. Сама ж шчасная Еўфрасіння, уладзіўшы свае манастыры з братамі і сёстрамі, дала ўладарыць і кіраваць імі сястры сваёй Еўдакіі. Сама ж, пакланіўшыся ў царкве Святога Спаса і Святой Багародзіцы, мовіла: «Госпадзе сэрцазнаўча! Вось пакідаю Твой дом не зачынены нікому, і Ты, Госпадзе, не зачыні перад намі нябеснага Свайго Царства!»

І пайшла Еўфрасіння ў Іерусалім, узяўшы з сабою брата свайго Давіда і сястру сваю Еўпраксію. Уся ж брацыя плакала горка дзеля адыходу панны сваёй. І ўсе месцічы выйшлі правесці яе: старыя плакалі, нібы юніцы, наракаючы: «Гора нам, павадыр старасці нашае, апірышча немачы нашай!» А маладыя казалі: «Куды заходзіш, святло вачэй нашых? Хто наша юнацтва ўзмоцніць, устрыманне нашае маладосці? Не пакідай нас сіротамі і ў малітвах сваіх не забывай нас!» Яна ж, цалаваўшы ўсіх, багаславіла і, паглядзеўшы на неба, прамовіла: «Ты, Госпадзе сэрцазнаўча, Які хадзіў з Аўраамам, ідзі і з намі, рабамі Тваімі — з Еўфрасінняю, і з Давідам, і з Еўпраксіяй!» І так пайшлі ўсе, хто быў з ёю.

О дзіўны цуд! Не была яна раней ні ў якой старане: ні ў горадзе, ні ў сяле; цяпер жа з нежаночаю сілай прайшла ўсе гарады і ўла-

данні, прымаючы ад усіх князёў пашану вялікую. Так прайшла яна ўсе краіны. І сустрэў яе цар, што ішоў вайною на ураў, і паслаў яе з вялікай пашанай у Царгорад. Яна ж, прыйшоўшы туды, увайшла ў вялікую царкву Святой Сафіі, пакланілася ёй і ўсім святым цэрквам, і прыняла багаславенне ад патрыярха. І, купіўшы разнастайныя фіміямы і залатое кадзіла, пайшла ў Іерусалім.

Прыйшоўшы ж у Іерусалім, паслала слугу свайго Міхаіла да патрыярха, кажучы: «Уладыка святы! Зрабі мне міласць: скажы, каб адчынілі мне браму Хрыстову!» І ён загадаў учыніць па прашэнні яе. Тады прыйшла яна да брамы і ўпала на зямлю, кажучы: «Госпадзе Іісусе Хрысце! Не залічы мне за грэх, што хаджу па Тваіх слядах, уваходзячы ў горад святы!» І цалавала браму з усімі, хто з ёю быў. І ўвайшла ў горад, і пайшла да гроба Госпадава. І прыйшла, і пакланілася, і цалавала гроб Госпадавы яна і ўсе, хто быў з ёю. І пакадзіла гроб залатым кадзілам, размаітымі фіміямамі. Потым пайшла ў Рускі манастыр Святой Багародзіцы і жыла там. А на другі дзень зноў пайшла да гроба Госпадава, і зноў пакланілася, і цалавала яго, і, пакадзіўшы, адышла. І на трэці дзень тое зрабіла, і, даўшы шмат золата, узняла свае вочы да неба, і рукі ўзняла, і са слязамі ўздыхнула з глыбіні сэрца, і мовіла: «Госпадзе Іісусе Хрысце, Сыне Божы, Які нарадзіўся ад Вечнадзевы Марыі дзеля нашага паратунку! Ты казаў: Прасіце і атрымаеце. Я ж, грэшная, што прасіла, атрымлівала ад Цябе, Уладару. Вось жа яшчэ прашу ў Цябе, Міласцівы, і на гэтым скончу прашэнні свае: прымі духмой адмяне ў святым горадзе Іерусаліме, перасялі мяне ў Нябесны Твой Іерусалім, супакой мяне на ўлонні патрыярха Аўраама з усімі, хто Табе дагадзіў! Амін».

Так сказаўшы, пайшла яна ў раней згаданы манастыр Святой Багародзіцы, дзе жыла. І тут Божым наканаваннем занядужала і пачала хварэць. І, лежачы на пасцелі, казала: «Слава Табе, Уладару: што схацеў, тое мне іўчыніў, рабе Сваёй!» І праз тую хваробу не змагла пайсці да Іардану, а пайшлі брат яе Давід і сястра яе Еўпраксія, і тыя, хто з імі быў. Яна ж, лежачы на пасцелі сваёй, славячы Бога, казала: «Госпадзе, зірні на рабу Сваю Еўфрасінню і памілуй мяне!» І вярнуліся тыя, хто быў на Іардане, і прынеслі вады Іарданскай. Яна ж з радасцю ўзнялася, прыняла і піла, і абліла ўсё цела сваё, і, лёгшы на ложак, прамовіла: «Пахвалены Бог, які прасвятляе кожнага чалавека, што прыходзіць у свет! Заўжды малюся чалавекалюбна-

му Богу, раўнуючы Пятроваму пакаянню, калі той не ўпаў у роспач пасля адрачэння свайго, але плакаў горка. Госпадзе! Калі Ты прыняў пакаянне ягонае, дык прымі і мяне, нявартую рабу Сваю Еўфрасінню, што моліцца, каб вораг яе д'ябал нічога перад Табою, Госпадзе, не сказаў супроць яе на Страшным Судзе Тваім, бо яна наступіла на змяіную галаву гэтага злога раба і процістаяла дзёрзкасці яго акаяннай, спадзеючыся на Тваё, Госпадзе, чалавекалюбства!»

І пачуў Бог малітву яе, і паслаў да яе Свайго ангела, які казаў: «Шчасная ты сярод жанчын і шчасная праца твая! Вось ужо расчынілася райская брама, і сабраліся ангелы, трымаючы свечкі і чакаючы сустрэчы з табою. Дар жа, які просіш у Бога, дадзены будзе табе!» Так ангел прамовіў і адышоў ад яе. Шчасная ж Еўфрасіння ўзрадавалася душою і хутка паслала ў лаўру Святога Савы, кажучы: «Вось ужо надышла часіна, калі мяне Бог супакоіць. Ці прымеце мяне, каб я легла ў царкве Святога Савы?» А дказвалі ж манахі, што былі там: «Забараніў святы Сава нам прымаць тут жанчын. Але ёсць паблізу манастыр Святой Багародзіцы Феадосіеў агульнабытны, дзе пахаваны святыя жанчыны: маці святога Савы і маці святога Феадосія; і маці святых бяссрэбранікаў Казьмы і Даміана імем Феадоція, і шмат якія святыя; тут і табе легчы належыць». І вярнуўся яе пасланец, і абвясціў тое ўсё Еўфрасінні. Тая ж уславіла Бога, і паслала купіць сабе дамавіну ў камары Святой Багародзіцы. І ляжала, хварэючы, 24 дні, і, даведаўшыся пра сваю смерць, сказала: «Паклічце да мяне прэсвітэра, каб даў мне прычасць тайнотаў святых, бо звястун стаіць ужо блізка, чакаючы наказу Уладара». І прыйшоў прэсвітэр, несучы прычасць. Еўфрасіння ж узнялася, і пакланілася тройчы, і прыняла найчысцейшае цела і кроў святую Хрыстову, і легла на ложак свой, і аддала душу ў рукі Бога Жывога 24 траўня і ўвайшла ў пакоі нябесныя. Давід жа з Еўпраксіяй і з іншымі пахавалі святое цела яе.

Якою мовай, братове, належыць уславіць светлую памяць найшчаснейшай нявесты Хрыстовай Еўфрасінні! Была яна дапамогай пакрыўджаным, суцяшэннем зажураным, распранутым — адзеннем, хворым — наведаннем ці, проста кажучы, — для ўсіх была ўсім. Еўфрасіння сэрца сваё паіла Божаю мудрасцю. Еўфрасіння — незвядальны кветрайскага саду. Еўфрасіння — арол, што, лунаючы ў небе, праляцеў ад захаду і да ўсходу, як промень сонечны, прасвятліў зямлю Полацкую. Вось, братове, Селунь хваліцца святым Дзімітрыем, Вышгарад — пакутнікамі Барысам і Глебам; яж хва-

люся: шчаснае ты, места Полацкае, што ўзрасціла такі парастак — найпадобнейшую Еўфрасінню! Шчасны люд, што жыве ў месце тым! Шчасныя бацькі яе; шчаснае ўлонне, з якога выйшла найпадобнейшая панна Еўфрасіння! Шчаснае нараджэнне яе, шчаснае гадаванне, шчаснае і ўзрастанне найпачэснейшай Еўфрасінні! Шчасная праца яе і подзвігі дзеля Бога! Шчасны і манастыр, шчасныя і насельнікі манастыроў Святога Спаса і Святой Багародзіцы! Шчасны люд, што табе паслугаваў! Але, о найшчаснейшая нявеста Хрыста, Бога нашага, маліся да Бога аб статку сваім, які ты спалучыла ў Хрысце, Якому належыць усялякая слава, гонар і пакланенне з Айцом і Святым Духам цяпер і заўжды і давеку! Амін.

Пераклаў са старажытнарускай Аляксей Мельнікаў

KAMUNIKAT.org

Малітва
за Беларускі Народ

Сусьветны Валадару, Прадвечны Божа, Ты ўвесь сусьвет стварыў і законы для ўсяго ўстанавіў, кожнаму мейсца і мэту назначыў, а людзкі род так бясконца палюбіў, што Сына Свайго Адзінароднага паслаў на зямлю, каб усе, слухаючы Яго навуку ды йдучы Яго сьледам, увайшлі ў Тваё Нябеснае Валадарства. Мы, дзеці Беларускага Народу, як маглі слухаліся Тваіх загадаў, але зслабасьці чалавечае часта падалі і зьневажалі Цябе сваімі грахамі. Цяпер молім Цябе шчыра: даруй нам нашы грэшныя правіны, нашу нядбайлівасьць у адносінах да сябе самых і да іншых; даруй такжа тым, хто нас крыўдзіў і зьневажаў. Молім Цябе шчыра, барані нас ад крыўды варожай і дай нам ды ворагам нашым шчодраю Тваёй рукою, духа сапраўднае хрысьціянскае любові. Дай нам еднасьць у веры, згоду ў сямейным і грамадзкім ды палітычным жыцьці. Загаі нашы асабістыя і ўсенародныя раны душы, якія мы самі сабе спрычынілі або ад няпрыяцеляў атрымалі. У нашым штодзённым жыцьці, у змаганьнях і спакусах, асьвяці наш розум Тваім евангельскім сьвятлом, каб мы, захоўваючы Твае прыказаньні, перамаглі ўсе цяжкасьці і цярпеньні ды заўсёды Цябе багаславілі. Пашлі Беларускаму Народу сьвятых і вялікіх слугаў сваіх, якія праведным, чэсным і мудрым жыцьцём і дзейнасьцю вялі б Народ да лепшае долі. Дай нам сьвятое духавенства. Багаславі нашы сем'і, каб у кожнай з іх дбалы бацька і ахвярная маці, злучаныя шчыраю сьвятою любоўю, выхоўвалі Табе на славу, а Бацькаўшчыне на карысьць сваіх дзетак. Асаблівую ласку дай нашай моладзі, каб яна атрымала глыбокае хрысьціянскае ўзгадаваньне, і ўзрасла на карысных сыноў і дачок свайго народу.

Багаславі такжа нашы дачасныя дастаткі, ня дай гінуць марна тым талентам, якія Ты ссылаеш у наш народ, але дай ім свабодна разьвіцца і закрасаваць Табе на славу, а ўсяму людству на карысьць. Багаславі працам сялянства на ральлі, працоўным у фабрыках, вучоным у ваўсіх галінах навукі, мастацтва і тэхнікі, каб за іх помаччу Беларускі Народ мог разумна і прыгожа жыць ды разьвівацца.

Цябе, Прачыстая Багародзіца і наша нябесная Маці, просім: прычыніся за намі, а Ты, сьвятая Еўфрасіньня Полацкая — патронка Беларусі — ды ўсе сьвятыя заступнікі Беларускага Народу, апякуйцеся намі, каб мы сталіся народам сьвятым, выконваючым Волю Божую і сваё пасланьство, каб прычыніліся да агульнага дабра тут, на зямлі, а ў прышлым жыцьці атрымалі вечнае шчасьце, і Табе, прадвечнаму Валадару, прыносілі славу, чэсьць і паклон на векі вечныя. Амін.

KAMUNIKAT.org

ДАДАТАК
ПРИЛОЖЕНИЕ

Гэтым сведчым,

Што, міласцю Божай, завершана ўзнаўленне ўзвіжальнага Крыжа найпадобнейшай маці нашай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай, зробленага з яе багаславення ў 1161 годзе ад Нараджэння Хрыстовага майстрам Лазарам Богшам.

На працягу пяці гадоў — ад дзён святкавання 1000-годдзя Полацкай епархіі і Праваслаўнай Царквы на Белай Русі ў 1992 годзе і да сённяшняга дня — доўжылася праца па адраджэнні святыні.

Гэты Святы Крыж, зроблены ў Брэсце майстрам М. П. Кузьмічом у старажытнавізантыйскай тэхніцы перагародкавай эмалі, як і старажытны, захоўвае ў сабе часцінкі Крыві Хрыстовай, Каменя ад Труны Гасподняй, Каменя ад Труны Найсвяцейшае Багародзіцы, Святога і Жыватворнага Крыжа; часцінкі святых мошчаў архідыякана першамучаніка Стэфана, велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага, велікамучаніка і лекара Панцялеймана.

Адраджэнне святыні, якая шануецца ва ўсім Праваслаўным свеце і асабліва ахоўвае Белую Русь, сталася справаю ісцінна ўсенароднаю. У ёй — наша пакаянне, наша вера, надзея і любоў да Бога і Бацькаўшчыны.

Няхай памяне нас Гасподзь у Царстве Сваім сёння, і заўсёды, і на векі вечныя. Амінь.

Сінод Беларускай Праваслаўнай Царквы
26–27 верасня 1997 года.
Узвіжанне Святога і Жыватворнага Крыжа Гасподняга.
Брэст—Мінск—Полацк.

Сим свидетельствуем,

Что, милостию Божией, завершено воссоздание воздвизального Креста

преподобной матери нашей Евфросинии, игумении Полоцкой, изготовленного по ее благословению в 1161 году от Рождества Христова мастером Лазарем Богшей.

В течение пяти лет — от дней празднования 1000-летия Полоцкой епархии и Православной Церкви на Белой Руси в 1992 году и до нынешнего дня — продолжались труды по возрождению святыни.

Сей Святый Крест, изготовленный в Бресте мастером Н. П. Кузьмичом в древневизантийской технике перегородчатой эмали, как и древний, хранит в себе частицы Крови Христовой, Камня от Гроба Господня, Камня от Гроба Пресвятыя Богородицы, Честнаго и Животворящаго Креста; частицы святых мощей архидиакона первомученика Стефана, великомученика Димитрия Солунского, великомученика и целителя Пантелеимона.

Возрождение святыни, почитаемой во всем Православном мире и особо покровительствующей Белой Руси, стало делом воистину всенародным. В нем — наше покаяние, наша вера, надежда и любовь к Богу и Отечеству.

Да помянет нас Господь во Царствии Своем
всегда, ныне и присно и во веки веков. Аминь.

Синод Белорусской Православной Церкви
26–27 сентября 1997 года.
Воздвижение Святого и Животворящаго Креста Господня.
Брест—Минск—Полоцк.

ПАСТАНОВА
Першага сходу беларусаў блізкага замежжа

1. Сход падтрымлівае выказаную ў выступленнях дэлегатаў прапанову аб аднаўленні вобраза гістарычнай і духоўнай рэліквіі беларускага народа — Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай, страчанага падчас Другой сусветнай вайны.

2. Сход даручае Управе ЗБС «Бацькаўшчына» ажыццявіць практычную рэалізацыю прапановы і забяспечыць выкананне працы да Першага з'езду беларусаў свету ўлетку 1993 года.

г. Мінск, 20 снежня 1992 г.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ
Первого схода белорусов близкого зарубежья

